# МАСТАЦТВА

## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)





**7 клас**



З электронным дадаткам

# МАСТАЦТВА
## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

Вучэбны дапаможнік для 7 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

(з электронным дадаткам)

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2017

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 7(100).03(075.3=161.3)
ББК 85(0)я721
М32

Аўтары: Н. С. Валанцэвіч, С. І. Колбышава, М. Л. Карпянкова, Ю. Ю. Захарына, І. Р. Томашава, А. С. Бохан, Я. Ф. Шунейка, Г. Г. Шымелевіч

Пераклад з рускай Т. А. Івановай

Рэцэнзенты: аддзел экранных мастацтваў дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык аддзела *А. А. Карпілава*); настаўнік музыкі і айчыннай і сусветнай мастацкай культуры першай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 81 г. Мінска» *Л. Н. Вішнеўская*

М32 **Мастацтва** (айчынная і сусветная мастацкая культура) : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : (з электронным дадаткам) / Н. С. Валанцэвіч, С. І. Колбышава, М. Л. Карпянкова [і інш.] ; пер. з рус. Т. А. Івановай. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2017. — 192 с. : іл. + 1 электрон. апт. дыск.

ISBN 978-985-7191-05-5.

**УДК 7(100).03(075.3=161.3)**

**ББК 85(0)я721**

**ISBN 978-985-7191-05-5 (асоб. выд.)**

**ISBN 978-985-7191-07-9**

© Іванова Т. А., пераклад на беларускую мову, 2017

© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2017

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Дарагія сябры!

У новым навучальным годзе мы пачынаем знаёміцца з гісторыяй айчыннай і сусветнай мастацкай культуры. Гэта будзе займальнае падарожжа. Вам давядзецца адкрыць для сябе мноства вялікіх дасягненняў розных эпох і культур.

Першы прыпынак у падарожжы — культура першабытнай эпохі. Вы ўбачыце наскальны жывапіс, дакранецеся да таямніц першага жылля. Даведаецеся, пра што хацеў расказаць першабытны чалавек, пакідаючы малюнкі жывёл, чалавечыя фігуркі, загадкавыя сімвалы і знакі.

Другі прыпынак — найбуйнейшыя цэнтры цывілізацый старажытнасці: Егіпет, Месапатамія, Індыя, Кітай. Для вас адчыніць дзверы культура Старажытнага Усходу. Вы пазнаёміцеся з каласальнымі архітэктурнымі збудаваннямі, пабываеце ў дзівосных храмах, разгадаеце загадкі, пакінутыя нам старажытнымі культурамі.

Трэці прыпынак — самыя значныя з'явы Антычнасці. Вы ўбачыце, як сіла чалавечага духу, жаданне спазнання і дасканаласці праявіліся ў творах мастацтва. Сустрэўшыся з мастацтвам антычнага свету, вы зможаце адказаць на важнае пытанне: чаму антычную культуру лічаць калыскай сусветнага мастацтва?

У кожным падарожжы вас чакаюць сюрпрызы: вы даведаецеся, як творы мастацтва розных эпох працягваюць сваё жыццё ў сучаснай культуры.

У працы вам дапаможа кампакт-дыск. Спасылкі на яго пададзены са значком . Пры неабходнасці з мастацкімі творамі можна пазнаёміцца ў іншых інфармацыйных крыніцах: даведачнай літаратуры, энцыклапедыях, інтэрнэце. Спасылка на іх абазначана значком . На кампакт-дыску вам прапануюцца дадатковыя старонкі, якія дапамогуць адказаць на пытанні і выканаць заданні. Дадатковы матэрыял пададзены са значком . Даведацца значэнне новых слоў, якія сустрэнуцца ў вучэбным дапаможніку, вы зможаце са слоўнічка ў канцы дапаможніка. У асноўным тэксце такія словы выдзелены сінім колерам.

***Аўтарскі калектыў***

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Раздзел 1
# У пошуках прыгажосці: мастацтва першабытных часоў

Сапраўды, мастацтва заключана ў прыродзе;
хто ўмее знайсці яго, той валодае ім…

*А́льбрэхт Дзю́рэр*



Фрагмент роспісу пячоры Шаве́, Францыя (каменны век)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 1. Мастацтва першабытнай эпохі: пасланне нашчадкам

Сучасным людзям не толькі цікава, але і важна ведаць, калі з'явілася мастацтва і чаму чалавек увесь час да яго звяртаецца. Пра прычыны ўзнікнення мастацтва навукоўцы выказваюць мноства тэорый. Кожная з іх часткова праўдзівая.

Успомніце, з якімі творамі першабытнага перыяду вы пазнаёміліся ў 5 і 6-м класах.

**З'яўленне мастацтва.** Дакладны час з'яўлення мастацтва назваць складана. Але можна з упэўненасцю сказаць, што гэта адбылося ў *каменным веку*. Менавіта тады ў першабытнага чалавека ўзнікла патрэба выяўляць свае эмоцыі і пачуцці, упрыгожваць сваё жыццё. Навакольны свет здаваўся таямнічым, загадкавым. Зразумець яго чалавеку дапамагала мастацтва.

**Першабытны перыяд**
ахоплівае каменны, бронзавы і жалезны вякі.



Выява бізонаў у пячоры Ласко, Францыя (каменны век)

У першабытны час людзі не аддзялялі сябе ад прыроды, лічылі сябе яе часткай. Усе іх заняткі былі цесна злучаны: паўсядзённае жыццё, мастацкая дзейнасць, абрады і рытуалы*. Танцуючы, здзяйсняючы рытуалы, распісваючы сцены пячор, чалавек яшчэ не ўсведамляў, што займаецца мастацтвам. Верагодна, так ён імкнуўся паўплываць на навакольны свет, часта суровы і варожы. Усё, што рабілі людзі, падпарадкоўвалася практычным мэтам і павінна было прынесці поспех, забяспечыць добрае надвор'е, даць здароўе. Такую непадзельнасць паўсядзённага жыцця і розных відаў мастацкай дзейнасці першабытнага чалавека называюць словам «сінкрэты́зм».

Разгледзьце прыклады «ранняга» мастацтва. Уявіце сабе людзей, якія стваралі гэтыя творы. Як вы думаеце, чаму гэтыя работы захапляюць і хвалююць сучаснага гледача?

* Вылучаныя колерам словы не патрабуюць завучвання на памяць.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Ад пераймання — да творчасці.** Першабытныя людзі думалі, што ўсё ў навакольным свеце (сонца, неба, вецер, лес, камяні) гэтак жа, як і чалавек, мае душу, разумее словы, мае патрэбу ў ежы і сне. Таму ўсім з'явам, ад якіх залежала жыццё людзей, яны прыносілі ахвяры. Звароты да сіл прыроды з просьбамі ці падзякай ператварыліся ў абрады. Падчас здзяйснення абраду не было раздзялення на гледачоў і выканаўцаў. У абрадавую дзейнасць уключаліся людзі і ўсё тое, што складала іх жыццё: рэальныя прадметы, выявы чалавека і жывёл, шкуры жывёл і маскі.

Спачатку чалавек імкнуўся імітаваць прыроду: напрыклад, у танцах і песнях капіраваў звычкі і гукі жывёл. Пазней ён навучыўся адлюстроўваць жывёл. Чалавек шчыра верыў у сілу свайго мастацтва: намаляваўшы сцэну палявання з пераможанай жывёлай, ён чакаў, што гэта дапаможа і ў рэальным паляванні.



Карáлі, Чэхія (каменны век)

Але першабытныя людзі не толькі малявалі дзіды, якія патрапілі ў намаляванага звера, але і «гулялі» з малюнкамі — многія наскальныя малюнкі жывёл пакрыты сколамі ад удараў каменных стрэл і дзід. Надзяваючы ўпрыгажэнне з іклоў і зубоў магутнага мядзведзя, чалавек чакаў, што яно стане абярэгам і надасць яму дадатковую сілу і адвагу. Верагодна, старажытныя людзі спадзяваліся, што гэта можа прынесці поспех на паляванні.

Ці захавалася да нашых дзён традыцыя насіць абярэгі? Прывядзіце прыклады сучасных абярэгаў.

**Зараджэнне міфалогіі.** Свае ўражанні і веды пра навакольны свет чалавек перадаваў не толькі праз малюнкі, але і вусна пры дапамозе слоў. Зараз гэтыя паданні называюць *міфамі*.

Старажытныя міфы расказваюць пра самыя важныя моманты з жыцця першабытных людзей. Напрыклад, пра тое, як з'явіўся першы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

чалавек, як узніклі неба, зоркі, месяц, стыхійныя з'явы, як адбываецца змена дня і ночы, пор года. Першабытны чалавек назіраў за гэтымі з'явамі і імкнуўся растлумачыць іх у міфах. Кожны міф — гэта адказ на адну з загадак навакольнага свету. Магчыма, менавіта таму мастакі дагэтуль шырока выкарыстоўваюць міфалагічныя сюжэты пры стварэнні твораў самых розных відаў мастацтва.

? У розных народаў захаваліся міфы з падобнымі сюжэтамі. Адзін з такіх міфаў — гісторыя пра Млечны Шлях. Прачытайце міфы. Якія вобразы ўзнікаюць у вашым уяўленні?

| **Паўночнае паўшар'е Зямлі: фінскі міф** | **Паўднёвае паўшар'е: Зямлі: бушменскі міф** |
|---|---|
| Паводле ўяўленняў фінаў, у былыя часы існаваў велізарны дуб, які загароджваў кронай Сонца і Месяц. Але чалавечак, які выйшаў з мора, ссек яго.<br>Фіны лічылі, што Млечны Шлях — гэта і ёсць дуб, які зваліўся. | Паводле сюжэта аднаго з бушменскіх міфаў, Месяц — гэта сандаля чалавека «старажытнага народа». Аднойчы дачка паклала мокрыя сандалі бацькі вельмі блізка да агню. Ад адной сандалі застаўся толькі попел, а другая згарэла напалову.<br>Раззлаваны бацька падкінуў угару напаўзгарэлую сандалю, і яна стала Месяцам. Кінуты дзяўчынай угару попел другой сандалі ператварыўся ў зоркі і Млечны Шлях. |

**Першыя выявы.** Асвойваючы прыроднае асяроддзе, людзі пачалі ўладкоўваць сваё першае жыллё. Яны сяліліся ў пячорах ці будавалі простыя шалашы з дубцоў і касцей жывёл. Асвоіўшы прастору вакол сябе, людзі захацелі пераўтварыць яе і пакінуць знак-след на «асабістай» тэрыторыі. Ці ўпрыгожваў чалавек сцены шалашоў — нам не вядома. Але вось першыя пячорныя малюнкі захаваліся, і мы можам іх убачыць!


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Адбіткі рук у пячоры Куэва-дэ-лас-Манас, Аргентына (каменны век)

**Цікавы факт**

Навукоўцы высветлілі, што першабытныя людзі прыкладвалі руку да сцяны як трафарэт. Потым набіралі ў трубачку фарбу і, выдзімаючы яе, распырсквалі.

Яшчэ не прыдумаўшы прыстасаванняў для малявання, чалавек пачаў выкарыстоўваць тое, што было заўсёды пры ім, — свае рукі. Напрыклад, на мяккім налёце на сценах пячоры людзі пакінулі доўгія хвалістыя лініі, якія навукоўцы пазней назвалі «макароны». Іх даўжыня пры гэтым магла дасягаць некалькі метраў. А ў некаторых пячорах мы можам знайсці і сапраўдныя знакі-сляды — выявы сілуэта рукі чалавека.

Разгледзьце малюнкі ў параграфе і на кампакт-дыску. Успомніце, з якімі версіямі паходжання мастацтва вы пазнаёміліся раней.

Першабытны чалавек яшчэ не раздзяляў паўсядзённае жыццё і мастацкую творчасць. Але ўжо ў раннім мастацтве творцы выяўлялі свае пачуцці і ўяўленні пра свет. Першабытныя вобразы настолькі ўнікальныя і выразныя, што і сёння імі захапляюцца гледачы, натхняюцца мастакі.

### Пытанні і заданні

1. Чаму наскальныя малюнкі, выкананыя ў першабытную эпоху, цікавыя сучаснаму чалавеку? Пра што расказвае нам першабытнае мастацтва?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Нямецкі мастак Па́уль Клее́ захапляўся мастацтвам першабытнага перыяду. У яго карціне мы можам бачыць простыя лініі ў спалучэнні з яркімі і даволі змрочнымі фарбамі. Як вы думаеце, што ў мастацтве першабытных часоў натхніла мастака?



**Пауль Клее.** Смерць і агонь (1940 г.)

### Творчая майстэрня

3. Выканайце малюнак на любую тэму ў стылістыцы першабытнага мастацтва. Вазьміце для гэтага чорны фламастар і выкарыстоўвайце толькі лінію. Гэты малюнак можна зрабіць на камп'ютары ў адной з графічных праграм.

## § 2. Сюжэты і вобразы першабытных выяў

Ішоў час, і чалавек захацеў не толькі пакінуць след, але і перадаць свой аповед пра ўбачанае і перажытае — у сюжэтах і вобразах.

**Увасабленне вобраза жывёлы.** Адным з першых адлюстраваных вобразаў рэальнага свету была жывёла. Людзі ўважліва назіралі за жывёламі і імкнуліся намаляваць іх як мага больш натуральна і праўдападобна. Гэта пацвярджаюць графічныя і жывапі́сныя выявы першабытных часоў, якія пакрываюць сцены і скляпенні шматлікіх пячор сучасных Францыі, Іспаніі, Расіі.



Мамант. Прадрапаны малюнак у пячоры Руфіньяк, Францыя (каменны век)

Большасць малюнкаў складаюць вобразы мамантаў, насарогаў, дзікіх коней, аленяў, быкоў, мядзведзяў, ільвоў. Некаторыя з адлюстраваных жывёл ужо не існуюць, напрыклад маманты. І толькі малюнкі, створаныя першабытным чалавекам, дазваляюць нам сёння ўявіць іх знешні выгляд, рухі цела і звычкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Алені, якія пераходзяць праз раку. Гравіроўка на розе з грота Лартэ, Францыя (каменны век)



Бізон, які аблізвае свой бок, з пячоры Ла-Мадлéн, Францыя (каменны век)



Мядзведзь у пячоры Мантэспан, Францыя (каменны век)

У Францыі, у гроце Лартэ́, быў знойдзены фрагмент рога з малюнкам аленяў, якія пераходзяць праз раку. Першабытны чалавек ужо ўмеў адлюстроўваць жывёл у складаных ракурсах, напрыклад з паваротам галавы. Уражвае і дэталізаваная выява рыб, якія знаходзяцца ў вадзе.

Пазней чалавек пачаў наносіць выявы жывёл на прылады працы і палявання — на розныя пласціны з каменю і косці. А ў месцах першабытных стаянак былі знойдзены маленькія статуэткі жывёл, птушак, рыб. Асабліва выразныя сілуэты жывёл. Людзі, якія іх стваралі, заўважалі самыя дробныя дэталі: асаблівасці лускі рыбы, фактуры футра, грывы ці будовы рагоў жывёл.

У адной з пячор Францыі — Мантэспа́н — знойдзена тулава мядзведзя з гліны. Увенчана яно было натуральным мядзведжым чэрапам. Магчыма, наверх накідвалі і шкуру мядзведзя. Мы здагадваемся, што такая скульптура выкарыстоўвалася падчас рытуалаў.

З развіццём першабытнага грамадства сюжэты ўскладняліся, а ў адлюстраваных сцэнах усё часцей з'яўляўся чалавек.

? Параўнайце выявы жывёл у параграфе. Якая з іх лепш «расказвае» пра звычкі і характар жывёлы? Ці маглі гэтыя выявы выкарыстоўвацца ў абрадах і рытуалах?

**Вобраз чалавека ў першабытным мастацтве.** Першыя выявы чалавека з'явіліся ў скульптуры. Яны былі выкананы з костак і рагоў жывёл, біўняў сланоў і мамантаў, гліны, дрэва і каменю.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Шырокае распаўсюджанне атрымалі жаночыя статуэткі. Самыя характэрныя з іх — жаночыя фігуркі, вядомыя ўсяму свету пад назвай «палеалітычныя Венеры» ці «першабытныя мадоны». Гэтыя маленькія статуэткі не перавышаюць у вышыню 25 сантыметраў. У многіх з іх адсутнічаюць ці амаль не прапрацаваныя галава і рукі. Затое падкрэслены часткі цела, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Хутчэй за ўсё, палеалітычныя Венеры сімвалізавалі ўрадлівасць.



Венера з вёскі Касцёнкі, Расія (каменны век)

У мастацтве *бронзавага веку* з дрэва ці каменю пачалі ствараць *і́далаў*. Гэта былі спецыфічныя статуі даволі вялікіх памераў. Ім пакланяліся як божаствам. Знешні выгляд статуй быў падобны да чалавечага, часцей мужчынскага.



Вялікі Шыгірскі ідал, Расія (бронзавы век)

Адна з самых ранніх знойдзеных скульптур, вырабленых з дрэва, — Вялікі Шыгірскі ідал. Яго вышыня дасягае 5 метраў. Па ўцалелых фрагментах можна ўявіць вобраз, створаны 11 тысяч гадоў назад. Галава ідала досыць рэалістычная і захоўвае асноўныя рысы, уласцівыя чалавеку. Драўляная аснова-тулава абапал пакрыта разны́м арнаментам. Сярод узораў бачныя некалькі твараў. Навукоўцы схіляюцца да версіі, што гэтыя твары адлюстроўваюць ушанаваныя культы старажытных людзей: вады і паветра, жывёл і раслін.

У мастацтве *жалезнага веку* вобраз чалавека ўскладніўся. Мастакі стараліся не проста адлюстраваць чалавечую фігуру, а раскрыць унутраны стан персанажаў, праз паставу і жэсты перадаць эмоцыі і думкі сваіх герояў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Арфіст з Кікладскіх астравоў, Грэцыя (жалезны век)



Выган жывёлы. Фрагмент наскальнага роспісу ў цясніне Тасілін-Аджэр, Алжыр (жалезны век)

На астравах Эгейскага мора жыхары Кікла́д стварылі мармуровыя статуэткі людзей. Іх прызначэнне дагэтуль застаецца загадкай. Магчыма, статуэткі былі часткай абрадаў. Сярод кікладскіх ідалаў асабліва вылучаецца фігура арфіста. Музы́ка адлюстраваны седзячы на стуле з арфай у руках. Ён цалкам пагрузіўся ў мелодыю, якая гучыць. Цела музыкі застыла, а погляд накіраваны ўвысь.

Сярод жывапісных кампазіцый жалезнага веку шырока вядомыя роспісы, знойдзеныя ў цяснінах скал Алжыра, на плато Тасілі́н-Аджэ́р. Гэта сапраўдная «маляўнічая галерэя», якая падрабязна расказвае пра паўсядзённае жыццё першабытных людзей і іх заняткі. Тут прадстаўлены вобразы паляўнічых, якія з дапамогай лукаў, стрэл, сякер і дроцікаў перамагаюць дзікіх звяроў. А сцэны выгана скаціны сведчаць пра тое, што чалавек у той перыяд ужо прыручыў жывёлу. Праўдападобнымі і кранальнымі выглядаюць выявы маці, якія гуляюць са сваімі дзецьмі.

Уважліва разгледзьце выявы кікладскіх ідалаў у параграфе і на кампакт-дыску. Назавіце адметныя асаблівасці гэтых скульптур.

Выкарыстоўваючы самыя простыя сродкі выявы, першабытны чалавек здолеў увасобіць у мастацтве свае ўяўленні пра свет і пра сябе. З дапамогай фарбаў, у камені, гліне і дрэве ён захаваў найбольш значныя падзеі свайго жыцця і адлюстраваў прыродны свет.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Пытанні і заданні

Разгледзьце выявы жывёл, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Як вы думаеце, на што мастак звяртаў увагу ў першую чаргу? Што для яго было галоўным у кожным прыкладзе?

1. Выяве жывёл адводзілася важнае месца і ў творчасці многіх майстроў больш позніх часоў. Успомніце і назавіце знаёмыя вам творы розных відаў мастацтва, у якіх увасоблены вобразы жывёл.

2. Разгледзьце работы, прысвечаныя вобразу маці і дзіцяці. Параўнайце вобразы, створаныя першабытным чалавекам і скульптарам XX стагоддзя. Знайдзіце падабенства і адрозненні.



Маці з дзіцем. Фрагмент наскальнага роспісу ў цясніне Тасілін-Аджэр, Алжыр (жалезны век)



**Генры Мур.** Маці і дзіця (г. Люксембург, 1930-я гг.)

## Творчая майстэрня

3. Выканайце жывапісную кампазіцыю з выявай адной ці некалькіх жывёл у стылістыцы наскальнага жывапісу першабытных часоў (гуаш).

## § 3. Асваенне прасторы: зараджэнне архітэктуры

У далёкія часы, калі чалавек яшчэ не навучыўся ўзводзіць збудаванні, жыллём яму служылі сховы, падказаныя прыродай: густыя галіны дрэў, пячоры, гроты ў скалах. Паступова людзі сталі больш упэўнена адчуваць сябе ў навакольным свеце. Яны асвоілі новыя землі, навучыліся ўзаемадзейнічаць з прыродай, напрыклад «прыручылі» агонь. Але галоўнае — у людзей узнікла патрэба ў стварэнні жылля сваімі рукамі.

**Першыя спробы будаўніцтва.** Першае жыллё з'явілася ў каменным веку. Спачатку гэта былі простыя *заслоны* ад ветру з лісця і *шалашы* з тонкіх жэрдак і костак жывёл, пакрытыя шкурамі, травой,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Жыллё першабытнага чалавека. Рэканструкцыя Ігара Грабнёва

лісцем. Іх узвядзенне не патрабавала вялікіх выдаткаў сіл і часу. Але такія віды жылля маглі лёгка разбурыць вятры, дажджы, знішчыць жывёлы пры нападзенні. Таму ўзнікла неабходнасць змяніць канструкцыю жылля.

На змену шалашам прыйшлі *зямлянкі* і *паўзямлянкі*. Гэта паглыбленыя пляцоўкі круглай ці авальнай формы, умацаваныя па акружнасці камянямі ці косткамі буйных жывёл. Дугападобная форма рэберных костак жывёл дазваляла пабудаваць аснову сцен і скляпенняў жылля, якое нагадвала шацёр. У цэнтры зямлянкі размяшчаўся ачаг — неглыбокая яма, абкладзеная камянямі.

Шалашы, зямлянкі і паўзямлянкі некалькі тысячагоддзяў заставаліся галоўным жыллём чалавека. Гэта было звязана з тым, што людзі, здабываючы сабе пражытак паляваннем, вандравалі за жывёламі. Таму лёгкае жыллё, якое хутка ўзводзіцца (як сучасныя палаткі), цалкам задавольвала людзей. Але пазней, калі колькасць людзей павялічылася, калі чалавек перайшоў да аседлага ладу жыцця, спатрэбілася больш устойлівае жыллё. Так з'явіліся стаянкі — неўмацаваныя лагеры першабытных паляўнічых і збіральнікаў.

На змену стаянкам паляўнічых каменнага веку прыйшлі *гарадзішчы* — комплекс пабудоў, размешчаны на ўзвышэнні ля ракі і абнесены ўмацаваннямі, напрыклад земляным валам, агароджай. У іх магла



Дзья́кава гарадзішча ў Маскоўскай вобласці, Расія (V—III стст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пасяліцца ўся родавая абшчына. Вакол гарадзішчаў размяшчаліся *паселішчы* (селішчы) — групы жылля без агароджы.

Унутры паселішчаў жыллё дасягала 6—8 метраў у даўжыню. У кожным з іх пражывала некалькі сем'яў, а ўнутры размяшчалася некалькі ачагоў. І толькі ў канцы каменнага веку жыллё атрымала выгляд хаты, падзеленай на некалькі памяшканняў.

Успомніце з урокаў гісторыі самыя вядомыя паселішчы і гарадзішчы першабытных людзей.

**Архітэктура: загадкі гісторыі.** У першабытную эпоху вельмі важным было афармленне пахаванняў — месцаў, дзе хавалі чалавека. Звычайна над магілай чалавека будавалі курган — насып з зямлі ці камянёў.

Курганы мелі форму паўсферы ці конуса. Размяшчаліся яны галоўным чынам групамі: часам да 10—15 курганоў побач. Чалавек размяшчаў курганы ў прасторы не хаатычна. Ён прадумваў, як яны будуць звязаны з лесам, ракой, полем. Пастулова людзі пачалі пераходзіць да больш маштабнага асваення навакольнага свету.

У бронзавым веку, акрамя жылля і пахаванняў, людзі сталі ўзводзіць і іншыя

**Цікавы факт**

У Мінску, у мікрараёне Паўднёвы захад, да нашых дзён захаваўся курган дрыгавічоў. Яшчэ напачатку ХХ стагоддзя ў беларускай сталіцы налічвалася каля 70 курганаў.



Адзін з 16 курганаў бронзавага веку, Расія



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

збудаванні — для правядзення розных магічных і рытуальных дзеянняў. Гэтыя збудаванні стваралі з вялікіх камянёў. Таму і называюць іх мегалі́тамі. Гэта самая загадкавая з усіх з’яў першабытнай культуры. Паступова сфарміраваліся асноўныя тыпы мегалітаў: менгіры, дальмены, кромлехі.

Менгі́р уяўляў сабой вертыкальна пастаўлены камень вышынёй да 5 метраў. Менгіры знойдзены на тэрыторыі розных краін Еўропы, Азіі і Афрыкі. Найбольшая іх колькасць захавалася ў Францыі. Дакладнае прызначэнне менгіраў невядома. Старажытныя людзі ўстанаўлівалі іх, як і манументы, у месцах, найбольш значных з пункту гледжання вераванняў. Першапачаткова на менгірах не было малюнкаў, але пазней некаторыя з іх сталі пакрываць гравіраваным арнаментам ці выявамі.

Дальме́ны — больш складаныя збудаванні з некалькіх гіганцкіх камянёў. Часцей за ўсё дальмен узводзілі з шасці і больш велізарных камянёў, адзін з якіх служыў асновай, другі — перакрыццем, а астатнія — апорамі. Нярэдка ў адной са «сцен» дальмена знаходзілася круглая адтуліна ці быў высечаны праём у выглядзе аркі. Існуе тэорыя, што дальмены мелі культавае прызначэнне і з’яўляліся праобразам першага храма.

Кро́млех таксама ўзводзілі з каласальных па памерах камянёў, якія размяшчалі па акружнасці. Да нашага часу кромлехі не захаваліся ў першародным выглядзе. Таму высветліць іх прызначэнне досыць складана. Адны навукоўцы лічаць, што кромлех уяўляў сабой абгароджанае месца для правядзення розных рытуалаў, у тым ліку ахвярапрынашэнняў. Другія навукоўцы прытрымліваюцца гіпотэзы, што кромлех стваралі як абсерваторыю, у якой можна было назіраць за нябеснымі свяцiламі.



Менгіры ў вёсцы Карна́к, Францыя



Дальмен на востраве Корсіка, Францыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Разгледзьце выявы мегалітаў, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Якое ўражанне зрабілі на вас гэтыя збудаванні?

**Кромлех Стоўнхендж.** Кромлехі сустракаюцца ў розных краінах Еўразіі. Але найбольшую славу атрымаў кромлех Стоўнхендж у Англіі.

Гіганцкае каменнае збудаванне зачароўвае сваімі формамі. Шматтонныя камяні маюць вышыню ў два і больш чалавечых росты. Рэканструкцыя мегаліта дазваляе ўявіць яго першапачатковы выгляд. Збудаванне мела форму кольца з вертыкальна пастаўленых камянёў, на якіх ляжалі камяні-перамычкі. Па акружнасці мегаліт быў умацаваны двума землянымі валамі і ровам. У цэнтры размяшчалася алтарная пліта, акружаная двума кольцамі камянёў. Алтар абрамлялі пяць трылі́таў — збудаванняў з трох камянёў, два з якіх служаць апорамі, а трэці — перамычкай.

Англійскі мастак XIX стагоддзя Джон Канстэ́бл стварыў цудоўную акварэль, дзе паказаў Стоўнхендж падчас стыхіі, якая разбушавалася. Як вы думаеце, што прывабіла Канстэбла ў руінах Стоўнхенджа? Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў ён паказаў сваё стаўленне да гэтага помніка? А ў якіх фарбах Стоўнхендж намалявалі б вы? Растлумачце свой адказ.



Сучасны мастак малюе Стоўнхендж



**Джон Канстэбл.**
Стоўнхендж (XIX ст.)

Архітэктуру не выпадкова называюць прамаці мастацтваў. Яна з'яўляецца не толькі вынікам творчасці, але і асновай для іншых відаў мастацтва.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Пытанні і заданні

1. Нямецкі філосаф XIX стагоддзя Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель пісаў: «Пачаткам мастацтва з'яўляецца архітэктура». Як вы думаеце, што меў на ўвазе навуковец?

2. Назавіце асноўныя будаўнічыя матэрыялы, якія першабытны чалавек выкарыстоўваў пры стварэнні свайго жылля.

Прачытайце на дадатковай старонцы ўрывак з апавядання французскага пісьменніка Эрнэста Д'Эрвільі «Прыгоды дагістарычнага хлопчыка». Аўтар апісвае два тыпы жылля чалавека. Якія? Вусна апішыце іх.

## Творчая майстэрня

3. У мінскім Музеі валуноў на велізарнай тэрыторыі сабрана больш за 2 тысячы камянёў з розных рэгіёнаў Беларусі. Цікавая ідэя іх размяшчэння: валунамі выкладзены сілуэт нашай краіны, адзначаны самыя высокія кропкі ландшафту і самыя вялікія вадаёмы. Памеры і сілуэты камянёў уражвалі першабытных людзей, але яны здольныя ўсхваляваць і сучаснага чалавека. Экспанаты музея прымушаюць успомніць пра велізарную сілу каменю — самага даўгавечнага матэрыялу на зямлі. Разгледзьце фотаздымак. Прапануйце ідэю мерапрыемства (квест, фестываль, канцэрт), якое можна правесці ў Музеі валуноў у Мінску. Падумайце, як на гэтым мерапрыемстве можна выкарыстоўваць вобразы мегалітаў.



Музей валуноў у Мінску, Беларусь

# § 4. Мастацтва першабытных часоў на беларускіх землях

Лад жыцця першабытных людзей быў падобны ў розных кутках планеты. У той жа час у кожным рэгіёне склаліся і арыгінальныя формы творчага асэнсавання навакольнага свету. Свой след у мастацтве пакінулі і тыя першабытныя людзі, якія жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

**Першыя стаянкі**. На поўдні нашай краіны, у Гомельскай вобласці, напачатку XX стагоддзя былі знойдзеныя стаянкі каменнага веку Юравічы і Бердыж. На іх знайшлі прадметы, якія маюць важнае значэнне для разумення таго, як развівалася мастацтва.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Стаянка Бердыж (каменны век). Макет з Чачэрскага гісторыка-этнаграфічнага музея

На стаянцы Бердыж археолагі знайшлі жыллё з костак мамантаў. У цэнтры жылля размяшчалася вогнішча. Каб узвесці такую пабудову з даступных матэрыялаў, усім насельнікам стаянак трэба было выканаць даволі складаныя работы. Магчыма, патрэба старэйшага пакалення перадаваць вопыт маладзейшым і стала пачаткам з'яўлення мастацкай творчасці.



Падвеска са сківіцы куніцы (каменны век)

Адны з самых старажытных твораў мастацтва, знойдзеных на стаянках на тэрыторыі Беларусі, — падвескі з костак жывёл. Гэтыя рэчы былі не проста ўпрыгажэннем касцюма. У іх выяўлялася імкненне чалавека абараніць сябе, набыць якасці, якія лічыліся неабходнымі для адважных паляўнічых, адказных за сваю сям'ю. Верагодна, людзі думалі, што такія ўпрыгажэнні могуць перадаць чалавеку сілу, спрыт і хуткасць звера.

Чаму, на ваш погляд, першымі творамі мастацтва былі менавіта падвескі з костак жывёл?

**Увасабленне вобраза чалавека.** У прадметах мастацтва першабытныя мастакі імкнуліся паказаць асаблівасці аблічча чалавека.

Яркім прыкладам майстэрства ва ўвасабленні чалавека з'яўляюцца невялікія вырабы са стаянкі Асаве́ц з Віцебскай вобласці. Фрагмент вырабу з косткі — галава з падоўжаным авалам твару, даўгаватым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



носам, буйнымі вачамі. На тыльным баку гэтай рэчы маецца адтуліна для нашэння ў якасці амулета.

Скульптурка з дрэва ўяўляе сабой суровы мужчынскі вобраз з вельмі выразнай мімікай. Ссунутыя бровы і сціснутыя вусны выдатна перадаюць яго характар. Сёння мы можам толькі здагадвацца пра тое, хто перад намі: абагульненыя вобразы супляменнікаў ці выявы грозных божастваў.

На месцы паселішча каля вёскі Азярное ў Мінскай вобласці была знойдзена костка, на якой выгравіравана постаць мужчыны з ускінутымі рукамі. Ён быццам падскоквае ў танцы і нібыта штурхае нагой фігурку, змешчаную ўнізе. На адваротным баку косткі размяшчаецца яшчэ адна выява чалавека.



Скульптурныя выявы са стаянкі Асавец (каменны век)

Разгледзьце выявы чалавека, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Пра што расказваюць нам творы старажытных мастакоў?

**Увасабленне вобраза жывёлы.** Не меней віртуозна майстры каменнага веку паказвалі жывёл. На буйной птушынай костцы са стаянкі Азярное захаваўся толькі фрагмент выявы. Але і цяпер можна ацаніць майстэрства разьбяра, які дакладнымі лініямі і кароткімі рысачкамі паказвае звера, што імкліва бяжыць сярод зараснікаў.



Гравіроўка на костцы (каменны век)



Выява жывёліны на птушынай костцы (каменны век)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рэчы з выявамі жывёл былі знойдзены таксама на стаянцы Асавец. Статуэтка аленя выдатна перадае грацыёзную пластыку звера. Мастак любуецца яго велічнай постаццю.

Дакладна перададзены і вобраз качкі. Мы бачым характэрны выгін шыі вадаплаўнай птушкі, які стварае знаёмы сілуэт. Вытанчаная фігурка змейкі, пакрытая выразным узорам, мае невялікую адтуліну для нашэння ў якасці амулета. Разглядаючы гэтыя творы, мы разумеем, якіх звяроў людзі шанавалі ў старажытнасці.



Статуэтка з косткі «Алень» (каменны век)



Змейка з рога (каменны век)



Галава качкі (каменны век)

Як вы думаеце, чым адрозніваюцца выявы жывёл, створаныя ў першабытныя часы і выкананыя сучаснымі мастакамі?

**Прыгажосць звычайных рэчаў.** Важным вынаходствам каменнага веку стаў гліняны посуд. У тыя часы яго выраблялі ўручную. З мяккай глінянай палоскі фармавалі вастрадонную ці кругладонную пасудзіну, згладжвалі сценкі і ўпрыгожвалі іх арнаментам. Пакрывалі посуд дэкорам у выглядзе ямачак, ялінак, зігзагаў. Акрамя арнаменту, на керамічных вырабах сустракаліся і іншыя выявы, напрыклад вадаплаўных птушак.

У бронзавым веку з'явіліся рэчы з медзі і бронзы. Вядома, яны выкарыстоўваліся разам з шырока распаўсюджанымі каменнымі вырабамі. Часцей за ўсё з бронзы стваралі рытуальныя



Фрагмент керамікі каменнага веку



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Бронзавая шпілька



Бронзавая сякера



Упрыгажэнні з бурштыну

рэчы. Таму яны былі багата ўпрыгожаны і з'яўляліся каштоўнымі. Цаніўся і «сонечны камень» — бурштын.

Чаму ў мастацкай культуры першабытнага грамадства самае шырокае распаўсюджанне атрымала менавіта дэкаратыўна-прыкладное мастацтва?

**Культура старажытных гарадзішчаў.** У жалезным веку на беларускіх землях з'явіліся ўмацаваныя паселішчы — гарадзішчы. Гэта было звязана з назапашваннем каштоўнасцей у родавых абшчынах. Як правіла, гарадзішчы будаваліся на ўзвышшах ці ў цяжкадаступных балоцістых месцах. Ад ворагаў гарадзішчы былі абаронены надзейнымі сценамі з драўляных слупоў, якія агароджвалі пляцоўкі з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, месца пахаванняў.



Гарадзішча Нікадзімава (VII—V стст. да н. э.). Макет з Краязнаўчага музея г. Магілёва



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Бронзавая падвеска-лу́нніца з эмаллю



Завушніца з белага металу



Бронзавая падкowападобная фібула з эмаллю



Шкляныя каралі



Цацка

Побыт гарадзішчаў быў багаты і разнастайны. Знойдзеныя падчас археалагічных раскопак бранзалеты, падвескі, фі́булы, шпількі, пацеркі і сёння здзіўляюць дасканалай працай майстроў, якія валодалі рознымі тэхнікамі апрацоўкі металу і шкла. Цікавай знаходкай сталі і гліняныя цацкі, якія ўвасабляюць птушак і звяроў. Яны красамоўна расказваюць нам пра жыццё чалавека ў жалезным веку.

Назавіце асаблівасці арганізацыі першабытнага гарадзішча, якія нагадваюць вам сучасны населены пункт.

Незважаючы на суровы лад жыцця, першабытныя людзі ўмелі бачыць прыгажосць і рабілі цудоўныя рэчы, якія ўражваюць і сёння. Знойдзеныя творы мастацтва — сведчанне неверагоднай назіральнасці і таленту першабытных майстроў.

### Пытанні і заданні

1. Уважліва разгледзьце фрагмент касцяной скульптурнай выявы галавы чалавека, знойдзенай на стаянцы Асавец. Як вы думаеце, хто на ёй увасоблены: першабытны чалавек ці бажаство? Абгрунтуйце свой пункт гледжання.

Вывучыце разнастайныя формы ўпрыгажэнняў жалезнага веку, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Якія з гэтых форм выкарыстоўваюцца ў сучасным ювелірным мастацтве?

### Творчая майстэрня

2. Здзейсніце экскурсію ў краязнаўчы музей у вашай вобласці. Наведайце афіцыйны партал «Музеі Беларусі» (museum.by). Пазнаёмцеся з


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тамара Васюк. Работа з серыі «Архаіка» (2009 г.)

іншымі краязнаўчымі музеямі нашай краіны. Разгледзьце творы першабытнай эпохі. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі з аднакласнікамі.

3. Сучасная беларуская мастачка Тамара Васюк стварае вырабы па матывах керамікі каменнага веку. Разгледзьце твор гэтага майстра. Намалюйце эскіз любога прадмета побыту, на якім таксама будзе прысутнічаць арнамент першабытнага мастацтва.

## § 5. Язычніцкая культура на беларускіх землях

Да канца першага тысячагоддзя на беларускіх землях сфарміраваліся саюзы плямёнаў, кожны з якіх меў адметныя асаблівасці. Значную ролю ў беларускай культуры адыгралі тры племянныя аб'яднанні славян: крывічы, дрыгавічы, радзімічы.

Успомніце з урокаў гісторыі, як на беларускіх землях у старажытнасці з'явіліся славянскія плямёны.

**У што верылі старажытныя славяне.** Славянская культура развівалася пад уплывам язычніцкіх вераванняў. Язычніцтва адлюстроўвала ўяўленні славян пра светабудову. Яны абагаўлялі прырод-



Радзімічскі медальён з галавой быка



**Лілія Нішчык.** Вялес (2008 г.)



Фрагмент арнаменту традыцыйнага тэкстылю



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ныя з'явы і верылі ў магутнасць шматлікіх багоў, якія гэтыя з'явы ўвасаблялі. У плямёнаў, якія насялялі беларускія землі, быў пашыраны культ ушанавання продкаў, які адлюстраваўся ў складаных рытуалах пахавання.

Важнымі былі і абрады, звязаныя з земляробствам. Жыццё чалавека залежала ад прыродных цыклаў і з'яў. Змене пор года, розным відам земляробчых работ адпавядалі пэўныя язычніцкія святы. Напрыклад, Каляды і Купалле прымеркаваны да зімовага і летняга сонцастаяння, а «Гуканне вясны» і «Багач» — да пачатку і заканчэння палявых работ.

З летапісаў і фальклору мы можам даведацца пра старажытных багоў: Перуна, Вялеса, Ярылу... Але гэта толькі рэха старажытнай міфалогіі. Сістэма старажытных вераванняў дайшла да нас фрагментамі. Асобныя элементы гэтай сістэмы мы можам убачыць у народным мастацтве. Напрыклад, у традыцыйных ткацтве і вышыўцы. Майстрыхі на палатне паўтараюць арнаментальныя ўзоры, якія захаваліся са старажытнасці.

> Или так бы запел ты, вещий Боян, внук Велесов:
> «Кони ржут за Сулой — звенит слава в Киеве.
> Трубы трубят в Новгороде, стоят стяги в Путивле».
>
> *«Слово о походе Игоревом...»*

? Якія старажытныя народныя святы, звязаныя з пэўнымі каляндарнымі датамі, вы ведаеце? Раскажыце пра іх.

**Славянскія свяцілішчы.** Вялікае значэнне ў культуры старажытных славян мелі культавыя збудаванні. У свяцілішчах божаствам узносілі малітвы, прыносілі ахвяры ў надзеі на іх дапамогу і абарону. Для ўзвядзення такіх збудаванняў выбіралі месцы на берагах азёр і рэк, узвышэннях, у глухіх лясах і на балотах. Пляцоўкі рознай формы агароджвалі валамі і равамі. У свяцілішчах размяшчалі алтары-ахвярнікі, вогнішчы і ідалаў — выявы багоў.

Для стварэння свяцілішчаў выкарыстоўвалі велізарныя камяні — валуны. Гэта былі і асобныя вертыкальна стаячыя камяні, і камяні,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

размешчаныя ў пэўным парадку. Выбар матэрыялу не выпадковы. Камяні, амаль не падуладныя часу, да нашых дзён захоўваюць тысячагадовыя таямніцы.

На возеры Янова ў Полацкім раёне знаходзіцца комплекс з валуноў, які многія навукоўцы лічаць рэштkamі старажытнага свяцілішча. Камяні размешчаны ў форме літары «П» і маюць адмысловы, чырванаваты колер.

**Цікавы факт**

Захаваліся звесткі, што ў Мінску на рацэ Свіслач да пачатку XX стагоддзя існавала язычніцкае капішча. Цяпер камень, які размяшчаўся на гэтым капішчы, знаходзіцца ў мінскім Музеі валуноў.

Цэнтральнае месца ў старажытных свяцілішчах займалі ідалы. Гэта выявы свавольных і грозных божастваў зямнога, нябеснага і падземнага светаў. Напачатку XX стагоддзя ў горадзе Слоніме быў знойдзены ідал, які быў высечаны з шэра-чырвонага каменю і атрымаў назву «Слонімскі». У гэтай скульптуры рысы твару паказаны ўмоўна, без дэталёвай прапрацоўкі. Але сіла ўздзеяння старажытнага твора адчуваецца і сёння. Сціснутыя вусны, вочы, якія нібы ўзіраюцца ў глыбіню стагоддзяў, уражваюць суровай непрыступнасцю.

Некаторыя каменныя статуі мелі крыжападобную форму, якая нагадвала жаночую фігуру з шырока раскінутымі рукамі. Напрыклад, адна з самых вядомых скульптур — Даўгінаўскі ідал — унікальная тым, што ў ёй спалучаюцца дзве фігуры. Сілуэт маленькага чалавека выбіты на большай фігуры і паўтарае яе абрысы.



Валуны на возеры Янова



Даўгінаўскі ідал (X ст.)



Слонімскі ідал (X ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Навукоўцы лічаць, што Даўгінаўскі ідал увасабляе адну з багінь-заступніц урадлівасці, сям'і і шлюбу — Ма́ру, Ла́ду ці Мокаш. Як вы думаеце, на чым заснавана гэта здагадка?

**Упрыгажэнні з курганоў.** Уяўленні старажытных славян пра замагільны свет адлюстроўваюць *курганы*. Падчас раскопак археолагі знаходзяць у іх разнастайны посуд, прылады працы, ювелірныя ўпрыгажэнні. У пахаваннях нашы продкі змяшчалі тое, чым карыстаўся памерлы пры жыцці. Кожнае са славянскіх плямёнаў мела свае традыцыі пахавання і набор упрыгажэнняў касцюма.

| Упрыгажэнні са славянскіх курганоў | | |
|---|---|---|
| **Крывічы** | **Дрыгавічы** | **Радзімічы** |
|  |  |  |

Для касцюма крывічанак характэрныя скроневыя кольцы простай формы, якія нагадваюць бранзалеты. Асаблівасцю іх касцюма былі вітыя шыйныя гры́ўны, шкляныя пазалочаныя каралі, трапецыяпадобныя падвескі і металічныя бразготкі.

Адметнай рысай касцюма дрыгавічанак былі металічныя пацеркі, на якія напайваліся маленькія шарыкі — зернь. Такія пацеркі выкарыстоўвалі для скроневых кольцаў і іншых упрыгажэнняў.

Касцюм радзімічанак быў асабліва яркі. Яго ўпрыгожвалі рознакаляровыя каралі з металічнымі падвескамі, вельмі буйныя грыўны і самыя складаныя па форме скроневыя кольцы з сямю прамянямі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Разгледзьце ўпрыгажэнні нашых продкаў. Якое ўражанне яны на вас зрабілі? Прыдумайце эскіз ювелірнага вырабу па матывах старажытных упрыгажэнняў, знойдзеных на беларускіх землях.

Язычніцкія вераванні старажытных славян знайшлі адлюстраванне ў мастацкіх творах, старажытных збудаваннях і пахаваннях. Прыродныя з'явы, якім пакланяліся, увасобіліся ў вобразах магутных божастваў. А рэчы, якія знаходзяць у курганах, «расказваюць» пра жыццё нашых продкаў.

### Пытанні і заданні

1. Успомніце, з якімі творамі мастацтва вы пазнаёміліся ў раздзеле «У пошуках прыгажосці: мастацтва першабытных часоў». Пералічыце асноўныя сюжэты, якія нам «расказваюць» нашы продкі.

2. Як вы думаеце, чаму адзін з параграфаў атрымаў назву «Мастацтва першабытнай эпохі: пасланне нашчадкам»? Растлумачце свой адказ з дапамогай мастацкіх прыкладаў.

3. Выказванне нямецкага мастака Альбрэхта Дзюрэра «Сапраўды, мастацтва заключана ў прыродзе; хто ўмее выявіць яго, той валодае ім...» можна суаднесці з мастацтвам першабытнай эпохі. Як вы думаеце чаму?

### Творчая майстэрня

4. Язычніцкія вераванні славян знаходзяць адлюстраванне і ў сучасным мастацтве. Мастакі Беларусі натхняюцца старажытнымі легендамі і народнымі святамі. Пазнаёмцеся з работай беларускага мастака Сяргея Цімохава «Гуканне вясны». Ахарактарызуйце яе. Што вас зацікавіла ў малюнку?



**Сяргей Цімохаў.**
Гуканне вясны
(1997 г.)

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах тэатралізаваную дзею «Гуканне вясны». Падрыхтуйце пра яе невялікае апавяданне, адказаўшы на пытанні: што робяць людзі? як яны апрануты? якія песні спяваюць? якія танцавальныя рухі выконваюць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 2

# Мастацтва, якое застыла на тысячагоддзі: Старажытны Егіпет

Жизненной силе зерна жизнь уподоблю твою.
Восходящее солнце — твой лик.
Весёлости полон твой взор.
Руки свои простираешь и раскрываешь уста
Для восхваления Ра...

*Древнеегипетский гимн в честь бога Ра*
*(перевод А. Ахматовой, В. Потаповой)*



Тутанхамон з жонкай. Упрыгажэнне спінкі трона з грабніцы Тутанхамона (XIV ст. да н. э.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 6. Ідэі вечнага жыцця ў старажытнаегіпецкай архітэктуры

Культура Старажытнага Егіпта — адна з найстаражытнейшых на Зямлі. У аснову большасці твораў старажытнаегіпецкага мастацтва пакладзена *ідэя вечнага жыцця*. Егіпцяне спадзяваліся, што мастацтва можа дапамагчы чалавеку яго здабыць. І найвялікшыя надзеі яны ўскладалі на архітэктуру — самае «даўгавечнае» мастацтва.



Піраміда фараона Джóсера ў Сакары (III тыс. да н. э.)

**Піраміды Старажытнага Егіпта.** Сярод нямога пяшчанага свету пустыні егіпцяне ўзводзілі з каменю ці высякалі ў скалах грандыёзныя збудаванні — грабніцы, каб яны стаялі вечна і надзейна абаранялі спакой нябожчыкаў.

Самыя вялікія пахаванні майстравалі для валадароў Старажытнага Егіпта — фараонаў, якія, як лічылася, і пасля смерці працягвалі клапаціцца пра свой народ.



Вялікія піраміды ў Гі́зе (III тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Многія грабніцы мелі форму *піраміды*. Першую піраміду пабудавалі для фараона Джосера. Яна мела ступеньчатую форму. Пастаўленыя адна на адну шэсць каменных платформаў, якія паслядоўна змяншаюцца, утвараюць велічнае збудаванне вышынёй 60 метраў. Сваёй формай пахаванне нагадвае гіганцкую лесвіцу, па прыступках якой памерлы фараон мог падняцца на неба, у царства багоў. Такую форму стварыў Імхатэ́п — вучоны і архітэктар, якога пасля смерці егіпцяне абагавілі.

**Цікавы факт**

Піраміды былі абліцаваны паліраванымі пласцінамі, таму на яркім сонцы іх паверхня блішчала.

Неўзабаве ў Старажытным Егіпце сталі будаваць піраміды з роўнымі нахіленымі гранямі. Менавіта такімі з'яўляюцца *Вялікія піраміды ў Гізе*. Такія ідэальныя геаметрычныя формы былі створаны ў архітэктуры ўпершыню. Самае высокае з пахаванняў — піраміда фараона Хеопса — дасягае 138,7 метра. А гэта вышыня 40-павярховага дома! Манументальная архітэктура егіпецкіх пірамід і сёння робіць на чалавека незабыўнае ўражанне.



Сфінкс Хефрэна (III тыс. да н. э.)

Побач з Вялікімі пірамідамі знаходзіцца *Вялікі сфінкс*. Гэта скульптурны партрэт фараона Хефрэ́на ў вобразе фантастычнай істоты з целам ільва і галавой чалавека. Так егіпцяне адлюстравалі надзвычайную моц свайго валадара як абаронцы Егіпта. Піраміды і сфінксы ўвасаблялі вечную стабільнасць і непахіснасць існавання старажытнаегіпецкай дзяржавы.

Разгледзьце помнікі старажытнаегіпецкай архітэктуры. Якія з іх вы хацелі б убачыць? Чаму?

**Старажытнаегіпецкія храмы.** У старажытнасці егіпцяне ўзводзілі мноства разнастайных *храмаў*. Яны прысвячаліся багам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Памінальны храм Хатшэпсу́т (XV ст. да н. э.)

Сваёй урачыстасцю здзіўляюць *скальныя храмы* — свяцілішчы, высечаныя ў скальным масіве. У іх здзяйсняліся службы ў гонар памерлых і абагаўлёных фараонаў, а таксама старажытнаегіпецкіх багоў.

Кідаецца сэрца маё туды і назад, думаючы, што ж скажуць людзі, тыя, што ўбачаць помнікі мной створаныя, праз гады і будуць гаварыць пра тое, што я здзейсніла. Не кажыце: «Мы не ведаем, мы не ведаем, як пабудавалі гэта? Як гару золата стварылі, нібы было тое справай звычайнай?»

*Надпіс на абеліску Хатшэпсут*

Шмат стагоддзяў таму быў высечаны ўнікальны памінальны *храм царыцы Хатшэпсут*, жанчыны-фараона. Па сваёй форме, памерах і ўпрыгажэннях пахаванне перасягнула падобныя старажытнаегіпецкія збудаванні. Храм складаецца з трох манументальных тэрас, размешчаных адна над другой і злучаных велічэзнымі па́ндусамі. Пахавальны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўны ўваход у храм Рамсэса II у Абу-Сімбеле (II тыс. да н. э.)



комплекс выбудаваны ў падножжа скал, якія служаць ашаламляльным фонам для ўсяго архітэктурнага збудавання і ўтвараюць з ім гарманічнае цэлае.

Такімі ж велічнымі выглядаюць і скальныя храмы ў Абу́-Сімбе́ле. Вялікі храм быў створаны ў гонар фараона Рамсэса II, а малы — у гонар яго жонкі Неферта́ры. Ля ўвахода ў вялікі храм высяцца чатыры сядзячыя 20-метровыя статуі ў абліччы фараона — *кало́сы*. Галава кожнай гіганцкай скульптуры дасягае 4 метраў!

Храм з'яўляецца ўзорам не толькі старажытнаегіпецкага дойлідства, але і навуковай думкі. Дзякуючы неверагодна дакладным вылічэнням астролагаў усяго двойчы на год прамяні ўзыходзячага сонца дасягаюць статуй у паўзмрочных храмавых памяшканнях. Некалькі хвілін яны асвятляюць твары каменных багоў, але даўжэй за ўсё затрымліваюцца на твары фараона Рамсэса II.



Храм Амо́на-Ра ў Лу́ксары (II тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Грандыёзныя храмавыя комплексы былі пабудаваны егіпецкімі дойлідамі ў *Луксары* і *Карнáку*. Злучаныя паміж сабой доўгай алеяй сфінксаў-двайнят, яны ўтвараюць выдатны архітэктурны ансамбль, які ўключае шматкалонныя залы, свяцілішчы, унутраныя двары. Ля ўвахода ў храм стаялі абеліскі — гранёныя слупы, якія звужаюцца ўгору. Іх верхавіны пакрывалі золатам, каб яны ззялі на сонцы. Так егіпцяне ўвасаблялі ў архітэктуры ідэю сонечнага праменя.

Выразныя формы, выпрацаваныя старажытнаегіпецкімі архітэктарамі, — піраміда, абеліск — выкарыстоўваюцца ў мастацтве і цяпер. У канцы XX стагоддзя ў выглядзе піраміды быў перабудаваны ўваход у музей Луўра ў Парыжы. А колькі абеліскаў упрыгожвае плошчы самых розных гарадоў свету! У Егіпце яны адлюстроўваюць ідэю ўслаўлення жыцця, яго перамогі над смерцю, а таксама веру ў тое, што мастацтва вечнае.



Абеліск Перамогі
ў Мінску, Беларусь
(1954 г.)

Разгледзьце старажытнаегіпецкія храмы. Якое ўражанне на вас зрабілі маштабы гэтых архітэктурных збудаванняў? Падрыхтуйце пра гэта вуснае паведамленне (5—7 сказаў).

Мастацтва старажытных егіпцян было цесна звязана з рэлігіяй. Галоўнымі тыпамі архітэктурных пабудоў у Старажытным Егіпце з'яўляліся грабніцы і храмы. Іх узводзілі на стагоддзі. Сваімі манументальнымі формамі яны ўвасаблялі надзею чалавека на вечнае жыццё.

### Пытанні і заданні

1. Вялікія піраміды ў Гізе — не толькі выбітнае дасягненне старажытнаегіпецкай цывілізацыі, але і спадчына ўсяго чалавецтва. Як вы думаеце, чаму іх называюць цудам свету?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. На якія асаблівасці старажытнаегіпецкіх грабніц звяртае ўвагу вядомая арабская прыказка: «Усё на свеце баіцца часу, а час баіцца пірамід»?

3. Успомніце, дзе вам сустракаліся збудаванні ў форме абеліска ці піраміды. Раскажыце пра іх. Прапануйце свае варыянты выкарыстання формаў старажытнаегіпецкай архітэктуры ў сучаснай культуры.

### Творчая майстэрня

4. Да егіпецкай тэматыкі мастакі звярталіся ва ўсе часы. У пачатку XX стагоддзя ў Санкт-Пецярбургу быў пабудаваны дом, які ў народзе называюць Егіпецкім. У яго дэкоры выкарыстаны калоны з аблічцам старажытнаегіпецкай багіні. Абапал параднага ўвахода ўстаноўлены статуі егіпцян. Балконы і сцены будынка ўпрыгожаны рэльефамі са старажытнаегіпецкімі матывамі. Крылатыя сонечныя дыскі, кветкі папіруса, галовы фараонаў, сфінксы, кобры... Як вы думаеце, чаму традыцыі старажытнаегіпецкага мастацтва вабяць мастакоў наступных пакаленняў? Прыдумайце свой варыянт выкарыстання старажытнаегіпецкіх матываў у сучаснай архітэктуры. Прадстаўце яго ў даступнай форме (эскізны малюнак, апавяданне і інш.).



**Міхал Сангáйла.** Даходны дом Няжы́нскай (Егіпецкі дом) (1911—1913 гг.)

## § 7. Сюжэты і вобразы ў выяўленчым мастацтве Старажытнага Егіпта

Егіпцяне верылі, што выявы чалавека і навакольнага свету ажывуць у замагільным свеце. Таму ўсё, што хацелася перанесці ў вечнае жыццё, адлюстроўвалі на сценах грабніц з дэталёвай прарысоўкай і захоўвалі ў скульптурных вобразах. Лічылася, што менавіта мастацтва дорыць чалавеку магчымасць вечна жыць у замагільным царстве, а мастак, ствараючы творы, займаецца свяшчэннадзействам.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Канон у старажытнаегіпецкім мастацтве.** Егіпцяне своеасабліва паказвалі чалавека. Не такім, якім яго бачылі ў жыцці, а так, як было патрэбна паводле кано́на. Фігуру чалавека імкнуліся адлюстраваць цалкам: ад пятак да макушкі. Бо ў вечным жыцці ўсё ўвасобіцца менавіта так, як паказана. Чалавек, адлюстраваны ў профіль, адродзіцца з адным плячом і адной рукой, а адлюстраваны па пояс — без ног! Таму чалавечую фігуру паказвалі так, каб кожная частка цела была бачная цалкам: галаву і ногі — у профіль, тулава — анфас.



Дойлід Хесі́ра. Рэльеф (III тыс. да н. э.)

Фараона заўсёды паказвалі пэўным чынам — вышэйшым за ўсіх ростам і не як простага смяротнага, а як сына бога: моцным і прыгожым. Так падкрэсліваліся яго значнасць і статус. Багоў звычайна ўяўлялі «жывёлагаловымі»: з тулавам чалавека і галавой жывёлы.

Разгледзьце выявы чалавека ў параграфе і на кампакт-дыску. Растлумачце, як у іх выяўляўся старажытнаегіпецкі канон.

**Сюжэты і вобразы ў жывапісе.** Роспісы і рэльефы падрабязна расказваюць нам пра паўсядзённае жыццё, адпачынак і рэлігійныя абрады старажытных егіпцян.

Адзін з распаўсюджаных сюжэтаў у старажытнаегіпецкім мастацтве — фараон на паляванні, які трапляе дзідай ці стралой з лука ў дзікіх звяроў. Часта малявалі і весляра, які плыве ў ладдзі сярод зараснікаў лотаса. Менавіта такія вобразы мы бачым на фрэсцы з грабніцы фараона Небамона.

Майстар не проста намаляваў працэс палявання, а паказаў чалавека ў дзівосна багатым прыродным асяроддзі. Тут і лотасы, і птушкі, і рыбы… З’яўленне паляўнічага ў суправаджэнні жонкі і дачкі прывяло ў рух увесь птушыны свет.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Кармленне антылоп. Роспіс з грабніцы фараона Хнумхатэ́па II (II тыс. да н. э.)

Паляванне ў нільскіх зарасніках. Роспіс з грабніцы фараона Небамона (XIV ст. да н. э.)

Мастакі часта адлюстроўвалі простых людзей, якія працуюць на палях, у рамесных майстэрнях, у гаспадарскіх дамах. Кананічная статычнасць пастаў у іх малюнках не была абавязковай. Галоўнае — перадаць у рухах фігур найбольш характэрныя рысы той ці іншай працоўнай дзейнасці.



Статуя вяльможы Ранафе́ра (III тыс. да н. э.)

Назавіце асноўныя тэмы і сюжэты жывапісу Старажытнага Егіпта. Ахарактарызуйце жывапісныя кампазіцыі.

**Скульптурны партрэт.** Пры стварэнні скульптур мастакі таксама прытрымліваліся канона. Для адлюстравання чалавека егіпцяне спецыяльна выбіралі паставы, якія не прадугледжвалі руху. Звычайна гэта сядзячая ці стаячая фігура з высунутай наперад левай нагой («якая ступае ў вечнасць»), з абсалютна


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Статуя пісца Каі
(III тыс. да н. э.)

прамой паставай і амаль поўнай сіметрыяй цела.

Партрэтная статуя памерлага знаходзілася ў кожным магільным склепе. Прычым аблічча чалавека ўзнаўлялася з максімальна магчымым падабенствам. Яркі прыклад таго — статуя пісца Ка́і. Скульптар праўдзіва перадаў пачцівастрыманы і крайне засяроджаны вобраз пісца, які сядзіць са скрыжаванымі нагамі і трымае перад сабой разгорнуты скрутак папірусу. На яго твары непарушны спакой.

Растлумачце, як старажытнаегіпецкі канон перадаецца ў скульптурных выявах.

**Мастацкі канон у эпоху фараона Эхнатона.** Каноны ў старажытнаегіпецкім мастацтве існавалі тысячагоддзямі ў нязменным выглядзе. Але ў перыяд праўлення фараона Аменхатэ́па IV (Эхнатона) строгія правілы аказаліся парушанымі. Фараон стаў патрабаваць ад мастакоў больш праўдзівай выявы яго самога і эпізодаў з жыцця царскай сям'і. У творах з'явілася больш душэўнай адкрытасці вобразаў.



Эхнатон з сям'ёй. Рэльеф
(XIV ст. да н. э.)

У гэтым сэнсе асабліва цудоўныя сцэны, якія паказваюць Эхнатона ў сям'і — як ласкавага мужа і бацькі. На адным з рэльефаў асенены промнямі Атона ўладар Егіпта люляе і цалуе сваю дачку. Ніколі больш егіпецкія фараоны не адважваліся так адкрыта дэманстраваць у творах мастацтва свае таемныя пачуцці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адным з шэдэўраў старажытнаегіпецкага мастацтва з'яўляецца бюст царыцы Неферціці — жонкі Эхнатона. Прыгажосць гэтай жанчыны ўвекавечыў майстар Тутмес. Ідэальныя рысы яе твару ён удала дапоўніў высокай каронай і масіўнымі каралямі, якія былі ярка распісаны. Такое шматколернае абрамленне падкрэсліла жаноцкасць і грацыёзнасць царыцы. Строгая веліч аблічча Неферціці змякчыла ледзь прыкметная ўсмешка, якая кранула куткі выдатна акрэсленых вуснаў. А погляд з-пад паўапушчаных павек дадаў вобразу таямнічую недаказанасць.



**Тутмес.** Бюст царыцы Неферціці (XIV ст. да н. э.)

Пасля смерці Эхнатона ў мастацтве зноў стаў панаваць традыцыйны мастацкі канон.

Бюст царыцы Неферціці — адзін з самых выбітных партрэтаў у сусветным мастацтве. Ён і сёння ўспрымаецца як эталон жаночай прыгажосці. Як вы думаеце чаму?

Старажытныя егіпцяне верылі, што мастацтва можа падарыць неўміручасць. Толькі для гэтага ўсе выявы трэба было ствараць так, як прадпісваў старажытны канон. У перыяд праўлення фараона Эхнатона мастацтва стала развівацца больш свабодна, але канон усё ж не быў адменены цалкам. Традыцыі і вераванні заўсёды адыгрывалі вызначальную ролю ў культуры Старажытнага Егіпта.

### Пытанні і заданні

Разгледзьце творы старажытнаегіпецкага выяўленчага мастацтва. Растлумачце, як у іх перадаюцца асаблівасці мастацкага канона. Падбярыце ў інфармацыйных крыніцах творы мастацтва Старажытнага Егіпта, створаныя паводле канона. Растлумачце свой выбар.

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах творы выяўленчага мастацтва сучасных аўтараў, у якіх выконваецца мастацкі канон Старажытнага Егіпта. Аргументуйце свой выбар.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Ганна Інькова, Тамара Стасевіч.** Беларуская Неферціці (фрагмент) (пачатак XXI ст.)

### Творчая майстэрня

1. Сучасныя беларускія мастакі — скульптар Ганна Інькова і графік Тамара Стасе́віч стварылі ўнікальны праект «Беларуская Неферціці». Аўтары звярнулі ўвагу на падабенства велічных галаўных убораў старажытных егіпцян з «на́міткай» — беларускім галаўным уборам. Упрыгожана скульптура арнаментам. Складзіце невялікае апавяданне пра беларускую Неферціці, адказаўшы на пытанне: чаму скульптура беларускіх аўтараў атрымала такую назву?

2. Выканайце сілуэтны малюнак чалавека, прытрымліваючыся традыцый старажытнаегіпецкага канона.

## § 8. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Егіпта

Старажытныя егіпцяне былі выдатнымі майстрамі. Яны ведалі сакрэты апрацоўкі розных матэрыялаў: каменю і гліны, дрэва і металу. Ствараючы прадметы хатняга ўжытку і асабістыя рэчы, егіпцяне ўпрыгожвалі іх з вялікім майстэрствам.

**Старажытнаегіпецкі посуд.** Старажытнаегіпецкі посуд — адзін з найстаражытнейшых твораў прыкладнога мастацтва. Кожнаму *керамічнаму вырабу* (чыгуну ці місцы) надавалі зручную форму. Паверхню посуду паліравалі, а затым зверху наносілі роспіс. Гэта маглі быць простыя палоскі і кругі, а часам цэлыя сюжэтныя карціны! Напрыклад, лодкі, якія плывуць са збудаванымі на іх хацінамі.

Пазней дэкаратыўныя пасудзіны сталі вырабляць у форме жывёл. Напрыклад, пляшка ў форме ляжачай казы з казлянём. Усе дэталі і сілуэты бліскучай чырванаватай пасудзіны падкрэслены чорнымі лініямі.

З каменю егіпцяне выраблялі гарлачы і кубкі для свят і рытуалаў. Гэтыя вырабы вельмі прыгожыя дзякуючы дзівоснаму колеру і малюнку пражылак. З дапамогай вострага металічнага разца майстры часта надавалі пасудзінам форму жывёл і птушак, не забываючы пры гэтым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне


Керамічная пляшка ў форме казы (XVI ст. да н. э.)


Пасудзіна ў выглядзе качкі, камень (II тыс. да н. э.)


Гіпапатам, фаянс (II тыс. да н. э.)

пра прыгажосць і зручнасць. Адзін з такіх гарлачоў у выглядзе качкі лёгка трымаць у руцэ дзякуючы ручцы, зробленай у форме выгнутай шыі птушкі.

Разгледзьце арнаменты на старажытнаегіпецкім посудзе, выявы якога прадстаўлены ў параграфе і на кампакт-дыску. Апішыце, якія фігуры і прадметы сустракаюцца ў арнаментах.

**Новыя тэхналогіі.** Важныя вынаходствы егіпецкіх майстроў — фаянс і шкло. *Фаянс* атрымліваюць пры абпале сумесі гліны, пяску, вапны і інш. Вырабы з фаянсу пакрыты бліскучай паліваю і нагадваюць камяні-самацветы. З гэтага матэрыялу ў Старажытным Егіпце рабілі пацеркі, падвескі, невялікія статуэткі, часам посуд. *Егіпецкае шкло* не было празрыстым і хутчэй нагадвала сучасны каляровы пластык. Шкляныя вырабы выраблялі зусім маленькімі, як, напрыклад, пасудзіны з вузкім рыльцам — флаконы для духоў і касметычных мазяў. Таксама са шкла рабілі пацеркі, якія выкарыстоўвалі для вырабу знакамітых егіпецкіх упрыгажэнняў.


Шкляная пасудзіна (II тыс. да н. э.)

Што ў старажытнаегіпецкім посудзе са шкла і фаянсу, на ваш погляд, вабіць сучаснага гледача?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Каралі-каўнер (XIV ст. да н. э.)



Крылаты скарабей. Пектара́ль (XIV ст. да н. э.)



Сандалі Тутанхамона (XIV ст. да н. э.)

**Ювелірныя ўпрыгажэнні.** Ювелірныя ўпрыгажэнні Старажытнага Егіпта ўражваюць майстэрствам і вытанчанасцю выканання. Упрыгажэнні ў Егіпце насілі ўсе — незалежна ад полу, становішча ў грамадстве ці ўзросту.

Галоўным упрыгажэннем былі каралі-каўнер, якія закрывалі плечы і верхнюю частку грудзей. Каўняры рабілі з сеткі буйной вязкі ці з распісанага палатна. На іх радамі нашывалі каралі і рознакаляровыя сімвалічныя фігуркі.

Большасць іншых упрыгажэнняў (бранзалеты, завушніцы) была выраблена з золата з выкарыстаннем рознакаляровых каштоўных камянёў і яркіх эмаляў.

Часта каштоўнасці выкарыстоўваліся ў якасці амулетаў — абярэгаў. Егіпцяне лічылі, што амулеты абароняць іх уладальнікаў ад злых сіл і прынясуць поспех. Магчыма, менавіта таму такія ўпрыгажэнні стваралі ў форме свяшчэнных жывёл: сокала, грыфа, кобры, жукаскарабея. У якасці магічных прадметаў выкарыстоўваліся і рэлігійныя сімвалы, напрыклад вока Гора.

Не могуць не выклікаць захаплення галаўны ўбор егіпецкага фараона з малюнкам свяшчэннай кобры над ілбом, залаты каўнер і сандалі, на падэшвах якіх намаляваны бытавыя ці ваенныя сцэны.

Як вы думаеце, як знешні выгляд сандаляў фараона Тутанхамона звязаны з кліматам Егіпта?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Прадметы побыту.** У побыце егіпцяне выкарыстоўвалі мноства дзіўных па прыгажосці прадметаў. *З дрэва* егіпецкія майстры выразалі футаралы і шкатулкі. У Егіпце мала лясоў, і драўніна тут заўсёды была дарагім матэрыялам. Таму вырабы невялікія па памерах, але вельмі вытанчаныя. Шкатулкі пакрыты рэльефамі і роспісамі з мудрагелістымі арнаментамі і выявамі. Так, напрыклад, на адной са сценак куфра, знойдзенага ў грабніцы Тутанхамона, фараон паказаны на баявой калясніцы на чале свайго войска, якое паражае ворагаў.



Куфар з грабніцы Тутанхамона (XIV ст. да н. э.)

Сваёй раскошай і пышнасцю ўбранства здзіўляе вызалачаны трон Тутанхамона. На спінцы трона паказаны фараон і яго любячая жонка. На троне можна ўбачыць выявы жывёл, кветкі, свяшчэнныя сімвалы. Усё ўбранства трона павінна было сімвалізаваць магутнасць фараона.

**Цікавы факт**

У грабніцы Тутанхамона былі знойдзены самыя неверагодныя рэчы. Напрыклад, часткі разабранага карабля і яго мадэль.

Разгледзьце трон фараона на кампакт-дыску. Падумайце, з якой мэтай майстры Старажытнага Егіпта ўпрыгожвалі прадметы побыту.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў Старажытным Егіпце квітнела. Менавіта тут вынайдзены важныя тэхналогіі, прыдумана мноства рэчаў, якія сталі незаменнымі для чалавека ў паўсядзённым жыцці. Выдатныя майстры ўмелі выбраць і апрацаваць патрэбны матэрыял, выявіць яго прыгажосць, зрабіць рэч не толькі зручнай, але і вытанчанай. Цяпер гэтыя шэдэўры вядомыя ва ўсім свеце.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

Разгледзьце ўсе творы мастацтва Старажытнага Егіпта, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Які эмацыйны водгук выклікаюць у вас шэдэўры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва? Якія сюжэты і формы пераважалі ў старажытнаегіпецкіх творах мастацтва?

1. Пералічыце матэрыялы, з якіх егіпцяне стваралі посуд, упрыгажэнні і прадметы побыту.

### Творчая майстэрня

Прачытайце дадатковую старонку на кампакт-дыску. Выканайце эскіз твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (посуду, мэблі) у егіпецкай стылістыцы. Падумайце, якую форму вы выберыце для ўвасаблення вырабу.

## § 9. Загадкі Старажытнага Егіпта: літаратура і музыка

Старажытнаегіпецкая літаратура — адна з найстаражытнейшых на зямлі. Многія навукоўцы лічаць яе першай літаратурай у сусветнай культуры.

**Вытокі літаратуры.** З'яўленне літаратуры звязваюць з вераваннямі старажытных егіпцян. З аднаго боку, з вераваннямі ў шматлікіх міфалагічных персанажаў, з другога — у царскіх асоб (фараонаў). Гэтыя вераванні і вызначылі тэмы, сюжэты і вобразы старажытнаегіпецкай літаратуры.

**Уяўленні старажытных егіпцян пра светабудову**

**Першы цыкл міфаў – пра бога Ра**

Бог Ра — бог сонца. У многіх міфах ён выступае вярхоўным богам, стваральнікам свету і людзей. Штораніцы Ра плыве па небе ў залатой лодцы і назірае за тым, што адбываецца на зямлі. Ён усё бачыць і ўсё ведае... Увечары ўжо ў іншай лодцы ён плыве па падземнай рацэ, пераадольваючы небяспекі. А раніцай ізноў з'яўляецца на небасхіле, быццам дазваляючы свету развівацца. З бога Ра пачынаецца свет — змена пор года, дня і ночы. Бог Ра вянчае сабой светабудову егіпцян.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Другі цыкл міфаў — пра бога Асірыса**

Зямлю ўвасабляе бог Асірыс. Загубіў яго брат Сэт — бажаство гарачай пустыні. Выратавала Асірыса яго няўцешная жонка Ісіда. Пасля ўваскрашэння бог Асірыс стаў уладаром і суддзёй у царстве мёртвых.

Бога Асірыса малявалі як чалавека з зялёным тварам. Як і ўвесь раслінны свет, ён штогод памірае і адраджаецца.

**Трэці цыкл міфаў — пра падземнае царства**

Чалавек у падземным царстве трапляе на суд бога Асірыса, дзе паведамляе пра тое, як ён жыў. Затым на адмысловых шалях узважваецца сэрца памерлага, якое сімвалізуе яго сумленне. На адной чашы — сэрца, на другой — праўда. Калі сэрца чалавека пераважыць праўду, значыць ён вёў несправядлівае жыццё. І суд Асірыса выносіў свой вердыкт.



«Суд Асірыса» з «Кнігі мёртвых» (IV—I стст. да н. э.)

Міфалогія была надзвычай важная для егіпцян. Мастацкі выклад міфаў заняў значнае месца ў літаратуры. Асабліва папулярнасцю карысталіся пераказы міфаў пра стварэнне ўсяго жывога на Зямлі, пра вечнае жыццё.

Пра тое, як егіпцяне шанавалі сваіх багоў і фараонаў, як вучыліся ў іх мудрасці і сіле, нам вядома са старажытнаегіпецкіх *гімнаў* і *павучанняў*, якія захаваліся.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прачытайце гімн Асірысу ўслых. Паспрабуйце зрабіць гэта як мага выразней. Якое ўражанне зрабіў на вас гэты твор? Якія паэты наступных стагоддзяў стваралі творы ў гэтым жанры?

...Северным свежим ветром вечером веешь ты,
возобновляя в сердце молодости цветенье.
Волей своей растенья ты устремляешь ввысь.
И в благодарность поле пищу рождает смертным.
Звёздами правишь в горних высях. Врата небес
перед тобой раскрыты, о властелин Осирис.
Дух твой благословляют южные небеса,
северные возносят благодаренье богу.
Вечноживые звёзды служат тебе, а те,
что не уходят с неба в темень, — твои престолы...

*Гимн Осирису из «Книги мёртвых»*

**Старажытнаегіпецкія апавяданні і казкі.** Папулярнымі жанрамі старажытнаегіпецкай літаратуры былі *апавяданні* і *казкі*.

«Апавяданне Сінухё» — самы старажытны з твораў, якія захаваліся. У ім расказваецца пра прыгоды вяльможы Сінухё, які з'ехаў

...Итак, отправляйся в Египет! Узришь ты подворье, в котором вырос, облобызаешь землю у Великих Врат и соединишься с царскими друзьями.

*«Рассказ Синухё» (перевод О. Томашевич)*

...Тогда спустился я к берегу, туда, где стояло судно, и окликнул людей, которые были на нём. И воздал я хвалу владыке этого острова, и моряки на судне также. И двинулись мы на север...

*«Сказка о потерпевшем кораблекрушение» (перевод О. Томашевич)*



Карабель пад ветразямі. Роспіс на грабніцы Каеманха ў Гізе (III тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з Егіпта і здзейсніў мноства подзвігаў. Але, тужачы па радзіме, ён шукае магчымасць вярнуцца. Гэта апавяданне пра тое, што чалавек заўсёды імкнецца вярнуцца ў сваю краіну, да сваіх звычаяў і гісторыі.

Найбольш вядомы прыклад старажытнаегіпецкай казкі — «Казка пра пацярпелага караблекрушэнне». Мараплавец распавядае пра крушэнне карабля, сваё выратаванне, жыццё на незаселеным востраве і шчаслівае вяртанне на радзіму.

Сюжэт «Казкі пра пацярпелага караблекрушэнне» лёг у аснову многіх казак свету. Некаторыя з іх, напрыклад казкі пра Сіндбада-марахода, вам вядомыя. Што агульнага вы бачыце ў абодвух сюжэтах?

**Старажытнаегіпецкая пісьменнасць.** Зараджэнне старажытнаегіпецкай пісьменнасці звязана са з'яўленнем малюнкавага пісьма — піктагра́фіі. У кожнага слова было сваё абазначэнне — малюнак. Да нас дайшоў добра захаваны ўзор такога пісьма — па́летка Нармé-ра. Гэта пласціна, якая выкарыстоўвалася для расцірання фарбаў. Лічыцца, што выявы на палетцы — адзін з ранніх узораў старажытнаегіпецкай пісьменнасці.

Паступова замест малюнкаў сталі з'яўляцца знакі-сімвалы. Напрыклад, выява дзвюх ідучых ног азначала «ісці». Так з'явіліся іеро́гліфы, якія лічыліся свяшчэннымі. Іерогліфаў было шмат — амаль 800, запамінаць іх было няпроста, таму пісцы лічыліся прывілеяванай часткай грамадства.


Палетка Нармера (IV тыс. да н. э.)


Пісьмовыя прылады егіпцян (II тыс. да н. э.)


Пісцы з прыладамі для пісьма. Рэльеф (II тыс. да н. э.)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спачатку егіпцяне пісалі на розных матэрыялах: дрэве, камені, гліняных чарапках. Пазней — на папі́русе. Для вырабу папірусу разрэзаныя сцёблы раслін асаблівым чынам збіралі, прасавалі, сушылі і скручвалі ў скруткі. Затым спецыяльная трысняговай палачкай на папірус наносілі малюнак. У сухім клімаце такія скруткі захоўваліся тысячагоддзямі. Гэта і дазволіла сучасным навукоўцам вывучыць старажытныя тэксты, у тым ліку і літаратурныя.

**Цікавы факт**

У Старажытным Егіпце становішча пісьменнага чалавека было настолькі высокім, што спачатку ў вобразе пісца паказвалі толькі сыноў фараона.

Егіпцяне вельмі паважалі сваё ўменне запісваць знакамі гукі маўлення. Яны называлі пісьмо «словы бога». Растлумачце, як вы разумееце гэты вобразны выраз.

**Музыка Старажытнага Егіпта.** Жыхары Старажытнага Егіпта любілі музыку. Мы даведваемся пра гэта з малюнкаў музыкаў і музычных інструментаў. А дзякуючы археалагічным раскопкам мы можам паглядзець на інструменты і, магчыма, зразумець характар музыкі.

Егіпет быў краінай, дзе з'явіліся першыя прафесійныя музыкі. Яны служылі пры палацах фараонаў, жрацоў, знатных людзей, якія трымалі свайго роду капэлы, аркестры. Гэта відаць па малюнках вялікіх груп музыкаў, што граюць перад вяльможамі. Музыка суправаджала і культавыя абрады. Па знойдзеных у грабніцах роспісах бачна, што ігра на музычных інструментах уваходзіла таксама ў абавязкі жрацоў.



Дзяўчыны-музыкі. Дэталь роспісу грабніцы Рэхмі́ра (XV ст. да н. э.)

Па малюнках можна прасачыць, як змяняўся знешні выгляд асобных музычных інструментаў. Напрыклад, па фрэсках, знойдзеных у розныя перыяды, відаць, як арфа з немудрагелістага лука ператваралася ў даволі дасканалы музычны інструмент. Пасля арфа, флейта і лютня сталі найбольш распаўсюджанымі інструментамі ў Старажытным Егіпце.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сучасныя даследчыкі старажытнаегіпецкага мастацтва пісалі пра гісторыю арфы: «З усіх струнных інструментаў няма ніводнага, знешні выгляд якога быў бы вядомы лепш, а гісторыя ўзнікнення — горш». Як вы думаеце, што навукоўцы маюць на ўвазе?

У Егіпце ўзнікла багатая і разнастайная старажытная пісьмовая культура. Да многіх літаратурных твораў егіпцян і сёння не згасае цікавасць. Дзякуючы багаццю вобразаў, маляўнічасці мовы літаратура Старажытнага Егіпта дае нам магчымасць адкрыць для сябе таямніцы міфалагічных уяўленняў егіпцян, дапамагае даведацца пра культуру гэтай дзіўнай цывілізацыі.

## Пытанні і заданні

Прачытайце на дадатковай старонцы «Казку пра Праўду і Няпраўду». Перакажыце яе сюжэт. Якія казкі народаў свету з падобным сюжэтам вы ведаеце?

Адным з самых вядомых старажытнаегіпецкіх музычных інструметаў быў сістр. З дапамогай даведачнай літаратуры падрыхтуйце невялікае паведамленне (як выглядаў інструмент, дзе выкарыстоўваўся, якое значэнне мае ў сучаснай музычнай культуры).

1. Раздзел, прысвечаны старажытнаегіпецкаму мастацтву, называецца «Мастацтва, якое застыла на тысячагоддзі». Якія асаблівасці мастацтва Старажытнага Егіпта адлюстраваны ў гэтай назве?

## Творчая майстэрня

2. Прафесія пісца ў Старажытным Егіпце была адной з самых прывілеяваных. Як вы думаеце чаму?

...Они не строили себе пирамид из меди
И надгробий из бронзы.
Не оставили после себя наследников,
Детей, сохранивших их имена.
Но они оставили своё наследство в писаниях,
В поучениях, сделанных ими.

*«Прославление писцов» (перевод А. Ахматовой)*

3. Прыдумайце і намалюйце два-тры іерогліфы, якія абазначаюць выбраныя вамі прадметы ці з'явы. Раскажыце, што падчас працы было для вас асабліва цяжкім.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 3

# Мастацтва скрозь тысячы гадоў: Старажытны Усход

Вавілон быў не толькі вельмі вялікім горадам, але і самым прыгожым з усіх гарадоў, якія я ведаю... З усіх краін на свеце... гэта зямля вырабляе, безумоўна, самыя лепшыя плады.

*Герадот*



Крылаты бык. Кафельны рэльеф з палаца Артаксе́ркса II у Су́зах, Іран (1-я пал. IV ст. да н. э.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. Старажытныя шумеры: цывілізацыя гліны

Шумерская культура — адна з найстаражытнейшых у свеце. Землі, на якіх яна развівалася, называюць Міжрэччам, ці, па-грэчаску, Месапатаміяй. У шумераў намнога раней, чым у егіпцян, з'явіліся гарады. Тут была вынайдзена зусім іншая сістэма пісьменнасці, узводзіліся грандыёзныя архітэктурныя збудаванні, квітнела мастацтва.

**Шумерская архітэктура.** Месапатамія — край узгорыстых раўнін. Тут рэдка сустракаецца мяккі і падуладны апрацоўцы камень, а лясоў амаль няма. Асноўным матэрыялам для будаўніцтва ў шумераў была гліна. З яе фармавалі цэглу, якую не абпальвалі, а проста высушвалі на сонцы. З такой цэглы-сырца старажытныя жыхары ўзводзілі велічныя палацы для сваіх правіцелей і храмы.



Зікурат ва У́ры. Сучасная рэканструкцыя

Самыя важныя збудаванні — храмы — атрымалі назву зікура́ты. З-за вільготнага клімату і пастаяннай пагрозы затапленняў іх узводзілі на высокіх ступеністых платформах. Ад фундамента зікурата да яго вяршыні вялі пандусы. Прыродныя ўмовы сталі прычынай з'яўлення незвычайных архітэктурных формаў.

Адзін з найстаражытнейшых зікуратаў быў пабудаваны ў горадзе Уры. Велізарнае трохступеньчатае збудаванне было абліцавана каменнымі плітамі. Ніжняя прыступка была пафарбавана ў чорны, сярэдняя — у чырвоны, а верхняя — у белы колер.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Збудаванне было настолькі высокім, што здавалася, быццам яго вяршыня раствараецца ў нябёсах. Калі свяшчэнная працэсія паднімалася да храма ўсхваляць багоў, людзі ля падножжа зікурата думалі, што жрацы накіроўваюцца ў божы прыстанак. Магчыма, таму пра зікураты гаварылі, што яны злучаюць зямлю з небам.

Зікурат у горадзе Уры часта называюць «гарой Бога». Як вы думаеце чаму?

**Выяўленчае мастацтва.** Малюнкі, створаныя шумерскімі мастакамі, былі яснымі і нагляднымі. Нават цяпер, праз тысячагоддзі, мы лёгка разумеем «гісторыі ў малюнках», якія хацелі расказаць майстры.

Унікальны твор мастацтва шумераў — штандар вайны і міру. Гэта дзве парныя таблічкі з сюжэтамі паўсядзённага жыцця цара і яго ваенных паходаў. І сёння застаецца загадкай, для чаго служыў штандар. Магчыма, яго выносілі на поле бітвы як сцяг ці выкарыстоўвалі для ўпрыгожання ў царскім палацы. Малюнкі на штандары, як і на каменных рэльефах, размяшчаліся шэрагамі, як радкі ў кнізе. Твор адрозніваецца вельмі тонкай работай. Фігуркі выкананы, як у мазаіцы, з матэрыялаў рознага колеру: светлых кавалачкаў ракавін і чырвона-



Таблічка «Мір» са штандара вайны і міру (III—II тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

га каменю. Нябесна-сіні фон выкладзены пласцінкамі мінералу лазурыту.

Вялікую ролю ў выяўленчым мастацтве шумераў адыгрывала скульптура. Яна прадстаўлена статуямі багоў, правіцеляў, а таксама статуэткамі людзей, якія моляцца. Іх ставілі ў храмах: лічылася, што фігурка, якая паказвае чалавека ў малітоўнай позе, можа залагодзіць бажаство. Гэтыя статуэткі часта паказвалі чалавека абагульнена, умоўна. Вялікія вушы, каб уважліва слухаць бога, і велізарныя вочы, каб пільна ўзірацца ў нябачныя таямніцы. Мастакоў не цікавілі асаблівасці знешнасці канкрэтных людзей. Пра тое, хто ж намаляваны, можна было даведацца з надпісу на спіне ці на пастаменце.



Эбіх-Іль, вяльможа з Мары́ (III тыс. да н. э.)

Успомніце, што такое штандар. Разгледзьце статуэткі. Чым адрозніваюцца выявы людзей у шумерскіх майстроў ад вобраза чалавека, створанага егіпецкімі мастакамі?

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Высокага майстэрства дасягнулі шумерскія ювеліры. Яны ўмелі ствараць з золата дэкаратыўныя вянкі, бранзалеты, кольцы. Акрамя золата, любімымі матэрыяламі былі камяні-самацветы: сіні лазурыт і чырвоны сердалік. Вырабы асабліва тонкай, віртуознай работы выконваліся для цара і яго сям'і. Некаторыя такія ўпрыгажэнні археалагам удалося знайсці падчас раскопак царскіх грабніц у горадзе Уры.

Там знайшлі і драўляную арфу, упрыгожаную выявай галавы быка. Верагодна, у шумераў арфа была адным з любімых музычных інструментаў. Цікава, што адзіны музыка,

**Цікавы факт**

На таблічцы «Мір» паказана, які багаты цар: яго слугі нясуць каштоўныя грузы, а пастухі вядуць статкі коз і баранаў. У верхняй частцы гэтай таблічкі мы бачым сцэну піра: цар і знатныя вяльможы сядзяць на прыгожых крэслах, слугі падносяць ім напоі, а побач музыка грае на арфе.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

намаляваны на штандары вайны і міру, — гэта менавіта арфіст.



Элементы касцюма царыцы Пуа́бі (III тыс. да н. э.)

Упрыгажэнні — неад’емная частка вобраза чалавека. Якія элементы ўпрыгажэнняў шумераў выкарыстоўваюцца ў сучасным касцюме?

**Пісьменнасць і літаратура.** Важным укладам шумераў у культуру чалавецтва стала пісьменнасць. У Месапатаміі людзі прыдумалі своеасаблівую сістэму знакаў для перадачы інфармацыі, якую мы называем клі́напісам. З гліны рабілі плоскія цаглінкі-таблічкі, на якіх вострай палачкай выціскалі ўмоўныя знакі. Высушаная на сонцы ці абпаленая ў печы, такая таблічка вельмі даўгавечная. Яе можна захоўваць і перадаваць іншым людзям.



Музычны інструмент Пуабі (III тыс. да н. э.). Рэканструкцыя

Самыя першыя клінапісныя таблічкі мелі гаспадарчае прызначэнне: на іх вялі лік скаціне і іншай маёмасці. Але неўзабаве шумеры сталі запісваць на таблічках законы, паданні пра багоў і герояў, нават казкі і павучальныя вершы. А старажытны аўтар радкоў пра розныя прафесіі папярэджвае: кожны, хто дрэнна робіць сваю справу, апускаецца ў абшчыне майстроў на прыступку ніжэй.

Неумелому купцу приходится стать погонщиком ослов,
Неумелому певцу приходится дудеть в дудку,
Неумелому оружейнику приходится ковать серпы,
Неумелому строителю приходится быть подносчиком глины.

Дзякуючы таблічкам, якія захаваліся да нашых дзён, мы знаёмыя і з найстаражытнейшай на Зямлі паэмай. Гэта «*Эпас пра Гільгаме́ша*»,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гільгамеш змагаецца з быком. Адбітак з цыліндрычнай пячаткі (III тыс. да н. э.)



прысвечаны подзвігам і прыгодам легендарнага цара горада Урука. Гільгамеш здолеў перамагчы пасланых багамі пачвар, зрабіць цывілізаваным дзікага чалавека Энкіду́ і пасябраваць з ім. Страціўшы сябра, Гільгамеш (першым у сусветнай літаратуры!) задумваецца пра прыгажосць жыцця і непазбежнасць смерці. Ён адпраўляецца на пошукі неўміручасці, але даведваецца, што сапраўдная неўміручасць чалавека — у яго добрых справах.



Клінапісная таблічка шумерскага цара Зі́мры-Лі́ма (XVIII ст. да н. э.)

Нават пасля таго як краіну шумераў захапілі больш ваяўнічыя суседзі, Гільгамеш застаўся любімым героем народаў Месапатаміі.

Прачытайце на дадатковай старонцы на кампакт-дыску ўрывак з «Эпасу пра Гільгамеша». Якім гэты персанаж паказаны ў творы?

Шумерскую цывілізацыю вобразна называюць цывілізацыяй гліны. У Месапатаміі гэта быў галоўны будаўнічы матэрыял, а таксама аснова для пісьма. Збудаваныя з глінянай цэглы велізарныя зікураты, напісаная на гліняных дошчачках паэма «Эпас пра Гільгамеша» сталі значным укладам у скарбніцу сусветнай культуры.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце творы мастацтва шумераў. Якое ўражанне яны на вас зрабілі? У чым выявіліся своеасаблівасць і арыгінальнасць шумерскай архітэктуры, выяўленчага мастацтва, літаратуры?

2. Як прыродныя ўмовы паўплывалі на характар шумерскага мастацтва? Растлумачце гэта на адным з прыкладаў, прадстаўленых у параграфе.

3. Параўнайце аблічча старажытнаегіпецкіх пірамід і шумерскага зікурата. У чым іх падабенства? Якое прызначэнне абодвух архітэктурных збудаванняў?

### Творчая майстэрня

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах анімацыйны фільм-фантазію «Эпас пра Гільгамеша», створаны юнымі мастакамі-аніматарамі ў студыі анімацыйнага кіно Л. Лазаравай. Знайдзіце ў гэтым фільме памылку. Як вы думаеце, чаму гісторыя пра Гільгамеша цікавая сучасным людзям?

## § 11. Мастацтва Вавілона: «вароты бога»

Мастацтва Вавілона, якое прыйшло на змену шумерскаму, працягвала традыцыі сваіх папярэднікаў. Але вавіланяне не толькі запазычылі лепшыя дасягненні шумераў, але і творча пераасэнсавалі іх і дапоўнілі новымі вытанчанымі рысамі.



Стэла Хамурапі (XVIII ст. да н. э.)

**Стэлы як помнікі манументальнага мастацтва.** Для ўвекавечвання важных гістарычных падзей вавіланяне, як і шумеры, узводзілі сто́лы. Гэта былі вертыкальныя каменныя блокі, пакрытыя рэльефнымі выявамі і тэкстамі, як, напрыклад, «*Стэла цара Хамура́пі*». Клінапісам на ёй высечаны знакамітыя законы Хамурапі — адзін з першых збораў законаў у гісторыі чалавецтва! Увенчвае стэлу рэльеф з малюнкам цара, які атрымлівае ад сядзячага на троне бога знакі вышэйшай улады.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Стэлу цара Хамурапі навукоўцы лічаць сімвалам культуры Месапатаміі. Як вы думаеце чаму?

**Круглая скульптура.** Галоўнымі персанажамі ў круглай скульптуры вавіланян з'яўляліся цары і багі. Як і шумерскія майстры, скульптары Вавілона стваралі абагульненыя вобразы, якія часта не мелі нічога агульнага з адлюстраванымі персанажамі. Асноўнай характарыстыкай любога з іх была ідэя велічы, паказаная праз стан урачыстага спакою.

Скульптура багіні Іштáр паказвае заступніцу ўрадлівасці і кахання, надзеленую вышэйшай нябеснай уладай. Калонападобная фігура ў доўгім адзенні ўвенчана высокай каронай, што падкрэслівае значнасць вобраза. У строгіх і велічных рысах твару багіні Іштар з вялікімі ўсёвідушчымі вачамі адгадваюцца асаблівасці знешнасці жанчын Міжрэчча. Падчас храмавых цырымоній з пасудзіны ў руках багіні пралівалася вада, якую падавалі па трубе, пракладзенай у сцяне і ўнутры самой статуі.



Статуя багіні Іштар (XVIII ст. да н. э.)

Галава цара Хамурапі з'яўляецца ацалелай часткай статуі вавілонскага ўладара. Ён паказаны ў паўсферычнай залатой кароне, якую надзявалі падчас важных цырымоній. Твар Хамурапі вельмі выразны. Ён сведчыць пра мужнасць і рашучасць цара. Барада, завітая ў залатыя кольцы паводле моды тых часоў, падкрэслівае магутнасць старажытнага ўладара. Але ўсё ж у выразе твару адчуваюцца сум і некаторая стомленасць. Нібы гэта сляды таго пастаяннага напружання, якое называецца цяжарам улады.



Партрэт цара Хамурапі (XVIII ст. да н. э.)

Многія творы мастацтва Вавілона маюць сімвалічны характар. Падумайце, што можа сімвалізаваць скульптурны партрэт цара Хамурапі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Архітэктурныя цуды Вавілона.** Бліскучага росквіту Вавілон дасягнуў у VI стагоддзі да н. э. пры цары Навухаданосары II. Пышнасцю сваёй архітэктуры горад засланіў у той час усе суседнія рэгіёны. Адных толькі храмаў у Вавілоне налічвалася больш за 50! І ўсе яны былі багата ўпрыгожаны палівáнай цэглай і барэльефамі.

Самым велічным сярод храмаў быў *зікурат Этэменанкі* («Дом заснавання неба і зямлі»). Гэта было самае высокае збудаванне Вавілона — 7 ярусаў, агульнай вышынёй прыкладна 91 метр (сучасны 25-павярховы дом). Ніжнія ярусы-платформы былі больш высокімі і масіўнымі, уверсе яны паступова скарачаліся. Гэта стварала адчуванне збудавання незвычайнай вышыні, якое дасягае нябёсаў. Кожны ярус быў пафарбаваны ў свой колер.



Панарама Вавілона. Графічная рэканструкцыя

Паводле падання, у цэнтры Вавілона ўсемагутны цар Навухаданосар II загадаў узвесці для сваёй жонкі «вісячыя сады». Маладая царыца Аміціс, якая вырасла ў гарыстай і зялёнай Мідыі, не магла прывыкнуць да горада, размешчанага на пясчанай раўніне. Каб яе суцешыць, былі створаны сады з багатай расліннасцю на шмат'ярусных платформах. Пляцоўкі для раслін пакрываліся слоем урадлівай зямлі, якая ўвесь час арашалася вадой. Таму такі высока ўзнесены казачны зялёны аазіс у цэнтры сталіцы не выпадкова называлі не толькі цудам садовага мастацтва, але і цудам свету!

Самай галоўнай вуліцай Вавілона з'яўлялася *Дарога Працэсій*. Тут праходзілі шматлікія працэсіі ў гонар бажаства Мардýка. Яны



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вісячыя сады Семіраміды. Графічная рэканструкцыя

накіроўваліся да свяшчэннага цэнтра горада, дзе знаходзіліся ўсе галоўныя храмы. У аднаўленым выглядзе Дарога Працэсій уражвае манументальнымі сценамі з зубчастымі завяршэннямі, размешчанымі ўздоўж шырокай вуліцы.

Зікурат Этэменанкі з'яўляецца прататыпам Вавілонскай вежы. Прачытайце біблейскі сюжэт пра Вавілонскую вежу на дадатковай старонцы. Што азначае выраз «вавілонскае стоўпатварэнне»?

**Вароты Вавілона.** У горадзе было восем варот, названых у гонар галоўных багоў Месапатаміі. Ад іх ішлі дарогі, якія злучалі Вавілон з суседнімі гарадамі.

Галоўныя *вароты Вавілона, прысвечаныя багіні Іштар*, былі сапраўдным цудам прыгажосці, будаўнічага майстэрства, узорам бліскучага сінтэзу архітэктуры і дэкаратыўнага мастацтва. На сценах, упрыгожаных ярка-сіняй паліванай пліткай, размяшчаліся шматколерныя выявы рэальных і міфалагічных жывёл. Іх залацістыя рэльефныя сілуэты сімвалізавалі нябесную абарону горада з боку боскіх сіл.

Фантастычныя вобразы жывёл з тулавам ільва, галавой змяі — вечныя вартавыя, якія велічна ступаюць шэрагамі ў павольным рытме. Глыбокі сіні колер паліванага фону сцен даваў адчуванне таго, што сам купал высокага неба датыкаецца да гарадской архітэктуры.



Дарога Працэсій. Макет з Пергамскага музея ў Берліне, Германія



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вароты багіні Іштар з Пергамскага музея ў Берліне, Германія (I ст. да н. э.)

Выявы жывёл вядомыя ў розных культурах. У мастацтве Вавілона яны маюць свае асаблівасці. Разгледзьце выявы жывёл у параграфе і на кампакт-дыску. У чым, па-вашаму, заключаецца арыгінальнасць вобразаў жывёл, намаляваных на сценах варот багіні Іштар?

На працягу многіх стагоддзяў Вавілон быў буйным цэнтрам культуры. Не выпадкова назва гэтага горада перакладаецца як «вароты бога». Мастацтва Вавілона складвалася пад наймацнейшым уплывам шумерскай цывілізацыі, але адрознівалася схільнасцю да пышнасці і ўрачыстай манументальнасці.

### Пытанні і заданні

1. Параўнайце мастацкія творы з выявай чалавека, створаныя шумерамі і вавіланянамі. Чым адрозніваюцца вобразы людзей у абедзвюх культурах? Назавіце адно-два адрозненні.

2. Якую ідэю, на ваш погляд, выяўляе рэльеф на стэле цара Хамурапі? Як вы думаеце, чаму менавіта такая кампазіцыя дапаўняла тэкст законаў?

3. Сучасныя архітэктары, імкнучыся да паляпшэння экалогіі вялікіх гарадоў, прапануюць размяшчаць расліны на дахах і балконах-тэрасах вышынных дамоў. Якое дасягненне старажытнай культуры іх натхняе?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Творчая майстэрня**

4. Падрыхтуйце ў класе праект на тэму «Культура Вавілона». Падзяліцеся для гэтага на групы. Кожная група можа вырашаць канкрэтную задачу («Вобраз чалавека», «Фантастычныя вобразы жывёл», «Вароты Іштар» і інш.). Паспрабуйце падчас падрыхтоўкі праекта адказаць на пытанне: чаму культуру Вавілона часта называюць забытай культурай? Ці згодны вы са сцвярджэннем англійскага паэта Джорджа Ба́йрана?

> Скептические люди в наши дни
> Твердят упрямо, но довольно вяло,
> Что всё это побасенки одни,
> Что Вавилона вовсе не бывало...
>
> *Дж. Байрон. «Дон Жуан»*
> *(отрывок) (перевод Т. Гнедич)*

## § 12. Мастацтва Асірыі: адлюстраванне ваеннай сілы і ўлады правіцеляў

Асірыя — адна з магутных дзяржаў у Месапатаміі. У старажытнасці яна ўяўляла сабой грозную ваяўнічую сілу. Правіцелі Асірыі ўвесь час вялі захопніцкія войны. А мастацтва выкарыстоўвалі найперш для дэманстрацыі сваёй моцы і непераможнасці.

**Гарады-крэпасці і палацы-цытадэлі.** Ваенізаваны характар асірыйскай дзяржавы моцна ўплываў на архітэктуру гэтай краіны. У адрозненне ад іншых народаў Месапатаміі асірыйцы ўзводзілі не гарады, а гарады-крэпасці. Абнесеныя магутнымі сценамі і ровам, яны



Горад Дур-Шарукі́н. (VIII ст. да н. э.) Графічная рэканструкцыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Шэду з Пергамскага музея ў Берліне, Германія (XIX ст. да н. э.)

уяўлялі сабою складаную сістэму ўмацаванняў. Цэнтрам гарадскога ансамбля быў не храм, а царскі палац. Звычайна ён займаў большую частку горада і таксама ўзводзіўся як непрыступная цытадэль.

Яркім прыкладам архітэктурнага майстэрства асірыйцаў з'яўляецца горад *Дур-Шарукін* — рэзідэнцыя цара Саргона II. Вышыня гарадскіх сцен дасягала 23 метраў. А колькасць вартаўнічых веж перавышала 160! Палац Саргона II налічваў больш за дзвесце памяшканняў і складаўся з трох храмаў. Гэта грандыёзнае збудаванне ўзвышалася на маналітнай платформе вышынёй 14 метраў. Да платформы з двух бакоў вялі пандусы, па якіх у палац заязджалі калясніцы і вершнікі.

Абапал галоўнага ўвахода стаялі фантастычныя вартавыя — *духі шэ́ду*. Гэта былі 10-метровыя статуі магутных крылатых быкоў з чалавечай галавой у галаўным уборы цара. Асірыйцы верылі, што духі шэду ахоўваюць магутнага ўладара.

Быкоў-шэду звычайна паказвалі з пяццю нагамі. Верагодна, для таго, каб кожны, хто ўваходзіў, бачыў іх спераду — застылымі ў грозным супакоі. А збоку, праходзячы паміж імі, — у велічным руху. Так, шэду нібы ішлі і стаялі адначасова: паслядоўна сустракалі і суправаджалі ўсіх наведвальнікаў царскай рэзідэнцыі. А заадно і запалохвалі іх сваім грозным выглядам і нечалавечай моцай.

? Разгледзьце выяву крылатага быка-шэду. Чым, на ваш погляд, незвычайная гэта выява? Што ў ёй сімвалізуе царскую ўладу?

**Ніневія — апошняя сталіца Асірыі.** Галоўным горадам краіны быў вялікі і вельмі багаты горад Ніне́вія. Кварталы дамоў і палацаў цягнуліся ўздоўж берага ракі Тыгр на 4 кіламетры.

Межы Ніневіі вызначалі магутныя гарадскія сцены са шматлікімі варотамі. Іх ніжняя частка была складзена з велізарных камянёў, а верхняя — з высушанай на сонцы цэглы. Завяршаліся сцены ца-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

глянымі зубцамі. Паверхня зубцоў была пакрыта блакітнай палівай і ярка зіхацела. Старажытныя людзі гаварылі: «Ніневія — гэта горад, які адпужвае ворагаў сваім ззяннем».

Па загадзе цара Ашурбаніпáла ў Ніневіі — проста ў царскім палацы — была заснавана знакамітая *Ніневійская бібліятэка*. У яе зборы, якія налічваў дзясяткі тысяч гліняных таблічак з клінапіснымі тэкстамі, панаваў узорны парадак. Кожная «кніга» захоўвалася ў шасці асобніках, і ўсе яны былі пералічаны ў спецыяльных каталогах.

**Цікавы факт**

Падчас раскопак палаца Ашурбаніпала археолагі знайшлі 25 тысяч клінапісных таблічак. Гэта была толькі дзясятая частка ўсёй Ніневійскай бібліятэкі.

Мноства пісцоў і бібліятэкараў перапісвалі гліняныя таблічкі. Асабліва цікавіла цара, як атрымаць заступніцтва багоў і прадказваць будучыню. Таму «кнігі» Ніневійскай бібліятэкі — гэта тэксты міфалагічных паданняў і прароцтваў, напісаных часта на мовах розных народаў Месапатаміі. Яны расказвалі пра вядзьмарства, лекаванне, легендарныя і гістарычныя подзвігі. Вядома ж, тут быў і тэкст шумерскага падання пра Гільгамеша, вельмі папулярнага ў Асірыі.



Вароты Ніневіі (VII ст. да н. э.). Сучасная рэканструкцыя



Таблічка з Ніневійскай бібліятэкі (VII ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Цара Ашурбаніпала называюць першым бібліяфілам. Што абазначае гэта слова?

**Каменны летапіс асірыйскай гісторыі.** У выяўленчым мастацтве асірыйцы аддавалі перавагу не жывапісу і круглай скульптуры, а рэльефу. Галоўнымі героямі рэльефных выяў выступалі асірыйскія цары. Усе сюжэты былі звязаны з іх жыццём і дзейнасцю: цар гутарыць з багамі, прымае дары ад падданых, ваюе з ворагамі ці палюе на дзікіх звяроў…

У горадзе Кальху была знойдзена *манументальная каменная стэла* цара Ашурнасірпáла II. Уладар паказаны ў застылай велічнай паставе. Адной рукой ён паказвае на зорку, рогі, месяц, крылы і шлем. Гэта значыць на знакі, якія сімвалізуюць пяцярых багоў — заступнікаў Асірыі. У другой руцэ цар трымае жазло — знак улады. Паверхня стэлы, якая служыць фонам рэльефу, пакрыта дробным клінапісам. Гэта аповед пра вялікія справы цара. Але нават той, хто не ўмее чытаць, зразумее, што тут паказаны магутны правіцель. На твары ўладара не адлюстравана ніякіх эмоцый, ён велічна нерухомы.


Стэла цара Ашурнасірпала II (XIX ст. да н. э.)

Асірыйскія майстры ўмела перадавалі ў падрабязнасцях самыя дробныя дэталі. На трохметровай выяве можна разгледзець адзенне цара, яго галаўны ўбор, прычоску і выкладзеную ярусамі завітую бараду. Асабліва цікавыя ўпрыгажэнні: бранзалеты, буйная завушніца ў вуху. На шыі відаць каралі з пяці амулетаў — у гонар пяці вярхоўных багоў.

Гэтак жа падрабязна майстры выканалі рэльефы, якія ўпрыгожвалі палац у Ніневіі. Сярод сюжэтаў вылучаецца «*Вялікае львінае паляванне*». На дзясятках каменных пліт мастакі адлюстравалі сцэны палявання на львоў. Перад вачамі гледача праходзяць усе этапы палявання: выезд цара на калясніцы, пагоня за жывёламі і, нарэшце, вяртанне ў палац са здабычай.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вялікае львінае паляванне. Фрагмент рэльефу (VII ст. да н. э.)

У рэльефе «Вялікае львінае паляванне», як і ў скульптуры ў цэлым, асірыйцы асаблівую ўвагу надалі перадачы дынамікі фігур. Яны паказаны ў розных паставах, ракурсах. У вобразах воінаў мастакі падкрэслілі сілу, смеласць, адвагу. Яны стойка змагаюцца з царом звяроў, выкарыстоўваючы розныя прылады. Іх магутныя плечы выпрастаны, рукі дужыя, выразы твараў суровыя і рашучыя.

Уважліва разгледзьце фрагмент рэльефу «Вялікае львінае паляванне». Падрабязна ахарактарызуйце сюжэт, увасоблены асірыйскімі майстрамі.

У шэдэўрах мастацтва Асірыі знайшлі адлюстраванне самыя важныя асаблівасці культуры гэтай старажытнай дзяржавы: тэма магутнай царскай улады, імкненне да велічных вобразаў, пышнасць палацавага ўбранства. Даўно мінулі часы, калі суседнія народы баяліся асірыйскіх цароў і іх войскаў. Але тэма велічы ў мастацтве Асірыі па-ранейшаму хвалюе гледача.

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце рэканструкцыі гарадоў Асірыі. Што вас уразіла ў асірыйскіх гарадах?

2. Падумайце, што з дасягненняў архітэктуры асірыйцы атрымалі ў спадчыну ад сваіх папярэднікаў — шумераў і вавіланян.

3. Цар Ашурбаніпал па праву ганарыўся сваёй адукаванасцю. Магчыма, ён быў адзіным правіцелем свайго часу, які ўмеў чытаць і пісаць. На адной з таблічак Ніневійскай бібліятэкі захавалася яго выказванне. Прачытайце яго. Што ў словах цара здалося вам незвычайным? Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

> Я изучил тайное искусство письма на табличках.
> Я предсказываю будущее.
> Я умею решать сложные, непростые задачи
> на деление и умножение.
> Я читаю таблички на древнем языке шумеров.
> Я знаком с древними записями, уже совсем непонятными.
>
> *Царь Ашшурбанипал*

**Творчая майстэрня**

4. Выканайце праект-даследаванне «Якія дасягненні Месапатаміі выкарыстоўвае сучасны чалавек?». Абмяркуйце з аднакласнікамі, якую каштоўнасць для нас уяўляюць творы мастацтва Месапатаміі.

## § 13. Мастацтва Старажытнага Ірана: услаўленне магутнасці цара і яго дзяржавы

Культура Старажытнага Ірана ўзнікла на ўсходзе ад Месапатаміі. Іранскія плямёны, наймацнейшымі сярод якіх былі персы, прыйшлі на гэту тэрыторыю з Сярэдняй Азіі. Яны ўспрынялі мясцовую культуру, узбагаціўшы яе новым зместам. Суседства з магутнай Месапатаміяй моцна паўплывала на развіццё старажытнаіранскага (персідскага) мастацтва — яго характар і мастацкія прыёмы. Як і ў Месапатаміі, яно стала служыць сцвярджэнню велічы вярхоўнай улады цара.

**Палацы персідскіх уладароў.** Палац як сімвал царскага валадарства, як дынастычная святыня быў галоўным тыпам збудаванняў у Старажытным Іране. Палацы ўзводзілі велізарных памераў і размяшчалі на высокіх платформах. З двух бакоў да гэтых платформаў вялі парадныя лесвіцы, багата ўпрыгожаныя рэльефамі. Як і ў асірыйскіх палацах, грандыёзныя ўваходныя вароты знаходзіліся пад аховай фантастычных істот, створаных з каменю, — з галавой цара, тулавам быка і крыламі арла.

Мноства багата ўпрыгожаных палацаў было пабудавана ў адной з першых персідскіх сталіц — Пасаргáдах. Затым іх узводзілі ў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Палац у Персепалі
(V ст. да н. э.)



Вароты са скульптурнымі выявамі шэду ў Персепалі (V ст. да н. э.)

Персе́палі і Сузах. Усе палацавыя комплексы будаваліся паводле аднаго плана. Галоўным памяшканнем палаца была парадная шмат-калонная зала — новае слова ў архітэктуры. Яе велізарная і добра асветленая прастора выкарыстоўвалася для найважнейшых прыёмаў і цырымоній. У самым вялікім з персідскіх палацаў — персепальскім — такіх залаў было некалькі. У «Зале цароў Дарыя-Ксеркса» столь падтрымлівалі 36 лёгкіх і стройных калон. А ў «Зале цара Артаксеркса II» — іх ужо было 100! Самыя прыгожыя калоны ўпрыгожвалі палац у Сузах. На вышыні амаль 20 метраў яны ўвенчваліся здвоенымі паўфігурамі быкоў з пазалочанымі галовамі. У гэтай шырокай і светлай прасторы таксама размяшчаўся трон цара, які можна было агледзець здалёку. Менавіта тут праводзіліся царскія прыёмы і цырымоніі.

Архітэктурныя ансамблі Старажытнага Ірана немагчыма ўявіць без *скульптурных рэльефаў*. Ад асірыйскіх твораў яны адрозніваюцца велічна-ўрачыстым характарам. У іх няма вострасюжэтных сцэн барацьбы, напоўненых рухам і эмацыйным напружаннем. Любімы матыў персідскіх скульптараў —



Рэльеф палаца ў Сузах. Паліваная кераміка
(VI ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

бясконцыя чароды воінаў і даннікаў, якія нясуць цару дары. Ідучы ў спакойным, мерным рытме, яны ўсім сваім аблíччам паказваюць пачцівасць. Многія рэльефы, напрыклад з палаца ў Сузах, складзены з рознакаляровых керамічных плітак. Гэта дазваляла перадаць аблічча персідскіх воінаў ва ўсёй іх святочнай прыбранасці. Дагледжаныя прычоскі і бароды, раскошнае адзенне… Кожная дэталь уражвае яркім колерам. У такім жа дэкаратыўным стылі выконваліся і выявы фантастычных жывёл.

Параўнайце рэльефы Старажытнага Ірана і іншых старажытных культур. З якімі культурамі сюжэты і вобразы старажытнаіранскіх рэльефаў маюць падабенства?

**Царскія магільныя скляпы.** Значнае месца ў архітэктуры Старажытнага Ірана займалі грабніцы. У старажытнаіранскіх пахавальных збудаваннях адсутнічае велічнасць, характэрная для палацавай архітэктуры. Мемарыяльныя комплексы адрозніваюцца стрыманасцю. Напрыклад, грабніца цара Кíра ў Пасаргадах складзена з вялікіх каменных блокаў. Кампактнае прамавугольнае ў плане збудаванне ўзвышаецца на шасціступеньчатым пастаменце. Дзякуючы паслядоўнаму змяншэнню вышыні камянёў у кладцы грабніца выглядае грандыёзнай.



Грабніца цара Кіра ў Пасаргадах (VI ст. да н. э.)

Найвялікшым тварэннем старажытных іранцаў можна па праву лічыць скальныя



Скальныя грабніцы ў Накш-і-Рустэме (I тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

грабніцы ў Накш-і-Рустэме. Яны высечаны на 20-метровай вышыні і маюць незвычайнае паглыбленне ў форме крыжа, упрыгожанае ў верхняй частцы шматфігурнымі рэльефнымі выявамі. На фоне маналітнага горнага плато такія велічныя крыжападобныя «вароты ў вечнасць» выклікаюць адчуванне нябачнай сілы і магутнасці памерлых і абагаўлёных правіцеляў.

Разгледзьце грабніцы ў Пасаргадах і Накш-і-Рустэме. Параўнайце іх знешні выгляд. Знайдзіце ў гэтых збудаваннях агульнае і адрознае.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Вялікія іранскія цары высока цанілі раскошныя прадметы. Таму для твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва былі характэрныя элегантнасць і вытанчанасць. Асабліва па-майстэрску старажытнаіранскія майстры апрацоўвалі метал, выкарыстоўваючы розныя тэхнікі, напрыклад гравіроўку, чаканку, ліццё. Сярод дэкаратыўных вырабаў з золата і срэбра вялікай своеасаблівасцю адрозніваюцца *рытоны* — высокія чашы ў выглядзе рога багацця, а таксама падстаўкі ў форме фантастычнай жывёлы.



Залаты рытон (V ст. да н. э.)

Багаццем і дасканаласцю дэкору ўражваюць зброя, прадметы побыту, ювелірныя вырабы. Кожны выраб — унікальны сінтэз фантазіі і назіральнасці. Дзякуючы віртуознаму майстэрству выканання метал нібы ажывае. Старажытнаіранскія майстры здолелі ў такіх вырабах дабіцца дасканаласці формы і давесці яе да сапраўднай персідскай дэкаратыўнай вытанчанасці.



Кінжал з ручкай у выглядзе львоў (VI—V стст. да н. э.)

Прадметы побыту, створаныя майстрамі Старажытнага Ірана, адрозніваюцца раскошай і багаццем дэкору. Як, на ваш погляд, гэта звязана з культам царскай улады?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мастацтва Старажытнага Ірана служыла сродкам праслаўлення цара. Масіўныя збудаванні і вытанчаныя ўпрыгажэнні, касцюмы і амуніцыя воінаў, скульптурныя выявы чалавека і фантастычных істот адлюстроўвалі раскошу і моц квітнеючай дзяржавы. У формах грандыёзных збудаванняў, рэльефах, а таксама ў прадметах побыту, зброі, упрыгажэннях сцвярджалася магутнасць правіцеля.

### Пытанні і заданні

1. У чым, па-вашаму, заключаецца своеасаблівасць збудаванняў Старажытнага Ірана? Ахарактарызуйце адно са збудаванняў.

2. Хвала правіцелю ўзносіцца і ў літаратуры Старажытнага Ірана. Прачытайце ўрывак са свяшчэннай кнігі «Авеста». Якія якасці прыпісваюць правіцелю?

Пусть властвуют хорошие правители
(Пусть не властвуют плохие),
Осуществляя доброе учение и преданность,
То учение, что приносит благо людям и их потомкам,
И пусть утвердится уход за скотом ради сытости скотоводов...
И пусть плодоносят растения.

*Из священной книги «Авеста»*

3. Параўнайце творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Ірана і іншых культур старажытнага свету. У чым заключаецца ўнікальнасць старажытнаіранскіх упрыгажэнняў і зброі? Якія сюжэты і матывы пераважаюць у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Ірана?

### Творчая майстэрня

4. У культуры Ірана, як і ў іншых культурах старажытнага свету, важную ролю адыгрывае міфалогія. Выканайце з аднакласнікамі праект на тэму «Асноўныя міфалагічныя сюжэты Старажытнага Ірана». Абмяркуйце, якія міфы вам знаёмыя, якія спадабаліся, якія з іх выкарыстоўваюцца ў сучасным мастацтве.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 14. Культура Харапы як калыска мастацтва Старажытнай Індыі

Культура Старажытнай Індыі ўзнікла амаль адначасова з іншымі культурамі Старажытнага Усходу. Але еўрапейцы адкрылі для сябе багацце гэтай цывілізацыі зусім нядаўна, у XX стагоддзі.

**Своеасаблівасць гарадоў Хара́пы.** У паўночна-заходняй частцы паўвострава Індастан у акружэнні вод бязмежнага акіяна і горных хрыбтоў Гімалаяў узнікла своеасаблівая культура Харапы, якая паклала пачатак развіццю мастацтва Старажытнай Індыі.

У перыяд, калі на большай частцы планеты культура знаходзілася на стадыі першабытнага грамадства, на тэрыторыі Харапы квітнела гарадское жыццё. Росквіт Харапы доўжыўся амаль два тысячагоддзі! Навукоўцы налічылі некалькі дзясяткаў дзівосна аднолькавых гарадоў са строгай планіроўкай вуліц і дамамі, створанымі, як бы мы сказалі сёння, «па тыпавым праекце». Падобнымі былі і пабудовы. Часцей за ўсё паселішчы агароджвалі магутнымі цаглянымі сценамі.

Галоўнымі гарадамі — цэнтрамі культурнага жыцця Харапы — былі Махе́нджа-Да́ра і Харапа (менавіта па назве гэтага горада і была названа цывілізацыя). Гэта адны з самых старажытных гарадоў, вядомых сёння. Руіны Махенджа-Дара ствараюць незабыўнае ўражанне.



Руіны горада Махенджа-Дара (III тыс. да н. э.)

Гэтыя гарады адрознівае на дзіва высокі ўзровень цывілізацыі. Гарачы, засушлівы клімат стаў прычынай трапяткога стаўлення да вады — адной з галоўных каштоўнасцей гараджан. У большасці дамоў будавалі студні, памяшканні для абмыванняў. Існавалі і грамадскія студні, і нават басейны. На ўсёй тэрыторыі гарадоў дзейнічала сістэма водазабеспячэння і каналізацыі.

Культ вады меў асаблівае значэнне ў культуры Старажытнай Індыі. Як гэта адлюстравалася ў архітэктуры?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Скульптура Харапы.** Свае асаблівасці мела і скульптура. Увагу мастакоў да аблічча чалавека дэманструе *круглая скульптура Харапы*. Вобраз высакароднага мужчыны (магчыма, жраца) адлюстраваны ў адной са статуэтак з Махенджа-Дара. Перад намі — не юнак, а сталы мужчына ў адзенні, упрыгожаным узорам з трыліснікаў. Ён злёгку прыпадняў галаву, дэманструючы ўсім сваю значнасць. Прыплюшчыўшы вочы, ён быццам пагардліва назірае за тым, што адбываецца вакол.



Статуэтка жраца з Махенджа-Дара (III—II тыс. да н. э.)

У статуэтцы танцоўшчыцы з Махенджа-Дара вобраз жанчыны перадаецца досыць умоўна. Непрапарцыянальна доўгія рукі і ногі ствараюць уражанне, быццам мастак паказаў не скончаную работу, а толькі абагульнены вобраз, абазначыўшы толькі паставу і атрыбуты танцоўшчыцы. У той жа час майстар надаў увагу некаторым дэталям: прычосцы, упрыгажэнням, пасудзіне ў руцэ танцоўшчыцы. Магчыма, так ён хацеў падкрэсліць рысы, якія раскрываюць вобраз жанчыны. Высока паднятая галава, прыстаўленая да пояса рука — менавіта гэтыя жэсты паказваюць на тое, што танцоўшчыца ганарыцца сваім талентам.



Статуэтка танцоўшчыцы з Махенджа-Дара (III—II тыс. да н. э.)

Пералічыце асноўныя мастацкія вобразы, якія атрымалі ўвасабленне ў выяўленчым мастацтве Старажытнай Індыі. З чым, на ваш погляд, гэта звязана?

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Харапы.** На тэрыторыі гарадоў Харапы знойдзены раскошныя *каменныя пячаткі* з рэльефнымі выявамі жывёл і фантастычных істот. Вобразы тураў, аленяў, насарогаў перадаюцца натуралістычна. Не акцэнтуючы ўвагі на дэталях, майстры вылучаюць і падкрэсліваюць тыя характарыстыкі, якія дазваляюць лёгка пазнаць жывёлу:



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

доўгі хобат у слана, вялікія выгнутыя рогі ў тура…

Такіх пячатак знойдзена больш за дзве тысячы! Яны ўяўляюць асаблівую цікавасць, паколькі многія суправаджаюцца надпісамі, зробленымі своеасаблівым іерагліфічным пісьмом. Верагодна, гэтыя старажытныя пісьмёны распавядаюць пра тое, наколькі важныя былі для жыхароў Харапы адлюстраваныя жывёлы, птушкі, а таксама загадкавыя вобразы, якія спалучаюць у сабе рысы чалавека і разнастайных прадстаўнікоў свету фаўны. Магчыма, гэтыя вобразы лічылі свяшчэннымі і абагаўлялі.



Пячатка з Махенджа-Дара (III тыс. да н. э.)

Паступова культура Харапы, якая зведала шэраг прыродных катастроф, прыйшла ў заняпад. Качавыя плямёны, якія засялілі гэту тэрыторыю, паклалі пачатак новаму этапу ў развіцці мастацтва Індыі.

Як вы думаеце, чаму жывёл і фантастычных істот адлюстроўвалі на рэльефах каменных пячатак Харапы?

Мастацтва Харапы не было скавана канонамі і строгімі правіламі. Гэта дало магчымасць больш свабодна і адкрыта, чым у Старажытным Егіпце і Месапатаміі, перадаваць з'явы навакольнага свету і сцэны паўсядзённага жыцця. А ў вобразах ушанаваных жывёл і чалавека завастралася ўвага на іх характэрных рысах.

### Пытанні і заданні

Разгледзьце творы мастацтва Харапы, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Якое ўражанне яны на вас зрабілі?

1. Параўнайце творы мастацтва Харапы са старажытнаегіпецкімі творамі. Ці ёсць у культурах гэтых краін агульныя рысы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Дзіцячая цацка з Харапы (III тыс. да н. э.)

**Творчая майстэрня**

2. Перад вамі — выява дзіцячай цацкі, створанай індыйскімі майстрамі. У ёй прадстаўлены сюжэт з жыцця старажытных індыйцаў. Раскажыце падрабязна, пра што распавядае нам гэта цацка. Паспрабуйце самастойна выканаць фрагмент цацкі з пластыліну.

## § 15. Мастацтва Старажытнай Індыі

Важную ролю ў развіцці культуры Індыі адыграла рэлігія. Рэлігійныя перакананні прывялі да з'яўлення ў мастацкай культуры новых тэм, сюжэтаў і вобразаў.

**Эпас** — са стараж.-грэч. «апавяданне», «аповед» пра падзеі і герояў далёкага мінулага.

**Старажытнаіндыйскі эпас.** Найбольш яскрава рэлігійныя ўяўленні індыйцаў увасобіліся ў найважнейшых літаратурных помніках Старажытнай Індыі — «Ве́дах», «Махабха́раце», «Рама́яне».

Прачытайце ўрыўкі са старажытнаіндыйскіх эпасаў. Якое ўражанне на вас зрабілі сюжэты эпасаў? Якія якасці чалавека шанаваліся ў Старажытнай Індыі?

| **Літаратура Старажытнай Індыі** | |
|---|---|
| **«Веды» — зборнік самых старажытных індыйскіх тэкстаў** | |
| У перакладзе слова «веды» абазначае «веды, вучэнне». У ведычных гімнах, песнях і загаворах індыйскія мудрацы адказваюць на самыя складаныя пытанні светабудовы: пра тое, адкуль узнік Сусвет, пра людзей і багоў, а таксама пра гарады, пра рамёствы, пра старажытнаіндыйскую медыцыну. | Что двигалось туда и сюда?<br>Где? Под чьей защитой?..<br>Не было ни смерти,<br>ни бессмертия тогда.<br>Не было ни признака дня<br>или ночи.<br>*Часть 1, «Ригве́да»*<br>*(перевод Т. Елизаренковой)* |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## «Махабхарата» — першы старажытнаіндыйскі эпас

«Махабхарата» ў перакладзе азначае «Вялікае паданне пра нашчадкаў цара Бхараты». У гэтым эпасе ў паэтычнай форме апавядаецца пра жыццё ў Старажытнай Індыі. Але асаблівае месца надаецца бітвам і войнам, якія адбываліся ў Старажытнай Індыі.

Бітва на полі Куру доўжылася васямнаццаць дзён. Але дабро перамагло зло з дапамогай багоў:

...Воистину стремящийся к победе не так силой или отвагой побеждает, как правдой, справедливостью, соблюдением долга, самообладанием...

Где справедливость, там победа.



Бітва на полі Куру. Ілюстрацыя з «Махабхараты»

## «Рамаяна» — другі старажытнаіндыйскі эпас

«Рамаяна» ў перакладзе абазначае «Вандраванне Рамы». У меладычных вершах апавядаецца пра жыццё бездакорнага, адважнага, мудрага Рамы. З ім адбываюцца розныя, часам кур'ёзныя гісторыі. Напрыклад, бітва з дзесяцігаловым і дваццацірукім волатам. Ці жаніцьба з цудоўнай Сітай. Дзеля вяселля герой павінен нацягнуць цеціву на магутны лук грознага бога Шы́вы...

...И раджа велел принести этот лук знаменитый.  
Душистым сандалом натёртый, цветами увитый.  
Пять сотен мужей превосходных, исполненных силы,  
В телегу впряглись по приказу владыки Митхилы.  
На восьмиколёсной телеге сундук размещался.  
Под крышкой железной блистающий лук помещался...  
Рама рукою за лук ухватился мгновенно.  
И поднял, как будто играючи, над головою,  
И туго сплетённой из мурвы стянул тетивою...

*Эпизод «Лук Шивы и женитьба Рамы»*  
*(перевод В. Потаповой)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Унікальнасць старажытнаіндыйскай архітэктуры.** На развіццё архітэктуры таксама паўплывалі рэлігійныя погляды старажытных індыйцаў. З узнікненнем *будызму* — першай сусветнай рэлігіі — у Старажытнай Індыі разгарнулася маштабнае будаўніцтва культавых збудаванняў.

Унікальным тыпам збудавання была *будыйская Ступа*. Гэта грандыёзная каменная паўсфера на пастаменце, у якой захоўваліся святыя рэліквіі. На вяршыні Ступы ўзвышалася адносна невялікая надбудова, якую ўвенчвалі сімвалічныя парасоны, што атаясамліваліся з часткамі Сусвету.

Адным з сусветна вядомых такіх збудаванняў, якое добра захавалася, з'яўляецца Ступа ў Са́нчы. Яе агароджа першапачаткова была выканана з дрэва. З часам яе замянілі на каменную, якая цалкам паўтарыла ранейшыя формы. Тады ж Ступу «апранулі» ў новую абалонку, і яе памеры павялічыліся ўдвая.



Ступа ў Санчы
(І ст. да н. э. — І ст. н. э.)

Асаблівую цікавасць выклікаюць вароты Ступы. Рэльефы, якія ўпрыгожваюць іх, дэманструюць умелую працу мастакоў у разьбе па камені. Тут нас сустракаюць выявы сланоў, ільвоў, тураў, характэрныя для старажытнаіндыйскай культуры. Мы бачым і сцэны гістарычных бітваў. Вобразы рэальнага і фантастычнага светаў, пераплятаючыся паміж сабой, адкрываюць нам шлях да спазнання каштоўнасцей індыйскага мастацтва.

Разгледзьце Ступу ў горадзе Санчы. У чым, на ваш погляд, заключаецца незвычайнасць архітэктурнай формы?

Пячорныя храмы. Па ўсёй тэрыторыі Індыі будаваліся і будыйскія храмы — ча́йціі. Іх высякалі ў скалах, а таксама ўзводзілі на адкрытай прасторы.

Самы вялікі пячорны храм — чайція ў горадзе Ка́рлі. Ён размяшчаецца на глыбіні 40 метраў. Усярэдзіне — прасторная выцягнутая



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

зала, у завяршэнні якой усталявана Ступа як адзін з сімвалаў будыйскай веры. Гэта частка храма, як і алтар хрысціянскіх цэркваў, была найбольш значнай. Унутраныя калоны чайцdevi ў Карлі маюць падмурак, які нагадвае гліняную пасудзіну. З яе, нібы ствол дрэва, вырастае васьміграння калона. Завяршае калону форма, якая нагадвае перавернуты звон. На кожнай калоне ўсталявана скульптурная статуя сланоў з вершнікамі.



Чайцыя ў Карлі (I ст. да н. э.)

Уражваюць сваёй пышнасцю і старажытныя пячорныя храмы ў Аджа́нце. Гэтыя архітэктурныя збудаванні арганічна зліваюцца з прыродным ландшафтам. Уваход у чайціі багата аздоблены рэльефамі з выявамі багоў, чалавечых фігур, жывёл і арнаментальнымі паясамі.

Уявіце, што вы апынуліся ў прасторнай зале чайціі ў горадзе Карлі. Якія адчуванні можа выклікаць пышна арганізаваная прастора ўнутры гэтага храма?



Пячорныя храмы ў Аджанце (II ст. да н. э. — V ст. н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Стамбха Ашокі
(III ст. да н. э.)



Статуя Буды
ў Таксілі (II ст.)

**Вобразы скульптуры.** Архітэктура Старажытнай Індыі немагчымая без багатага скульптурнага афармлення. Незвычайным манументальным збудаваннем была індыйская стáмбха — каменная калона, на вяршыні якой усталёўвалася скульптура. Стамбхі ўзводзілі ў гонар багоў. Лічылася, што гэтыя калоны злучаюць зямлю і нябёсы.

На стамбхах размяшчалі ўказы правіцеляў, а таксама розныя выслоўі. Стамбха аднаго з правіцеляў Старажытнай Індыі — Ашокі — завяршаецца скульптурнай групай з чатырох ільвоў, якія накіравалі позірк па баках свету. Некалі яны ўтрымлівалі на сваіх спінах кола, якое не захавалася да цяперашняга часу.

Унутраная засяроджанасць, супакоенасць характарызуюць *вобраз Буды* — заснавальніка будызму. У статуі з Таксілі Буда нерухомы. Яго рухі скаваныя, дыханне няўлоўнае. Прыплюшчыўшы вочы, ён быццам застыў у роздуме. У імкненні да духоўнага прасвятлення Буда адрокся ад людской мітусні, звярнуўшыся да свайго ўнутранага свету.

10 Разгледзьце на дадатковай старонцы скульптурную выяву бога Шывы. Ён выклікаў захапленне ва ўсе часы. Статуэтка Шывы шматразова паўтаралася. Змяняліся толькі дэталі выявы: прычоска, карона, арэол полымя. Але пластыка рухаў захоўвалася нязменна. І дагэтуль статуэтка танцуючага Шывы — адзін з сімвалаў культуры Старажытнай Індыі. Як вы думаеце чаму?

**Жывапісныя шэдэўры Старажытнай Індыі.** Незвычайным багаццем фарбаў і непаўторнасцю вобразаў адрозніваецца жывапіс Старажытнай Індыі. Жывапісныя кампазіцыі з шырокай разнастайнасцю тэм і сюжэтаў упрыгожвалі сцены палацаў, дамоў вышэйшай знаці, храмавыя і манастырскія комплексы.

Большасць кампазіцый не захавалася. Пра тое, які быў жывапіс Старажытнай Індыі, мы можам даведацца на аснове захаваных фраг-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ментаў роспісаў, літаратурных апісанняў і копій работ мастакоў мінулых эпох.

Найбольш цэласную карціну паўсядзённага жыцця індыйцаў даюць роспісы храмава-манастырскага комплексу Аджанты. Сярод мноства роспісаў, якія пакрываюць сцены пячорных храмаў, мы бачым і сцэны піроў, і цырыманіяльныя працэсіі, і выявы сланоў, ільвоў, лебедзяў. Мастакі з аднолькавай любоўю ствараюць вобразы багоў і людзей, мужчын і жанчын, прадстаўнікоў вышэйшай знаці і простых людзей.



Фрагмент роспісу Аджанты (II ст. да н. э. — V ст. н. э.)

Падумайце, што вабіць мастакоў пазнейшага часу ў жывапісных вобразах Старажытнай Індыі. Чаму сучасныя аўтары ўвесь час да іх вяртаюцца? Пазнаёмцеся з творчасцю Мікалая Рэ́рыха на дадатковай старонцы. Што асабліва хацеў «расказаць» мастак у творы пра Індыю?

Старажытныя індыйцы, атрымаўшы ў спадчыну каштоўнасці культуры Харапы, разнастаілі свет мастацкіх вобразаў. Увага творцаў да дэталяў спарадзіла характэрную рысу старажытнаіндыйскага мастацтва — дэкаратыўнасць. У гэтых дэталях, прапрацаваных старанна і вытанчана, раскрываецца старажытнаіндыйскае мастацтва.

## Пытанні і заданні

1. Тэксты «Рамаяны» на працягу стагоддзяў служылі крыніцай натхнення для пісьменнікаў і драматургаў. Дзіўна, што гэта прадказалі самі стваральнікі эпасу. Падумайце і назавіце сюжэты вядомых вам твораў, у якіх герой, ваюючы за праўду, уцягнуты ў дзівосныя прыгоды.

До тех пор, пока на земле текут реки и высятся горы,
Будет жить среди людей повесть о деяниях Рамы...



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Разгледзьце помнікі старажытнаіндыйскай архітэктуры, прадстаўленыя ў параграфе. Назавіце асноўныя тыпы культавых збудаванняў Старажытнай Індыі. Ахарактарызуйце іх.

3. Выява стамбхі Ашокі з фігурамі чатырох ільвоў стала ў XX стагоддзі нацыянальным сімвалам Індыі. Як вы думаеце, чаму была выбрана менавіта гэта скульптурная выява?



Ра́вана — персанаж індыйскай драмы «катхакалі»

**Творчая майстэрня**

Рэпертуар індыйскай танцавальнай драмы «катхака́лі» складаюць прадстаўленні на сюжэты «Рамаяны» і «Махабхараты». Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах эпізод музычна-танцавальнага прадстаўлення. Раскажыце пра свае ўражанні. Чым індыйскае выступленне адрозніваецца ад беларускага музычна-танцавальнага прадстаўлення?

## § 16. Мастацтва Старажытнага Кітая: прыгажосць у дэталях

Мастацкая культура Кітая вылучаецца сярод іншых культур старажытнага свету асаблівай паэтычнасцю. Сузіраючы бясконцасць Сусвету, жыхары Кітая нібы раствараліся ў ёй. А дасканаласць і разнастайнасць навакольнага свету натхняла і «падказвала» ім сюжэты для мастацкіх твораў. Уменне кітайскіх майстроў «бачыць» нават драбнюткія дэталі глыбока выявілася ў сімвалічнасці мастацкіх вобразаў — ва ўсіх відах мастацтва.

Кітай называюць Паднябеснай імперыяй. Гэта паэтычная назва звязана з міфалогіяй Старажытнага Кітая. Успомніце з урокаў гісторыі, як яна ўзнікла.

**Пісьменнасць і мастацтва каліграфіі.** Поўныя таямніц і загадак сімвалы пранізваюць усю культуру Старажытнага Кітая. Нават іерогліфы, з якіх складалася кітайская пісьменнасць, сімвалічна адлюстроўвалі розныя з’явы навакольнага свету, перадаючы ў той жа час душэўны стан аўтара.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Самыя старажытныя ўзоры кітайскіх тэкстаў — варажбітныя надпісы на панцырах і костках чарапах у выглядзе простых пытанняў і адказаў. Іерагліфічны тэкст можна прачытаць і на бронзавых пасудзінах, і на сценах храмаў. Дзіўна, але ўжо ў найстаражытнейшых творах кітайскія майстры імкнуліся да прыгажосці ў напісанні сімвалаў — неба і зямлі, птушак і кветак, драконаў… Так з іерагліфічнага пісьма нарадзілася мастацтва <u>каліграфіі</u>.

Адным з самых ушанаваных каліграфаў Кітая быў Ван Січжы́. Гледзячы на яго работы, разумееш, што мастацтва каліграфіі можна разглядаць і як самастойны від творчасці, і як неабходны дадатак да жывапісных кампазіцый на паперы ці шоўку. Творы Ван Січжы падкрэсліваюць вытанчанасць жывапісных вобразаў і глыбіню паэтычных выказванняў. Не выпадкова са старажытных часоў мастацтва каліграфіі параўноўваюць з мастацтвам жывапісу. А ад каліграфа патрабуюцца талент, упартасць і веданне традыцый.

## Цікавы факт

Стварэнне кітайскіх іерогліфаў звязваюць з імем Цан Цзе. Перад тым як прапанаваць новую сістэму знакаў, ён доўга вывучаў сляды птушак і звяроў.

? Параўнайце іерогліфы старажытнаегіпецкай і кітайскай культур. Ці ёсць у іх падобныя вобразы?



**Ван Січжы.** Пісьмо пасля снегу (IV ст. да н. э.). Копія



Кітайскія іерогліфы на панцыры чарапахі (II тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вершнік на драконе
(V—III стст. да н. э.). Копія



**Гу Кайчжы.** Фея ракі Ло
(фрагмент) (IV ст.)

**Жывапіс на скрутках.** Адным з дасягненняў культуры Старажытнага Кітая з'яўляецца зусім новы від мастацтва — *жывапіс на скрутках*. Са старажытных часоў кітайцы стваралі скруткі двух відаў: гарызантальныя і вертыкальныя. Часам яны дасягалі 30 метраў. Тушшу мастакі старанна прамалёўвалі контурныя лініі прадметаў і фігур, а атрыманыя сілуэты зафарбоўвалі густымі мінеральнымі фарбамі.

У кітайскім жывапісе няма складаных сюжэтаў, але кожная выява мае глыбокі сэнс. У вобразах-сімвалах зашыфраваны важныя ідэі і вечныя каштоўнасці, адлюстравана сутнасць рэчаў, якая выслізгвае ад чалавечага позірку. Напрыклад, выява хвоі ўспрымалася як сімвал шчырасці і ўстойлівасці духу, бамбуку — як сімвал цвёрдасці і гнуткасці адначасова, чарапахі — сімвал даўгалецця, тыгра — мужнасці і сілы.

Сярод ранніх маляўнічых прыкладаў на скрутках можна назваць кампазіцыю «Вершнік на драконе». У цэнтры — статны мужчына, вакол якога выгінаецца раз'юшаны дракон. З дапамогай выразных ліній мастак віртуозна перадаў імклівы рух і барацьбу чалавека з міфічнай істотай.

Паступова ў кітайскім жывапісе ўскладняліся тэматыка і тэхнікі выяў. Увага мастакоў засяроджвалася на ўвасабленні вобраза чалавека. Заснавальнікам класічнага жывапісу на скрутках лічаць Гу Кайчжы́. Сярод яго шэдэўраў — 5-метровы скрутак «Фея ракі Ло», кампазіцыя якога адрозніваецца адмысловай паэтычнасцю. Зірніце на мяккія лініі раслін і дрэў, на героя-паэта і фею-прыгажуню, якая заваявала яго.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Скажите, какова она собой?
Вы правду расскажите мне скорей!
И я ему сказал, не утаив:
Прекрасный этот облик вот какой:
Легко, как лебедь вспугнутый, парит,
А гибкостью — летающий дракон!
Осенней хризантемы в ней покой,
Весенняя сосна не так пышна!
Видна же неотчётливо, как сон...
Как месяц, но за облачком, она...
Мелькнёт, вспорхнёт — и вот не удержать:
Снежинкой в ветре закружилась!..

*Цао Чжи. «Фея реки Ло» (отрывок)*
*(перевод А. Адалис)*

Мастак лірычна і ўзнёсла «расказвае» пра чалавека і чароўныя сілы прыроды, выклікаючы ў гледача і рамантычныя ўражанні, і глыбокія развапанні пра свет. Наватарства мастака заключаецца ў тым, што ён здолеў сімвалічна перадаць час: аднаго і таго ж персанажа Гу Кайчжы намаляваў па ўсёй даўжыні скрутка некалькі разоў. Гэты прыём, які нагадвае кадры кінастужкі, дазволіў мастаку «расказаць» у адным жывапісным творы цэлую гісторыю пра прыгожую фею.

У двух мастацкіх прыкладах майстры па-рознаму перадалі рух. Разгледзьце абедзве выявы. Якія сродкі выразнасці для гэтага выкарыстоўвалі кітайскія мастакі?

**Кераміка Кітая.** Керамічныя вырабы Яншáа ў Кітаі маюць даўнія традыцыі. Кераміка Яншáа, названая так па першапачатковым месцы раскопак, адрозніваецца разнастайнасцю формаў і дэкору. Посуд мае складаную афарбоўку — ад ярка-чырвоных да аранжава-жоўтых тонаў. Арнаментальны дэкор складаны і багаты. У ім прысутнічаюць розныя геаметрычныя фігуры: трохвугольнікі, ромбы. Угадваюцца выявы гор, вады, засеянага поля, месяца. Часам сустракаюцца выявы


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пасудзіна Яншаа
(V—III тыс. да н. э.)



Мадэль кітайскага жылога дома (I—II стст.)

рэальных і фантастычных жывёл. Напрыклад, буйных рыб як сімвала воднай стыхіі і яе загадкавых жыхароў.

Прайшлі тысячагоддзі, але гліна па-ранейшаму з'яўляецца любімым матэрыялам кітайскіх майстроў. З яе ствараюць розныя вырабы, у тым ліку шматлікія керамічныя мадэлі кітайскага жылля. Па знойдзеных мініяцюрных мадэлях дамоў можна даведацца пра старажытныя архітэктурныя традыцыі Кітая. Мадэлі перадаюць аблічча старажытнага жылля да драбнюткіх дэталяў. Дзякуючы гэтаму мы ведаем, што ўжо ў Старажытным Кітаі будавалі шматпавярховыя жылыя дамы.

У адной з керамічных мадэляў чатырохпавярховага дома мы бачым, што першыя два паверхі найбольш масіўныя, а кожны наступны — трохі меншы і завяршаецца асобным дахам. Цікава, што дахі жылля выступаюць далёка за межы дома. Кожны паверх дома ўпрыгожаны па-свойму. Сцены першых паверхаў пакрывае жывапіс. Трэці паверх вылучаны ажурнай агароджай балкона.

12 13 Адной з асаблівасцей кітайскага мастацтва з'яўляецца дэкаратыўнасць. Разгледзьце творы мастацтва, прадстаўленыя ў параграфе і на кампактдыску. Апішыце, як у іх праяўляецца дэкаратыўнасць.

**Бронзавыя вырабы.** У Старажытным Кітаі вялікае значэнне мелі рытуальныя пасудзіны з бронзы самай рознай формы і велічыні. Некаторыя вырабы маглі важыць да паўтоны.

Паверхня знойдзеных арыгінальных бронзавых пасудзін мудрагеліста ўпрыгожана геаметрычнымі арнаментамі, іерогліфамі, рэльеф-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

німі выявамі міфічных жывёл. Часта і форма пасудзін нагадвала сілуэт жывёлы. Напрыклад, злёгку выгнутыя ножкі ў трыножнай пасудзіны ўспрымаюцца як лапы тыгра. У пасудзіны, якая нагадвае панцыр чарапахі, ручкі падобныя на галовы драконаў. Выявы драконаў, быкоў, баранаў, якіх шанавалі як сімвалы дабрабыту, служылі выдатнымі «адзеннямі» такіх пасудзін і адначасова выконвалі ролю магічных знакаў.



Бронзавая пасудзіна (III тыс. да н. э.)



Бронзавая трыножная пасудзіна (II тыс. да н. э.)

Падумайце, якія магічныя знакі-сімвалы маглі маляваць мастакі ў арнаменце бронзавых пасудзін. Праверце свае здагадкі з дапамогай інфармацыйных крыніц.

У пошуку гармоніі з навакольным светам кітайскія майстры стварылі ўнікальную культуру. Ідэал гэтага свету адлюстраваны ў творах каліграфіі. У жывапісных вобразах на скрутках, керамічных і бронзавых вырабах спалучаліся дэкаратыўнасць формаў і глыбіня кітайскай сімволікі. Дагэтуль з сімвалізмам мастацтва Кітая не можа параўнацца ніводная сусветная цывілізацыя.

### Пытанні і заданні

1. Старажытнакітайскі мастак Су Шы пісаў, што «ў паэзіі была вобразнасць жывапісу, а ў жывапісе прысутнічала паэзія». Пазнаёміўшыся з мастацтвам Старажытнага Кітая, як вы растлумачыце сэнс гэтага выказвання?

2. Мастацтва каліграфіі і ў наш час займае важнае месца ў жыцці кітайцаў. На фотаздымку вы бачыце сучасную дзяўчыну, якая стварае каліграфічны малюнак у танцы. Як вы думаеце, чаму тэма каліграфіі такая актуальная ў сучаснай культуры Кітая?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Злучэнне танца і каліграфіі. Сучасны фотаздымак

### Творчая майстэрня

3. Дзякуючы каліграфіі ў Кітаі захавана іерагліфічная сістэма пісьма ў выглядзе кропак, прамых, нахіленых, ламаных і іншых лінейных формаў. Прыдумайце новы знак-сімвал у стылі кітайскіх іерогліфаў. Намалюйце яго гуашшу (пяром).

4. У Старажытным Кітаі сімвалы суправаджалі чалавека на працягу ўсяго яго жыцця. Кожны прадмет у творах кітайскіх майстроў глыбока сімвалічны. Падрыхтуйце ілюстраванае паведамленне на тэму «Сімволіка Кітая». Раскажыце, якія сімвалы вас асабліва ўразілі. Якія кітайскія сімвалы маюць дзяржаўнае значэнне? Якія з іх папулярныя ў сучаснай кітайскай культуры?

## § 17. Манументальнасць архітэктуры і скульптуры Старажытнага Кітая

На характар старажытнакітайскай архітэктуры паўплывалі складаныя прыродныя ўмовы, чаргаванне горных хрыбтоў Цянь-Шаня і Гімалаяў і прыморскіх раўнін, скалістых берагоў і рэк Хуанхэ, Янцзы.

Разгледзьце карту Кітая. Звярніце ўвагу на геаграфічнае становішча і прыродныя ўмовы краіны.

**Вялікая Кітайская сцяна.** Сярод горнага пейзажу на працягу некалькіх тысяч кіламетраў высіцца адно з самых велічных збудаванняў старажытнасці — *Вялікая Кітайская сцяна.* Па манументальнасці яе можна параўнаць з Вялікімі егіпецкімі пірамідамі.

Як і ў Старажытным Егіпце, будаўніцтва было вельмі маштабным. Сцяну будавалі адначасова ў некалькіх раёнах. Таму для будаўніцтва выкарыстоўвалі розныя матэрыялы. Дзесьці ўтрамбаваную зямлю абліцоўвалі цэглай. Дзесьці збудаванне выкладвалі з каменных пліт. Часткова ва ўзвядзенні сцяны нават выкарыстоўвалі фрагменты каменных гарадскіх сцен, створаных у папярэднія эпохі.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вялікая Кітайская сцяна (III ст. да н. э. — XVII ст. н. э.)

Для большай устойлівасці кітайскія дойліды прадбачліва пашырылі знізу гэта абарончае збудаванне. Па верхнім грэбні сцяны праклалі дарогу, шырыня якой дазваляла свабодна перамяшчацца не толькі калонам войскаў, але і калясніцам!

Каласальнае па памерах абарончае збудаванне адрозніваюць строгія геаметрычныя прапорцыі. Па ўсёй даўжыні рытмічна размешчаны масіўныя дазорныя вежы з невялікімі вокнамі і аркамі. Верхняя частка збудавання, якое цягнецца на тысячы кіламетраў, увенчана шырокімі зубцамі. Здаецца, быццам Вялікая Кітайская сцяна струменіцца лёгкай узорыстай стужкай па горных вяршынях і цяснінах. Гледзячы на рукатворны каменны цуд, які ўнікальна дапаўняе суровы ландшафт, лёгка адчуць прыцягальную сілу гісторыі.

Вялікая Кітайская сцяна ўражвае сваімі грандыёзнымі памерамі. Які эмацыйны водгук выклікала яна ў вас? Падзяліцеся ўражаннямі з аднакласнікамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тэракотавая армія. Статуі воінаў з пахавання імператара Цынь Шыхуандзі (III ст. да н. э.)

**Падземны палац і тэракотавая армія.** Адным з самых значных архітэктурных помнікаў Старажытнага Кітая з’яўляецца магільны склеп імператара Цынь Шыхуандзі́. У велізарным падземным палацы ля падножжа гары Ліньшань усё гаворыць пра вечнае жыццё, веліч уладара Паднябеснай і магутнасць Старажытнага Кітая.

З захаваных апісанняў і знойдзеных фрагментаў мы даведваемся, што ў пахаванні мелася мноства прыгожа аздобленых залаў, у адной з якіх быў пахаваны імператар. Лічыцца, што ў дэкоры галоўнай залы — магільнага склепа — узноўлены той свет, у якім некалі правіў Цынь Шыхуандзі. У выкладзенай на падлозе мазаіцы акрэслены сілуэты гор і ўзгоркаў. Сярод далін — звілістыя рэкі і моры. Столь падобная да нябёсаў, на якіх, нібы зоркі, пераліваючыся вясёлкавымі фарбамі, зіхацелі каштоўныя камяні і жамчужыны.

У ганаровай варце каля пахавання правіцеля стаяла шматтысячная *тэракотавая армія*! Дзіўна, што з абпаленай гліны ў натуральную велічыню былі створаны шматлікія пехацінцы, лучнікі, ваяводы, чыноўнікі і нават музыкі і артысты, якія забаўлялі імператара. Вобраз кожнага індывідуальны. Адрозніваюцца і выразы іх твараў, і погляды, і жэсты. З неверагоднай дакладнасцю перададзены і касцюм кожнага персанажа.

? Як вы думаеце, чаму ў пахаванні імператара была размешчана тэракотавая армія ў баявой гатоўнасці?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пагада Сун'юэ ля гары Суншань (VI ст.)

**Кітайскія пагады.** Сярод своеасаблівай кітайскай архітэктуры вылучаюцца па́гады. Іх пачалі ўзводзіць пад уплывам будызму, які распаўсюдзіўся ў Старажытным Кітаі. Гэтыя культавыя збудаванні прызначаліся для захавання будыйскіх рэліквій. Таму іх і называюць «вежамі скарбаў».

Кітайская пагада шмат'ярусная. Ярусы паслядоўна памяншаюцца кверху. Верхняя частка збудавання ўпрыгожана вежачкай з дзевяццю кольцамі, якія сімвалізуюць ідэю ўзыходжання да вышэйшай гармоніі.

Адна з найстаражытнейшых захаваных цагляных пагад у Кітаі — пагада Сун'юэ. Збудаванне адрозніваецца складнасцю і лёгкасцю архітэктурнай формы, арганічна ўпісанай у прыроднае асяроддзе. Пагаду можна сузіраць з любой адлегласці ў розны час сутак.

Кітайскія пагады — высокія збудаванні. Вышыня некаторых пагад складае 160 метраў. Але яны здаюцца лёгкімі і паветранымі. Разгледзьце пагаду. Падумайце, як кітайскія дойліды дасягнулі такога эфекту.

**Каменныя вароты.** Адным з традыцыйных відаў архітэктурных збудаванняў Кітая з'яўляюцца дэкаратыўныя вароты — Пайло́ў. Часцей за ўсё гэта каменныя вароты, упрыгожаныя раскошным разьбяным арнаментам, узводзілі ў Кітаі ў гонар правіцеляў, герояў, выбітных падзей. Пайлоў мелі трыумфальны характар, але ў той жа час не выглядалі цяжкімі. Эфект лёгкасці стваралі велізарныя пралёты, над кожным з якіх можна было сузіраць рэльефы. А вышэй — самастойныя дахі з вялікім вынасам і выгнутымі дагары краямі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пайлоў
у Шааліні
(V ст.)

Лічыцца, што калісьці ў Пекіне ўзвышалася амаль 60 дэкаратыўных арак. Цяпер такія мемарыяльныя вароты ўпрыгожваюць гарады, храмавыя комплексы, сельскія паселішчы, нагадваючы пра старажытныя традыцыі краіны. Пайлоў маюць сімвалічны сэнс, з'яўляючыся ўмоўнай архітэктурнай мяжой паміж мінулым і сучасным, якую можна свабодна перасекчы ў любым напрамку. Напрыклад, каб падняцца на святую гару Тайшань ці ўвайсці ў старажытны манастырскі комплекс Шаалінь, трэба абавязкова прайсці праз Пайлоў.

**Цікавы факт**

Сёння Пайлоў будуюць не толькі ў Кітаі, але і за яго межамі — пры ўваходзе ў кітайскія кварталы найбуйнейшых гарадоў свету.

Пайлоў — візітоўка Кітая. Падумайце, якое архітэктурнае збудаванне можа быць візітоўкай Беларусі.

У архітэктуры Старажытнага Кітая майстрам удалося гарманічна злучыць у вобразах такія якасці, як мужнасць, доблесць, адвага воіна і паэтычнасць, узвышанасць і вытанчанасць густу мірнага чалавека. Скульптурныя вобразы чалавека перадавалі яго цвёрды, рашучы, устойлівы характар і баявы дух.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Пытанні і заданні

1. Кітайская архітэктура — унікальная з'ява ў сусветнай культуры. Падумайце, у чым заключаецца яе своеасаблівасць. Ахарактарызуйце адзін з помнікаў архітэктуры Старажытнага Кітая, якія вам спадабаліся.

14 Кітайскую мастацкую культуру часта называюць канфуцыянскай. Сапраўды, вялікі кітайскі мудрэц Канфуцый аказаў значны ўплыў на мастацкую культуру. Як вы думаеце, у чым гэта было выражана? Знайдзіце адказ на дадатковай старонцы на кампакт-дыску.

2. Вялікую Кітайскую сцяну называюць «земляным драконам». Гэта невыпадкова. Паглядзіце, як кітайскі мастак XX стагоддзя У Гуаньчжу́н адлюстраваў у карціне «Вялікая сцяна» змеепадобныя абрысы, якія губляюцца ўдалечыні, самага грандыёзнага архітэктурнага збудавання Кітая. Раскажыце, якімі мастацкімі сродкамі ён гэта перадаў.



**У Гуаньчжун.** Вялікая сцяна (1986 г.)



Панарама Вялікай Кітайскай сцяны

## Творчая майстэрня

15 16 Выканайце праект-даследаванне на тэму «Шэдэўры кітайскага мастацтва». Дадайце ў ваш праект віды мастацтва, якія не былі апісаны ў параграфах, прысвечаных Кітаю.

Разгледзьце малюнкі на кампакт-дыску ў раздзеле «Мастацтва скрозь тысячы гадоў: Старажытны Усход». Да якіх культур гэтыя выявы адносяцца? Па якіх прыкметах вы гэта вызначылі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 4

# Атланты і карыятыды: мастацтва Старажытнай Грэцыі

...і толькі грэчаскаму мастацтву мы застаёмся вечна абавязаныя.

*Іага́н Гётэ*



**Ле́а фон Кле́нцэ.** Афінскі акропаль (1846 г.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 18. Мастацкая фантазія крыта-мікенскага мастацтва

Антычная культура — унікальная з'ява, якая заклала асновы еўрапейскай культуры. Яна прапанавала свету мастацкія творы, якія сталі ўзорам для пераймання на многія тысячагоддзі. Калыскай антычнай культуры была незалежная кры́та-міке́нская цывілізацыя.

Успомніце з урокаў гісторыі асноўныя гістарычныя падзеі, звязаныя з кры́та-міке́нскай цывілізацыяй.

**Мастацтва Крыта.** Мастацтва квітнеючага вострава было жыццярадасным і аптымістычным, таму што жыхары Крыта былі ўнутрана свабоднымі і адкрытымі. Гэта выяўлялася ва ўсіх відах мастацкай творчасці.

У архітэктуры пераважалі збудаванні, не адгароджаныя ад навакольнага свету глухімі, непрыступнымі сценамі. *Крыцкія палацы* ветліва расчыняліся вонкі шматлікімі праёмамі, лесвіцамі, тэрасамі. У адным з палацаў Крыта — Кно́скім палацы — шматлікія пакоі і залы злучаліся лесвіцамі і тэрасамі з пурпурна-чырвонымі калонамі рознай велічыні. Палац меў такую заблытаную планіроўку, што яго атаясамілі з легендарным Лабірынтам Мінатаўра.




Кноскі палац (XVI ст. да н. э.). Рэканструкцыя

Уважліва разгледзьце выявы Кноскага палаца. Якое ўражанне на вас зрабіў яго знешні і ўнутраны выгляд?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Гульня з быком. Фрэска з Кноскага палаца (XVI ст. да н. э.)



Дамы ў блакітным. Фрэска з Кноскага палаца (XV ст. да н. э.)

Асаблівасцю палацавай архітэктуры Крыта было выкарыстанне і светлавых студняў для асвятлення ўнутранай прасторы. Невялікія, але светлыя і ўтульныя памяшканні Кноскага палаца ўпрыгожвалі яркія *фрэскі*. На іх мы не сустрэнем сюжэтаў узброенай барацьбы, выяў суровых багоў ці свету нябожчыкаў, як у іншых старажытных культурах.

На фрэсцы, прысвечанай гульні з быком, можна разгледзець і загадкавы рытуал, звязаны з культам дзікіх і неўтаймаваных сіл прыроды, і спартыўнае прадстаўленне. Малады ўдзельнік пераскоквае праз спіну чырвонага быка з дзіўнай лёгкасцю і ўпэўненасцю. Дзве вытанчаныя акрабаткі дапамагаюць яму ў ажыццяўленні яго планаў. Мастак змог перадаць свабоду, непасрэднасць, нястрымны запал юнацкасці. На другой фрэсцы намаляваны дамы ў яркіх элегантных уборах, з заплеценымі косамі і локанамі, якія струменяцца, нібы змейкі. У іх усмешках, лёгкіх і зграбных рухах адчуваюцца радасць, какецтва.

? Чым адрозніваюцца сюжэты фрэсак Кноскага палаца і фрэсак Старажытнага Егіпта?

У керамічных вырабах адной з галоўных тэм была прыгажосць навакольнага свету і прыроды. Старажытныя майстры спрабавалі яе ўвасобіць у кераміцы Кама́рэс, якая атрымала сваё найменне па назве паселішча, у пячоры якога яна была знойдзена. Майстры



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

выказалі ў ёй сваё захапленне перад разнастайнасцю і багаццем прыроды, якую яны абагаўлялі. Уражваюць арганічнымі формамі і самі пасудзіны, і роспісы на іх. Фантазійныя кветкавыя і спіральныя матывы наносілі на чорны матавы фон вырабаў белай, аранжавай ці чырвонай фарбай.

Не менш папулярная была *кераміка з марской тэматыкай*. Керамічныя вырабы з абцякальнымі формамі ўсеяны ракавінкамі, караламі, дэльфінамі, васьміногамі, якія выгінаюцца. У такіх малюнках адчуваецца ўласцівае мастацтву Крыта свабоднае творчае мысленне, не скаванае канонамі.



Ваза ў стылі Камарэс (II тыс. да н. э.)



Ваза з марской тэматыкай (мяжа XVI—XV стст. да н. э.)

Якія сродкі выразнасці робяць кераміку вострава Крыт асаблівай?

**Мастацтва Мікен і Цірынфа.** Культура, якая папярэднічала грэчаскай, развівалася не толькі на астравах Міжземнага мора, але і ў гарадах-дзяржавах Ціры́нфе і Міке́нах. Там дагэтуль захаваліся магутныя *крэпасці*, збудаваныя плямёнамі мужных ахейцаў. Складзеныя з велізарных, груба апрацаваных каменных глыб, яны адрозніваюцца



Ільвіныя вароты ў Мікенах (XIV ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Ваза з воінамі, Мікены (XIII ст. да н. э.)



Залатая «Маска Агамемнана», Мікены (XVI ст. да н. э.)

ад крыцкіх пабудоў грознай суровасцю. Пазней грэкі назавуць гэту архітэктуру «цыклапічнай». Яны меркавалі, што ўзвесці падобнае маглі толькі міфічныя аднавокія гіганты — цыклопы.

Для *роспісаў* у Цірынфе і асабліва ў Мікенах характэрны сюжэты, звязаныя з вайной ці паляваннем. Іх галоўны герой — мужчына-воін. І нават жаночыя выявы знаходзіліся пад уплывам гэтага вобраза. Моцна разгорнутыя шырокія плечы, рашучы профіль з цяжкім падбародкам... У мікенскіх выявах няма далікатнасці і вытанчанасці крыцкага мастацтва.

Ахейцы былі вельмі ваяўнічымі плямёнамі. Менавіта яны ў XIII стагоддзі да н. э. заваявалі Трою — багаты горад-дзяржаву ў Малой Азіі. У канцы XIX стагоддзя на тэрыторыі цяперашняй Турцыі навукоўцы раскапаюць спаленую Трою, а ў Мікенах знойдуць грабніцы ахейскіх правадыроў. Легенда пра багатыя на золата Мікены пацвердзіцца багаццем залатых прадметаў, знойдзеных у пахаваннях.

Самымі цікавымі знаходкамі акажуцца *залатыя пахавальныя маскі*. Мікенскія выявы адрозніваюцца ад твораў крыцкіх мастакоў большым схематызмам. Але ў дадзеным выпадку стрыманасць выканання толькі ўзмацняе мастацкі эфект. Бровы, вусы і барада мікенскага правадыра перададзены ўмоўнымі насечкамі. Шчыльна самкнутыя павекі і вусны прачаканены адной рэзкай лініяй. Смерць завастрыла кожную рысу на твары мужнага ахейца. Але нават яна не змагла пазбавіць яго выраз грознай, ваяўнічай сілы. Навукоўцы назвалі гэты залаты вобраз імем цара Мікен — Агамемнанам.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Падумайце, у чым заключаецца своеасаблівасць мастацтва гарадоў-дзяржаў Мікен і Цірынфа.

Крыта-мікенская цывілізацыя адрознівалася ад усіх старажытнаўсходніх культур творчай свабодай і мастацкай фантазіяй. Гэта знайшло адлюстраванне ў планіроўцы архітэктурных збудаванняў, у сюжэтах роспісаў, у формах керамічных вырабаў. Удзячныя грэкі назаўжды захавалі памяць пра гэту яскравую і самабытную культуру.

## Пытанні і заданні

Жыхары Крыта чула рэагавалі на прыгажосць навакольнага свету. Разгледзьце на старонках параграфа і на кампакт-дыску фрэскі з Кноскага палаца. З дапамогай якіх сродкаў мастакам атрымалася ўвасобіць у крыцкіх роспісах багацце прыроднага свету?

1. Рускі паэт XX стагоддзя Валерый Брýсаў прысвяціў адзін з твораў крыцкай кераміцы. Прачытайце ўрывак верша. На якія асаблівасці ваз звярнуў увагу паэт?

...Как исхищрённы их узоры,
Ласкающие сладко взоры:
В запутанности линий гнутых,
То разомкнутых, то сомкнутых,
Как много жизни претворённой, —
Пресыщенной и утомлённой
Холодным строем красоты,
В исканьях новой остроты!
И вот, причудливо согнуты,
Выводят щупальцами спруты
По стенкам нежные спирали;
Плывут дельфины на бокале,
И безобразны, и прекрасны...

*Валерий Брюсов.*
*«Эгейские вазы» (отрывок)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Міф пра тое, як Тэсей перамог Мінатаўра, — адзін з найбольш захапляльных старажытнагрэчаскіх міфаў. Азнаёмцеся з яго зместам на дадатковай старонцы на кампакт-дыску. У інфармацыйных крыніцах паглядзіце анімацыйны фільм А. Г. Сняжко-Блоцкай «Лабірынт. Подзвігі Тэсея». Растлумачце, як гісторыя Тэсея і Мінатаўра звязана з Кноскім палацам.

### Творчая майстэрня

2. Падрыхтуйце прэзентацыю на тэму «Лабірынты Кноскага палаца», паказаўшы асаблівасці знешняга выгляду і інтэр'ера гэтага архітэктурнага збудавання. Для гэтага можна выкарыстоўваць розныя крыніцы: разнастайнасць версій пра стварэнне і гібель Кноса, міфы пра крыцкага цара Мінаса, пра Лабірынт Мінатаўра. Уключыце ў прэзентацыю творы мастацтва, з якімі вы пазнаёміліся.

## § 19. Ордарная сістэма ў старажытнагрэчаскай архітэктуры

Старажытнагрэчаская архітэктура адрозніваецца разнастайнасцю збудаванняў культавага і грамадскага прызначэння. Да цяперашняга дня не вядома дзвюх аднолькавых пабудоў. Кожнае збудаванне — ад невялікіх храмаў да бібліятэк і тэатраў — мела індывідуальнае аблічча. Вялікую ролю ў гэтым адыграла вынаходства грэкаў, якое атрымала назву «ордар».

**Што такое ордар.** У аснову архітэктурнага ордара пакладзена стоечна-бэлечная канструкцыя, якая складаецца з вертыкальнай калоны і гарызантальнай бэлькі. Дойліды асаблівым чынам — *па-мастацку* — прапрацавалі кожны элемент, кожную дэталь ордара. Вертыкальная калона з'яўляецца апорнай канструкцыяй (якая падтрымлівае), а бэлька — перакрываючай канструкцыяй (якую падтрымліваюць).



Ордар: 1 — вертыкальная апора (калона), 2 — гарызантальнае перакрыцце (бэлька)

Ордар узнік як практычная неабходнасць пры будаўніцтве каменных храмаў. Бо ў адрозненне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ад жылых пабудоў храм узводзілі на стагоддзі. Жыллё багоў павінна было, з аднаго боку, быць трывалым і надзейным, а з другога — уражваць маштабамі і ўбранствам. Таму грэкі з матэматычнай дакладнасцю, да драбнюткіх дэталяў, узгаднялі ўсе элементы канструкцый і дэкору збудавання.

Нягледзячы на адзіную схему, грэчаскія архітэктары здолелі распрацаваць тры розныя ордары. Кожны з іх меў свае асаблівасці. Канструкцыя ва ўсіх ордараў была аднолькавая, а прапорцыі, формы і дэкор элементаў адрозніваліся.

Як вы разумееце выраз «архітэктурны ордар»? Назавіце асноўныя элементы старажытнагрэчаскага ордара. Якое яго галоўнае прызначэнне?

**Ордарная сістэма.** З’яўленне ордарнай сістэмы найперш звязана з пераасэнсаваннем і «пераносам» канструкцый з драўлянага дойлідства ў каменную архітэктуру.

Самым старажытным ордарам з’яўляецца *дарычны*. Сваю назву ён атрымаў ад імя дарыйскіх плямёнаў. Дарыйцы пачалі ўзводзіць храмы і іншыя збудаванні, у якіх імкнуліся ўвасобіць гармонію прыгажосці і практычнасці архітэктуры — асноўную ідэю старажытнагрэчаскай культуры.



Прыклад дарычнага ордара. Храм Геры-1 у Пе́стуме (сярэдзіна VI ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Храм, збудаваны ў дарычным стылі, адрозніваецца масіўнасцю, прастатой і лаканічнасцю дэкаратыўных дэталяў. Навукоўцы звязваюць гэта з ідэяй мужнасці і ўстойлівасці старажытных грэкаў. Не выпадкова дарычны ордар называюць «мужчынскім».

Пазней узнік *іанічны ордар*. Сваю назву ён атрымаў ад плямёнаў іанійцаў, якія засялялі адну з абласцей Старажытнай Грэцыі — Іонію. Іанічны ордар адрозніваецца ад дарычнага большай лёгкасцю, пластычнасцю і багаццем дэкаратыўных дэталяў. У складнасці яго формаў навукоўцы ўбачылі «жаноцкасць».



Прыклад іанічнага ордара. Храм Нікі Аптэрас у Афінах (V ст. да н. э.)



Прыклад карынфскага ордара. Храм Зеўса ў Афінах (VI ст. да н. э. — II ст. н. э.)

Пошук новых ідэй у архітэктуры прывёў да з'яўлення пазнейшага ордара — *карынфскага*. Яго стваральнікам лічаць скульптара з горада Кары́нфа.

Карынфскі ордар злучыў у сабе ўсё лепшае, што было ў папярэдніх ордарах: канструктыўнасць, лёгкасць і грацыёзнасць. Не выпадкова яго называюць «дзявоцкім» ордарам.

Карынфскі ордар надае архітэктуры ўрачыста-трыумфальны характар. Таму ён лічыцца эталонам прыгажосці ў еўрапейскім дойлідстве. Карынфскі ордар атрымаў шырокую вядомасць і стаў самым запатрабаваным у наступныя эпохі: у рымскай культуры, культуры эпохі Адраджэння, у мастацтве XIX стагоддзя.

Як вы думаеце, якую мастацкую каштоўнасць уяўляе архітэктурны ордар?

**Як уладкаваны ордар.** Галоўнымі элементамі архітэктурнага ордара з'яўляюцца *аснова, апора* і *перакрыцце*. Пры нязменнасці гэтых элементаў усе ордары атрымалі свае мастацкія асаблівасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

<table>
<tr><th>Дарычны ордар</th><th>Іанічны ордар</th><th>Карынфскі ордар</th></tr>
<tr><td>
</td><td>
</td><td>
</td></tr>
<tr><td colspan="3">1. База — ніжняя частка калоны (чаргаванне выступаючых валікаў і прарэзаных кольцаў, якія акружаюць калону).<br>2. Ствол калоны — сярэдняя частка (упрыгожваецца падоўжнымі жалабкамі, якія надаюць калонам стройнасць).<br>3. Капітэль — верхняя частка калоны (дэкаратыўна аформлена).<br>4. Антабле́мент — верхняя частка стоечна-бэлечнай канструкцыі.</td></tr>
<tr><td>Няма базы</td><td>База ў выглядзе прыступак</td><td>База ў выглядзе прыступак</td></tr>
<tr><td>Ствол калоны звужаецца знізу ўверх, як ствол дрэва</td><td>Ствол калоны больш вытанчаны ў параўнанні з дарычным, толькі злёгку расшыраецца да базы</td><td>Ствол калоны найбольш вытанчаны і элегантны з усіх</td></tr>
<tr><td>Капітэль мае простую форму, якая складаецца з дзвюх геаметрычных фігур</td><td>Капітэль адрозніваецца большай раскошай. Яе ўпрыгожваюць дзве валю́ты — завіткі</td><td>Капітэль адрозніваецца асаблівай раскошай. Мае выгляд кошыка з двума радамі лістоў, падзеленых некалькімі сцёбламі з валютамі</td></tr>
<tr><td>Антаблемент мае разнастайны дэкор. Упрыгожваецца рэльефамі, падзеленымі вертыкальнымі жалабкамі</td><td>Антаблемент шматступеньчаты. Можа ўпрыгожвацца дэкаратыўнай стужкай з рэльефамі</td><td>Антаблемент шматступеньчаты, але больш складаны ў параўнанні з іанічным. Упрыгожваецца дробнымі ляпнымі дэталямі</td></tr>
</table>



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнайце асаблівасці дарычнага, іанічнага і карынфскага ордараў. У чым заключаюцца іх падабенства і адрозненне?

Асаблівую прыбранасць і спецыфічны характар архітэктурнаму ордару надавала *капітэ́ль*. У дарычным ордары капітэль была без пышнага дэкору. У іанічным ордары капітэль мела два стромкія завіткі, якія па форме нагадвалі ку́чары. Капітэль у карынфскім ордары здзіўляла наборам дэкаратыўных элементаў: дэталёва «вылепленае» лісце ў некалькі радоў, валюты і рэльефныя арнаментальныя палосы.



Капітэль дарычнага ордара



Капітэль іанічнага ордара



Капітэль карынфскага ордара

Выканайце схематычны малюнак аднаго са старажытнагрэчаскіх ордараў (ці капітэлі). Пакажыце ў малюнку спецыфічныя асаблівасці ордара (ці капітэлі).

Ордарная сістэма, прапанаваная грэкамі, лягла ў аснову збудаванняў не толькі Старажытнай Грэцыі, але і іншых цывілізацый. Ужыванне ордара ў архітэктуры дазволіла па-мастацку асэнсаваць каменныя канструкцыі. У наступныя эпохі дойліды ўсяго свету звярталіся да грэчаскага ордара як да ўзору.

## Пытанні і заданні

1. Архітэктурны ордар складаецца з мноства элементаў. Але ён не дапускае нічога лішняга. Усе элементы канструкцыі і дэкору знаходзяцца на строга вызначаным месцы. Чаму, на ваш погляд, ордарная сістэма звязваецца з парадкам? Аргументуйце сваю пазіцыю.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Азнаёмцеся на дадатковай старонцы на кампакт-дыску з услаўленымі збудаваннямі Старажытнай Грэцыі, у якіх ужываўся ордар. Кожнае з іх не падобнае на іншае. Як вы думаеце чаму? Абгрунтуйце сваю здагадку.

Знайдзіце ў даведачнай літаратуры больш падрабязную інфармацыю пра антаблемент. З якіх элементаў ён складаецца? Якія з гэтых элементаў вам знаёмыя?



Будынак Галоўпаштамта ў Мінску, Беларусь (1949—1953 гг.)

### Творчая майстэрня

2. У якіх збудаваннях Беларусі вы сустракалі архітэктурны ордар? Назавіце адно збудаванне Беларусі (вашага рэгіёна, вобласці), у якім выкарыстаны адзін з ордараў. Складзіце пра гэта збудаванне невялікае вуснае апавяданне.

## § 20. Грэчаскі храм – ідэал гармоніі і прыгажосці ў архітэктуры

Галоўным тыпам збудаванняў у Старажытнай Грэцыі быў храм — прыстанак багоў. У яго архітэктуры ўвасабляліся самыя яркія мастацкія ідэі. Для будаўніцтва храмаў выкарыстоўвалі каштоўныя матэрыялы, якія нярэдка дастаўлялі з розных гарадоў мацерыка і нават з-за мора.

**Якім быў старажытнагрэчаскі храм.** Грэкі лічылі храм найвышэйшай духоўнай, мастацкай і матэрыяльнай каштоўнасцю. Ён быў свайго роду скарбніцай мастацтва. У ім таксама захоўвалася гарадская казна.

Узводзілі храмы ў цэнтры гарадской плошчы на адкрытай прасторы. Фасад храма быў звернуты да ўсходу, да ўзыходзячага сонца. Унутры ставілі статую бажаства, у гонар якога ён быў пабудаваны. Алтар для ахвярапрынашэнняў спачатку таксама размяшчалі


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўсярэдзіне храма. З часам яго сталі ладзіць перад уваходам у дом багоў, каб у святых рытуалах маглі браць удзел усе грамадзяне. Бо ўваходзіць у старажытнагрэчаскі храм мелі права толькі жрацы і іх памочнікі.

Найбольшае распаўсюджанне атрымаў тып храма «перы́птэр» — прамавугольнае збудаванне, абнесенае па перыметры калонамі. Перыптэры адрозніваліся паміж сабой маштабам і колькасцю калон, а таксама дэталямі ўбранства.

Старажытнагрэчаскі храм лічаць узорам прыгажосці ў архітэктуры. Як вы думаеце чаму?

**Афінскі акропаль.** Галоўныя храмы гарадоў-дзяржаў будаваліся ў акро́палі — верхнім горадзе. Адначасова акропаль быў і самым умацаваным месцам: тут падчас ваенных дзеянняў хаваліся гарадскія жыхары. Размяшчаўся верхні горад на ўзвышшы. Ніжні горад — асноўнае паселішча грамадзян Элады — знаходзіўся ля падножжа ўзгорка, вакол акропаля.

Уяўленне пра тое, як выглядаў верхні горад у перыяд росквіту старажытнагрэчаскага дойлідства, дае архітэктура Афінскага акропаля. Пабудаваны на скалістай вяршыні ў асяроддзі трох узгоркаў і марской стыхіі, ён і дагэтуль трыумфуе над забудовай, якая ляжыць ля падножжа. Архітэктурныя збудаванні Афінскага акропаля сталі



Узор перыптэра.
Храм Геры-2
(ці храм Пасейдона)
у Пестуме
(V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Афінскі акропаль (V ст. да н. э.)

ўвасабленнем гераічнасці і адвагі воінаў, пераможнай славы, сілы і магутнасці Старажытнай Грэцыі. Збудаванні Афінскага акропаля з'яўляюцца помнікамі сусветнай спадчыны.

З якімі архітэктурнымі збудаваннямі Афінскага акропаля вы пазнаёміліся на ўроках мастацтва, гісторыі раней? Раскажыце пра іх.

**Прапілеі.** Уваход у антычны акропаль ажыццяўляўся праз Прапіле́і — парадныя вароты. Праз іх на святую тэрыторыю праходзілі святочныя шэсці ў гонар багіні Афіны. Рухаючыся ў павольным рытме, знатныя асобы неслі дары і ахвярапрынашэнні заступніцы горада.

Манументальныя архітэктурныя формы Прапілеяў, якія не мелі дэкаратыўных празмернасцяў, стваралі адчуванне святочнай атмасферы і ў той жа час настройвалі ўдзельнікаў працэсіі на свяшчэнны абрад. Шэсць масіўных калон дарычнага ордара,



**Архітэктар Мнесі́кл.**
Прапілеі (V ст. да н. э.).
Графічная рэканструкцыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

нібы каменныя вартавыя, ахоўвалі святое месца. Цэнтральны праём быў значна большым і дазваляў галоўным удзельнікам абраду праехаць конна.

Чаму, на ваш погляд, Прапілеі атрымалі ўрачыстыя і масіўныя формы? Якую ролю адыгрывала гэта збудаванне ў ансамблі Афінскага акропаля?

**Парфенон — галоўны храм Афінскага акропаля.** Парфенон быў пабудаваны ў гонар Афіны Парфе́нас (Афіны Дзевы). Усярэдзіне храма знаходзілася яе 12-метровая статуя, выкананая скульптарам Фі́дыем. Прыгожая багіня, прыбраная ў доўгае залатое адзенне, у высокім шлеме, са шчытом і дзідай у руках, уражвала моцай і велічнасцю.

**Цікавы факт**

Залатыя дэталі статуі Афіны важылі больш за тону! Паводле парады Перыкла, усе яны былі зробленыя здымнымі. Кожныя чатыры гады іх вага правяралася, бо адзенне багіні ўяўляла сабой залатую казну дзяржавы.

Як «скарб» Афінскага акропаля Парфенон захапляў сваімі формамі, маштабам і дэкорам. Храм быў пабудаваны на вяршыні скалы. Гэта вылучала яго з усяго ансамбля Афінскага акропаля. Па планіроўцы Парфенон — адзін з самых яркіх узораў дарычнага перыптэра. Для яго збудавання дойліды І́кцін і Калікра́т



**Архітэктары Ікцін і Калікрат.** Парфенон (V ст. да н. э.)



Фрагмент фрыза Парфенона (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

выкарыстоўвалі белы мармур, які надаў архітэктуры прыбранае аблічча.

Важную ролю ў архітэктуры храма адыгрывала і скульптура. Мастакі пад кіраўніцтвам скульптара Фідыя захавалі ў рэльефах міфалагічныя сюжэты, сцэны падрыхтоўкі да здзяйснення свяшчэннага абраду ў гонар Афіны і само параднае шэсце. Тут можна было бачыць і спрэчку багіні з Пасейдонам, і фігуру Дыяніса, і загадкавых кентаўраў, а таксама вершнікаў і людзей, якія нясуць кошыкі з дарамі… Каменны летапіс жыцця афінян выглядаў святочным і гарманічным.

Як вы думаеце, чаму рэльефы былі размешчаны не толькі ўсярэдзіне, але і знадворку храма?

**Чым незвычайны Эрэхтэён.** Скульптура не заўсёды служыла толькі ўбранствам храмаў Старажытнай Грэцыі. У Эрэхтэёне, адным з услаўленых на ўвесь свет збудаванняў Афінскага акропаля, замест калон дойліды выкарыстaлі скульптуры дзяўчын — кор (ці, як іх называюць інакш, карыятыд).

Шэсць юных дзяўчын у доўгіх адзеннях пакорліва застылі пад цяжарам ношы. Злёгку нахіліўшы галовы, яны накіравалі погляд удалячынь, быццам вітаючы рэдкіх наведвальнікаў.



Эрэхтэён (V ст. да н. э.)



Порцік карыятыд, Эрэхтэён (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Эрэхтэён быў пабудаваны ў гонар Афіны, Пасейдона і міфічнага цара Афін — Эрэхтэ́я. Магчыма, міф пра спрэчку Афіны і Пасейдона паслужыў асновай такой складанай планіроўкі храма, якой раней у Старажытнай Грэцыі не сустракалася.

Справа ў тым, што Афіна і Пасейдон супернічалі ў тым, хто прынясе гораду больш карысці. Пасейдон у спрэчцы стукнуў аб скалу акропаля трызубцам, і ў гэтым месцы ўтварылася «*Эрэхтэ́ева мора*». Афіна, у сваю чаргу, уваткнула дзіду ў скалу, і зброя ператварылася ў аліўкавае дрэва. Эрэхтэй вырашыў, што дар Афіны больш дабратворны для людзей, і прысудзіў ёй перамогу.

Мудрыя грэкі вырашылі, што для горада карысныя дары абодвух багоў. У іх гонар яны пабудавалі ўсярэдзіне храма Эрэхтэёна два свяцілішчы — Афіны і Пасейдона. У адным з памяшканняў у падлозе была зроблена адтуліна, скрозь якую віднеўся след Пасейдонава трызубца. Тут жа знаходзілася і студня з марской вадой. У другім памяшканні расло аліўкавае дрэва.

19 Разгледзьце на дадатковай старонцы план-схему Афінскага акропаля. Знайдзіце на ёй усе помнікі архітэктуры, з якімі вы пазнаёміліся ў параграфе.

Храмы Старажытнай Грэцыі з іх стройнымі калонамі, урачыстымі рытмамі, матэматычна дакладнымі прапорцыямі ствараліся дойлідамі як узор вытанчанасці і прыгажосці. У іх вобразах знайшлі выражэнне галоўныя ідэі старажытных грэкаў — спалучэнне логікі і паэтычнасці, далікатнасці і практычнасці. Ідэальныя формы храмаў Старажытнай Грэцыі сталі прыкладам для пераймання ў архітэктуры будучых стагоддзяў.

### Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце архітэктурны ансамбль Афінскага акропаля. Чаму гэты комплекс з'яўляецца помнікам сусветнай архітэктуры? Назавіце асноўныя збудаванні, якія, на ваш погляд, вызначаюць яго аблічча.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гомельскі абласны драматычны тэатр, Беларусь (1954 г.)



2. Якое са збудаванняў Афінскага акропаля вам запомнілася больш за ўсё? Апішыце гэта збудаванне, звярнуўшы ўвагу на колькасць калон на фасадах, асаблівасці архітэктурнага ордара, дэкор.

3. У архітэктуры старажытнагрэчаскіх храмаў ужывалася ордарная сістэма. У храме Эрэхтэён дойліды не проста выкарыстоўвалі класічныя элементы ордара, а прыўнеслі ў яго новыя ідэі. У чым заключаліся змены?

### Творчая майстэрня

Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах 5—6 збудаванняў розных эпох, у аснове якіх ляжаць элементы старажытнагрэчаскага храма, як, напрыклад, у Гомельскім абласным драматычным тэатры. Падрыхтуйце пра гэтыя збудаванні невялікую прэзентацыю, ахарактарызаваўшы такія элементы.

## § 21. Вобраз чалавека ў скульптуры Старажытнай Грэцыі

Старажытнагрэчаскія майстры ўвесь час шукалі ідэальны вобраз чалавека і сродкі для яго ўвасаблення ў творах мастацтва. Складаныя і супярэчлівыя пошукі грэкаў больш за ўсё выявіліся ў скульптуры.

**Старажытнагрэчаскі ідэал чалавека.** Дасканалы вобраз чалавека грэчаскія майстры супастаўлялі з вобразам несмяротнага і вечна маладога бога. У такім ідэальным вобразе выяўлялася ідэя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

юнацкасці, непасрэднасці, натуральнай прыгажосці. Вышэйшым дасягненнем ідэалу чалавека ў мастацтве Антычнасці сталі выявы маладых, добра складзеных юнакоў і дзяўчын у натуральных паставах.

За ўзор грэчаскія мастакі бралі *ідэальныя прапорцыі чалавечага цела*. Дасканалая форма ў скульптуры адпавядала такім класічным правілам выявы, як *мера, раўнавага, прастата*.

Ахарактарызуйце грэчаскі ідэал прыгажосці на прыкладзе адной са скульптур, прадстаўленых у параграфе.

**Пошукі прыгажосці ў старажытнагрэчаскай скульптуры.** Ад работы да работы мастакі імкнуліся ўдасканальваць выяву чалавека. Гэта і прывяло да стварэння недасяжных твораў, дзе прапорцыі чалавечага цела адлюстраваны ідэальна.

20 Пачатак шляху адбіўся ў мармуровых статуях выдатных юных дзеў — кор. Адна з пяшчотных кор уяўляе сабой прыклад незвычайнай мяккасці скульптурнага вобраза. Валасы яе прычоскі, складкі адзення лёгка і трапятліва перацякаюць і злучаюцца адно з адным. Круглявы твар дзяўчыны ўпрыгожвае далікатная ўсмешка.


Дэльфійскі вознік (V ст. да н. э.)


Статуя коры (VI ст. да н. э.)


Масхафор (Чалавек, які нясе цяля) (VI ст. да н. э.)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З часам фігурам сталі надаваць жыццёвыя паставы і рухі, і яны «ажылі» яшчэ больш. У скульптуры «Масхафор» на твары чалавека, які нясе цяля, таксама свеціцца цёплая ўсмешка. Масхафор асцярожна трымае жывёлу за капытцы, і цяля даверліва туліцца да яго. Чалавек адлюстраваны ўжо не такім статычным і адасобленым ад рэальнасці, як вытанчаныя коры. Можна сказаць, што ў гэтым творы праявіліся першыя спробы перадаць настрой і затоеныя пачуцці.



**Леахар.** Артэміда з ланню (IV ст. да н. э.)

Разгледзьце выявы коры і Масхафора. Як скульптары выразілі сваё стаўленне да персанажаў?

**Божаствы ў старажытнагрэчаскай скульптуры.** Асаблівае стаўленне ў старажытных грэкаў было да выявы багоў. У творах мастацтва божаствы падобныя на людзей — не толькі сваім аблічам, але і пачуццямі.



**Праксіцель.** Гермес з дзіцем Дыянісам (IV ст. да н. э.)

Скульптура «Артэміда з ланню» з’яўляецца бездакорным творам скульптара Леаха́ра. Перад намі — сапраўдны абаронца жывёл і птушак. Пра гэта сведчаць устрывожаны позірк і жэст рукі, якой яна далікатна дакранаецца да спалоханай маладой лані. Скульптар любуецца асаблівай чароўнасцю і прывабнасцю антычнай багіні, якая ахоўвае ўсё жывое і безабароннае.

Скульптар Праксі́цель адлюстраваў прыгажуна Гермеса — пасланца багоў — з немаўлём Дыянісам. Праксіцелю ўдалося ўвекавечыць шчаслівае імгненне жыцця спадарожнікаў. Тэма светлай радасці і шчырасці пачуццяў была важнай для людзей антычнасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнайце выявы Масхафора і Артэміды. Апішыце, як памянялася ўяўленне грэкаў пра ідэал прыгажосці.

**Скульптурны вобраз чалавека.** Грэчаскія скульптары ўвасаблялі не толькі вобразы ўсёмагутных і мудрых багоў і герояў, але і вобразы жыхароў Грэцыі.

*Дыскабол* Мі́рана — гэта першая ў гісторыі скульптуры ўдалая спроба перадаць у нерухомай статуі эфект руху.

Сярод старажытнагрэчаскіх скульптараў Міран лічыўся найдасканалейшым майстрам ва ўменні адлюстроўваць цела чалавека ў момант найвышэйшага напружання сіл. Скульптар паказаў кідальніка дыска за імгненне да кідка. Дэталёва прапрацаваная мускулатура яго цела зачароўвае сваёй дасканаласцю. Тулава юнака пругка нахілена і адначасова павернута вакол сваёй восі. Шырокі размах рук утварае падабенства нацягнутага лука, з якога, здаецца, вось-вось вырвецца і паляціць страла.

Ва ўнікальнай кампазіцыі старажытнагрэчаскіх скульптараў адлюстравана смяротная барацьба *траянскага жраца Лаакаона і яго сыноў* са змеямі. Фігура Лаакаона — магутная, па-атлетычнаму дасканалая. Ён здольны разарваць любыя аковы. Але, нягледзячы на гэта,



**Міран.** Дыскабол (V ст. да н. э.)



**Агеса́ндр, Палідор, Афінадор.** Лаакаон і сыны (I ст. да н. э.)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Лаакаон знаходзіцца ў роспачы і не можа супрацьстаяць фатальным сілам. Яго юныя сыны таксама ўспрымаюцца нямоглымі ахвярамі змяіных «абдымкаў».

Скульптура «Дыскабол» у старажытных грэкаў выклікала ўсеагульнае захапленне. Але галоўнае — яна на стагоддзі ўзвысіла спартыўную тэматыку ў мастацтве. Якія яшчэ скульптуры з вобразамі атлетаў вы ведаеце?

**Старажытнагрэчаскі рэльеф.** Скульптура Старажытнай Грэцыі вобразна раскрывала ідэю важных падзей у краіне — стварэння храмаў, спартыўных падзей, правядзення свят у гонар багоў. А рэльефныя выявы на працягу некалькіх сотняў метраў «расказвалі» гісторыі жыцця старажытных грэкаў. Таму скульптурныя рэльефы размяшчалі ў найбольш значных і бачных частках будынкаў.

Зірніце на ўрачыстае шэсце афінскіх дзяўчын на Акропаль у дзень свята заступніцы горада. Яны спакойныя і стрыманыя. Лёгкія складкі на іх адзенні струменяцца і падкрэсліваюць мерную хаду.

У Старажытнай Грэцыі былі распаўсюджаны і *рэльефныя выявы на надмагільных стэлах*. У такіх рэльефах услаўлялася дасканаласць ідэальнага чалавека. Адна з самых знакамітых грэчаскіх стэл



Стэла Гегесó. Служанка і пані (IV ст. да н. э.)



Панафінейскае шэсце. Фрагмент рэльефу (пад кіраўніцтвам Фідыя) (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прысвечана афінянцы па імені Гегесó. Па традыцыі нябожчыкаў адлюстроўвалі сядзячымі на крэслах у адрозненне ад жывых сучаснікаў, што прыходзілі іх наведваць. Мы бачым ужо датычную да вечнасці жанчыну, якая адышла ад рэальнасці, паглыбілася ў сябе. Мастаку ўдалося перадаць настрой ціхага элегічнага суму. Бо ў такой мемарыяльнай тэме былі недарэчныя празмерная драматызацыя і гаротны смутак.

Як вы думаеце, чаму вобраз чалавека ў старажытнагрэчаскім мастацтве стаў цэнтральным?

Мастацтва старажытных грэкаў найперш прыцягвае сваёй верай у чалавека. Бо ў цэнтры ўвагі мастакоў — ідэальны вобраз чалавека, прыгожага ў любых сваіх праявах. Менавіта грэкі ў выяве чалавека стварылі эталоны, на якія дагэтуль раўняецца сусветная культура.

### Пытанні і заданні

1. Што новага пра жыццё старажытных грэкаў вы даведаліся з твораў антычнай скульптуры, прадстаўленых у параграфе і на кампакт-дыску?

Падбярыце на старонках вучэбнага дапаможніка і ў іншых інфармацыйных крыніцах творы старажытнагрэчаскага мастацтва, якія перадаюць розныя эмацыянальныя станы чалавека. Ахарактарызуйце сродкі мастацкай выразнасці, пры дапамозе якіх гэтыя станы перададзены.

### Творчая майстэрня

У Пергамскім храме была знойдзена знакамітая выява бітвы багоўалімпійцаў з гігантамі — больш за сотню фігур. Іх барацьба бясконцая. У персанажаў на тварах адлюстраваны боль, пакута і адначасова мужнасць і прыгажосць. Разгледзьце выяву багоў на кампакт-дыску. Што, на ваш погляд, збліжае вобразы рэльефу Пергамскага алтара са скульптурай «Лаакаон і сыны»? Складзіце пра гэта невялікае паведамленне.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 22. Керамічныя вырабы Старажытнай Грэцыі

Ні ў адной культуры свету мы не сустрэнем такой разнастайнасці формаў керамікі, якая існавала ў старажытных грэкаў. Найперш грэкі праявілі свой талент у *вазапісе* — мастацтве роспісу керамічных пасудзін.

**Разнастайнасць формаў керамічнага посуду.** У культуры Старажытнай Грэцыі існавала такая колькасць формаў посуду, што недасведчанаму чалавеку цяжка адразу разабрацца ў яе назвах.

Сярод грэчаскага посуду былі і масіўныя, ёмістыя пасудзіны дарычнага тыпу, і лёгкія, вытанчаныя вырабы іанічнага тыпу.

Можна вылучыць мноства відаў старажытнагрэчаскіх пасудзін. У *амфары*, круглявай пасудзіне з дзвюма ручкамі, прыносілі ваду і напоі. У *кратэры*, пасудзіне з шырокім горлам, напоі змешвалі. А з *кілікаў*, плоскіх чаш, іх пілі. А былі яшчэ пасудзіны, у якіх захоўвалі масла і духмяныя рэчывы…




Віды старажытнагрэчаскіх пасудзін



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кратэр Клітыя («Ваза Франсуа») (VI ст. да н. э.)



Кілік «Дыяніс у ладдзі» (VI ст. да н. э.)



Амфара «Аякс і Ахіл за настольнай гульнёй» (VI ст. да н. э.)

Многія вазы, нягледзячы на сваё практычнае прызначэнне, з'яўляюцца ўнікальнымі творамі мастацтва.

Якая з ваз, прадстаўленых на ілюстрацыі на с. 115, вам знаёмая? Дзе вы яе бачылі ці чулі пра яе?

**Чорнафігурны грэчаскі вазапіс.** Адным з папулярных упрыгажэнняў керамікі быў *чорнафігурны роспіс*. Па жоўта-чырвоным фоне гліны чорным лакам на выраб наносілі малюнак.

Кожная грэчаская ваза — гэта вынік працы двух майстроў. Ганчар яе вылепіў, а мастак распісаў. Часам імёны абодвух майстроў наносілі непасрэдна на сценкі пасудзіны. Так, знакаміты кратэр «Ваза Франсуа» мае подпіс: «Эргацім мяне зрабіў, Клітый мяне распісаў». Вельмі кранальна: ваза, нібы адушаўлёная асоба, гаворыць ад свайго імя. Гэты выраб з'яўляецца яркім прыкладам выявы святочнай і гераічнай тэматыкі ў чорнафігурнай кераміцы. На пяці ярусах адлюстраваны сцэны вяселля, палявання, спаборніцтва на калясніцах, бітва пігмеяў з жураўлямі.

Вазапісцы імкнуліся, каб малюнак падкрэсліваў форму пасудзіны. Прычым керамічныя вырабы распісвалі з усіх бакоў. Цалкам пакрывалі роспісамі і плоскую чашу, і ножку-падстаўку, і ўнутраную частку ёмістай пасудзіны.

Зірніце на амфару, упрыгожаную выявай Ахіла і Аякса, якія гуляюць у косткі. Як умела мастак Эксекій узгадніў паміж сабой малюнак і форму! Нахіленыя спіны гульцоў паўтараюць акругласці сценак пасудзіны. А кубападобны столік, змешчаны дакладна пасярэдзіне гарлача, паўтарае сілуэты ног герояў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Разгледзьце вазы, выкананыя ў чорнафігурнай тэхніцы. Назавіце сюжэты, намаляваныя мастакамі.

**Чырвонафігурны грэчаскі вазапіс.** Паступова ў вазапісе стала ўжывацца *чырвонафігурная тэхніка*. Мастакі пакрывалі чорным лакам не сілуэты фігур, а, наадварот, фон. Малюнкі майстры пакідалі ў натуральным тэракотавым колеры, гэта значыць неафарбаванымі. Гэта дазваляла на светлых сілуэтах фігур прамалёўваць вельмі тонкія дэталі.

Тэматыка чырвонафігурнага вазапісу стала нашмат разнастайнейшай. На вазах, распісаных у гэтай тэхніцы, сустракаюцца міфалагічныя сюжэты, сцэны з паўсядзённага жыцця, дэталёвыя выявы конных запрэжак, архітэктурных збудаванняў, інтэр'ераў... Людзі на чырвонафігурнай кераміцы часцей за ўсё адлюстраваны ў вытанчаным адзенні і з вельмі складанымі рухамі.

Традыцыйна распісная кераміка не толькі выкарыстоўвалася для пабытавых патрэб, але і трапляла ў вялікай колькасці ў пахаванні. Гэта спрыяла яе захоўванню. Дзякуючы знаходкам археолагаў грэчаскі вазапіс у наш час шырока прадстаўлены ў многіх найбуйнейшых мастацкіх музеях свету.



Амфара «Кіфарыст на спаборніцтвах» (VI ст. да н. э.)

Параўнайце чырвонафігурны і чорнафігурны вазапіс у параграфе і на дадатковай старонцы на кампакт-дыску. Чым адрозніваюцца тэхнікі? Як іх адрозненне праяўляецца ў дэкоры ваз?

**Арнаментальнае мастацтва.** Вытанчанасць і завершанасць керамічным вырабам надаваў арнамент — геаметрычны ці раслінны. Як бачна з прыкладаў, грэчаскія арнаменты адрозніваліся выразным чаргаваннем элементаў, адсутнасцю дэталяў, дэкаратыўнай яснасцю.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

|  |  |  |
|---|---|---|
| **Меа́ндр** — арнамент у выглядзе бесперапыннай ламанай лініі з прамымі вугламі. | **Пальме́та** — арнамент з веерападобнымі лістамі пальмавага дрэва. | **Хваля** — арнамент з завіткоў, якія нагадваюць грабяні марскіх хваль. |



Чаша «Жанчына, якая грае на а́ўласе» (V ст. да н. э.)



Архітэктурны дэкор антаблемента храма Эрэхтэён (фрагмент) (V ст. да н. э.)

Арнамент выкарыстоўваўся таксама ў іншых відах мастацтва. У архітэктурных збудаваннях з дапамогай арнаментальнага ўпрыгажэння падкрэслівалася прыгажосць ордараў. У манументальных стэлах і пастаментах — велічнасць. Асаблівую ролю арнамент выконваў у стварэнні ювелірных упрыгажэнняў, мэблі, тэкстылю.

? Разгледзьце віды старажытнагрэчаскага арнаменту. Успомніце, ці сустракаліся вы з падобнымі арнаментамі ў жыцці. Падзяліцеся сваім мастацкім досведам з аднакласнікамі.

Старажытнагрэчаская кераміка ўнікальная. Мастацкія ўзоры вазапісу і сёння цешаць вока. Керамічныя пасудзіны захапляюць формай, разнастайнасцю тэм, каляровай гамай. А з сюжэтаў роспісу можна скласці гісторыю культуры Старажытнай Грэцыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

Разгледзьце вазы, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Якое ўражанне на вас зрабілі формы і роспіс ваз?

1. У роспісе ваз пераважаюць міфалагічныя сюжэты. Якіх міфалагічных персанажаў вы пазналі?

### Творчая майстэрня

2. Пазнаёмцеся з рознымі формамі ваз. Выканайце сілуэтны малюнак двух-трох вырабаў. Паспрабуйце адлюстраваць у ім правільную форму вазы. Намалюйце эскіз роспісу з арыгінальным сюжэтам.

## § 23. Цуды свету ў Старажытнай Грэцыі

На працягу ўсёй эпохі Антычнасці грэкі ўзводзілі незвычайна прыгожыя, гарманічныя збудаванні, стваралі пластычныя вобразы, якія і сёння здзіўляюць сваёй пышнасцю. Усе творы старажытнагрэчаскіх майстроў можна па праву лічыць дасканалымі. Але некаторыя з іх выклікалі незвычайнае захапленне ў сучаснікаў. Таму гэтыя творы грэкі назвалі цудамі свету.

**Колькі ў свеце цудаў свету?** Да цудаў свету грэкі аднеслі не толькі ўнікальныя збудаванні і скульптуры антычнага свету, але і грандыёзныя тварэнні дойлідаў іншых старажытных цывілізацый. Усяго спіс налічваў сем помнікаў мастацтва. Сярод іх былі Вялікія егіпецкія піраміды ў Гізе, Вісячыя сады Семіраміды ў Вавілоне, а таксама пяць непаўторных твораў Старажытнай Грэцыі.

На жаль, ніводнае з цудаў старажытнагрэчаскага мастацтва не захавалася. Пазней знатакі мастацтва не раз змянялі гэты спіс, дапаўняючы яго новымі сусветнымі шэдэўрамі. Але менавіта тыя сем твораў мастацтва, якія вылучылі грэкі, увайшлі ў гісторыю як цуды свету.

Чаму Вісячыя сады Семіраміды і Вялікія егіпецкія піраміды грэкі прызналі цудамі свету?

**Цуды старажытнагрэчаскай архітэктуры.** Непаўторным збудаваннем быў ***Маўзалей у Галікарна́се***. Сваю назву ён атрымаў ад імя правіцеля — Маўсола, для якога і пабудавалі грабніцу. Яе ўзвядзенне



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Архітэктары Пі́фей і Саці́р.** Маўзалей у Галікарнасе (459—453 гг. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

было пачата яшчэ пры жыцці Маўсола, а завершана яго жонкай — Артэмісіяй.

Для свайго часу грабніца мела гіганцкія памеры, параўнальныя хіба што з вялікімі пірамідамі Старажытнага Егіпта. Яе вышыня дасягала 45 метраў. Дзіўна, што грабніца такога маштабу была пабудавана ўсяго за 6 гадоў!

Фундамент Маўзалея меў форму прамавугольніка. Ніжні паверх служыў магільным склепам правіцеля і яго жонкі. Другі паверх абрамлялі калоны іанічнага ордара, паміж якімі стаялі мармуровыя статуі. Завяршаў пабудову дах у выглядзе ступеньчатай піраміды. На вяршыні грабніцы была ўсталявана мармуровая скульптурная кампазіцыя: Маўсол і Артэмісія кіруюць двухколавай калясніцай з чацвёркай запрэжаных коней. Слова «маўзалей» з тых часоў увайшло ў многія мовы свету.

На жаль, час не пашкадаваў гэты помнік архітэктуры. У XIII стагоддзі падчас землетрасення ён быў разбураны, а пазней з камянёў яго руін пабудавалі крэпасць.

Сваімі формамі архітэктура Галікарнаскага Маўзалея здзіўляла нават грэкаў. Разгледзьце збудаванне. Якія элементы грэчаскія майстры запазычылі з архітэктуры Старажытнага Усходу?

Адным з цудаў старажытнагрэчаскай архітэктуры лічыцца ***храм Артэміды ў Эфе́се***, ці Артэмісіён. Пабудаваны ён быў у гонар багіні палявання. Прыгожую юную Артэміду асабліва шанавалі ў гэтым горадзе. Вядома, і храм Артэміды павінен быў адказваць зграбнасці аблічча багіні.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вялікі па памерах храм атрымаў «святочны ўбор». Артэмісіён упрыгожвалі 127 калон іанічнага ордара. Круглая скульптура і рэльефы служылі ўбранствам інтэр'ера храма. Але галоўным скарбам была велізарная статуя Артэміды. На жаль, яе апісанняў не захавалася. Вядома толькі, што скульптар выкарыстоўваў каштоўныя



Храм Артэміды ў Эфесе (IV ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

**Цікавы факт**

Для ўзвядзення храма была выбрана балоцістая мясцовасць. І не выпадкова! Дойліды прадбачылі магчымасць разбурэння такой грандыёзнай пабудовы ад землятрасенняў. Тэрыторыю асушылі, выкапалі катлаван, а фундамент храма дадаткова ўмацавалі.

матэрыялы для вырабу статуі. Храм Артэміды быў разбураны пажарам у IV стагоддзі да н. э. На яго месцы пабудавалі новы храм, які ў цэлым паўтарыў першапачатковую задуму. Але і ён не ацалеў.

? Разгледзьце малюнак рэканструкцыі храма Артэміды. Якое ўражанне на вас зрабіла гэта збудаванне?

Яшчэ адным цудам свету быў названы ***маяк, пабудаваны на востраве Фáрас.*** Гэты востраў знаходзіўся непадалёк ад егіпецкага горада Александрыі, таму маяк нярэдка называюць Александрыйскім. У старажытнагрэчаскім свеце гэта было самае высокае збудаванне — каля 130 метраў. Маяк служыў арыенцірам для караблёў: днём і ноччу яны маглі беспераашкодна прайсці вызначаны шлях.

Маяк уяўляў сабой збудаванне з трох веж, якія стаяць адна на другой. Вежы паступова памяншаліся ўверсе. Ніжняя вежа мела чатырохгранную форму, сярэдняя — васьмігранную, верхняя — цыліндрычную. Менавіта ў верхняй вежы ўвесь час гарэў агонь. Яго



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

водбліскі на марской вадзе былі бачныя на некалькі дзясяткаў кіламетраў.



Фароскі маяк (III ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

**Цуды старажытнагрэчаскай скульптуры.** Нароўні з архітэктурай скульптура таксама была тым відам мастацтва, у якім грэкі вызначаліся майстэрствам. Некаторыя творы па сваім маштабе параўнальныя са статуямі Старажытнага Егіпта. Такімі былі статуі Зеўса Алімпійскага і бога Геліяса на востраве Радóс.

***Статуя Зеўса*** была створана ў V стагоддзі да н. э. у Алімпіі — адным з галоўных культурных цэнтраў Старажытнай Грэцыі. Яе стварыў самы знакаміты скульптар таго часу — Фідый. Выкарыстоўваючы розныя матэрыялы — дрэва, слановую костку, золата, — майстар стварыў непаўторны вобраз ўладара гэтых месцаў. Статуя не столькі была гіганцкай, колькі стварала ўражанне грандыёзнасці. Яе вышыня, па розных звестках, даходзіла да 17 метраў.



Рымская манета з Эліды з выявай статуі Зеўса Алімпійскага (II ст. да н. э.)

Магутны Зеўс,назіраючы за тым, што адбываецца, кіруе светам — спрыяе добрым, карае несправядлівых. У правай руцэ ён трымае статуэтку багіні перамогі Нікі, у левай — скіпетр з арлом. Галаву Зеўса ўпрыгожвае вянок з галінак алівы. Яго адзенне, абутак, атрыбуты выкананы з золата. Зрэшты, як і трон, багата ўпрыгожаны рэльефамі, на якіх адлюстраваны подзвігі магутнага Зеўса.

Існуе некалькі версій пра тое, як «загінула» статуя Зеўса. Знайдзіце інфармацыю пра лёс статуі з Алімпіі самастойна.

***Статую бога сонца Геліяса***, які, паводле легенды, лічыўся стваральнікам вострава Радос, выраблялі каля 12 гадоў. Яна была



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

не проста вялікая. Яна была настолькі каласальная, што неўзабаве яе пачалі называць Калосам. Вышыня статуі дасягала 36 метраў.

Задума была сапраўды грандыёзная. Вобраз бога Геліяса, які зіхацеў у промнях сонца, упрыгожваў гавань Радоса, быў бачны далёка з мора і найбліжэйшых астравоў. Для таго каб усталяваць такую гіганцкую скульптуру, спатрэбіліся дакладныя матэматычныя разлікі. Для ўмацавання Калоса скульптары вызначылі тры апоры — ногі і край плашча, які звісаў. Іх збудавалі з каменю і ўзмацнілі металічным каркасам. Сама ж скульптура была выраблена з гліны і пакрыта лістамі бронзы.



**Сальвадор Далí.**
Калос Радоскі
(1954 г.)

Калос узвышаўся на мармуровым пастаменце. Трохі адхіліўшыся назад, Геліяс накіраваў свой позірк у марскую далечыню. Галаву прыгожага юнака аздабляў вянок з промнямі сонца. Іншых звестак пра тое, як выглядаў Калос, на жаль, не захавалася. Статуя прастаяла няшмат больш за паўстагоддзя і абвалілася ад землетрасення. Доўгі час яе абломкі праляжалі на востраве, нагадваючы яго жыхарам пра веліч бога сонца.

? Статуя бога Геліяса падчас землетрасення была зламана ў вобласці каленаў. Яе назвалі «калосам на гліняных нагах». З часам гэты выраз стаў вядомы ва ўсім свеце. Як вы разумееце яго сэнс?

Выдатныя творы антычных майстроў — цуды мастацтва Старажытнай Грэцыі — праславіліся на ўвесь свет. Нават знішчаныя часам, яны дагэтуль прыцягваюць увагу даследчыкаў і знатакоў мастацтва. Грандыёзныя архітэктурныя збудаванні і велічныя скульптуры сталі прыкладам умелага спалучэння дакладнасці матэматычных разлікаў і высокага мастацкага майстэрства.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Пытанні і заданні

1. Разгледзьце ілюстрацыі ў параграфе. Як вы лічыце, чаму менавіта гэтыя шэдэўры мастацтва Старажытнай Грэцыі былі названы цудамі свету?

Як вы думаеце, з якім помнікам архітэктуры звязана паходжанне сучаснага слова «фа́ра»? Знайдзіце ў даведачнай літаратуры інфармацыю пра легенды, звязаныя з гэтым помнікам архітэктуры. Падзяліцеся інфармацыяй з аднакласнікамі.

Разгледзьце карту Старажытнай Грэцыі. Супастаўце яе з сучаснай картай гэтага рэгіёна. Адзначце месцы, у якіх знаходзіліся цуды Старажытнай Грэцыі.

### Творчая майстэрня

2. Падбярыце да кожнага з пяці цудаў старажытнагрэчаскага мастацтва твор наступных эпох, які мог бы супернічаць з ім за месца ў спісе цудаў свету. Стварыце прэзентацыю з выявамі гэтых твораў.

## § 24. Гармонія думкі і слова: літаратура Старажытнай Грэцыі

Літаратура Старажытнай Грэцыі ўнікальная. Старажытныя грэкі не толькі адлюстравалі ў ёй норавы і традыцыі сваёй краіны, але і прапанавалі ўсяму свету разнастайнасць новых тэм, сюжэтаў і вобразаў. На жаль, да нашага часу захаваліся ў асноўным фрагменты літаратурных твораў. І толькі дзякуючы намаганням навукоўцаў, якія аднавілі некаторыя з іх, сучасны чытач знаёмы з літаратурнай спадчынай старажытных грэкаў.

**Вытокі літаратуры.** Асновай старажытнагрэчаскай літаратуры сталі міфы. Грэчаская міфалогія — гэта спроба грэчаскага народа пранікнуць у прычыны розных з’яў навакольнага свету і зразумець іх. Эліны прыдумалі мноства займальных гісторый, у якіх рэальныя падзеі і паэтычная выдумка зліваліся ў адно.

Самі старажытныя міфы адлюстроўвалі ўяўленні грэкаў аб будове свету.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

<table>
<tr><th colspan="2">Уяўленні старажытных грэкаў аб светабудове</th></tr>
<tr><td>Свет з’явіўся з бязмежнага і бясформеннага Хаосу. З Хаосу стаў складацца Космас, гэта значыць парадак.</td><td rowspan="3"><br>Гея з децьмі.<br>Фрагмент барэльефа<br>(XIII—IX стст. да н. э.)</td></tr>
<tr><td>1-е пакаленне старажытнагрэчаскіх багоў<br>Светам кіравалі першыя божаствы — багіня зямлі Ге́я, бог неба Ура́н, бог падземнага царства Та́ртар.</td></tr>
<tr><td>2-е пакаленне старажытнагрэчаскіх багоў<br>Гея і Уран спарадзілі тытанаў — багоў, якія ўвасаблялі магутныя сілы прыроды. Тытан Атлант трымаў нябесную сферу. Тытан Акіян кіраваў сусветнай ракой.<br>Тытаніда Феміда вырашала лёсы людзей, а Мнемазіна надзяляла іх памяццю. Тытан Кронас кіраваў часам.</td></tr>
<tr><td colspan="2">3-е пакаленне старажытнагрэчаскіх багоў<br>Дзеці Кронаса выбралі месцам сваіх сустрэч гару Алімп, і таму багоў сталі называць алімпійскімі.<br>Галоўным богам Алімпу быў Зеўс — вяршыцель лёсаў усіх багоў і людзей. Пасейдон кіраваў морамі. Гера, жонка Зеўса, стала апякункай сям’і і шлюбу.<br>Дачка Зеўса Афіна лічылася багіняй мудрасці, а Афрадыта — багіняй любові і прыгажосці. Бог-каваль, уладар агню і кавальскага рамяства — Гефест. Апекуном мастацтваў лічылі бога Апалона. Яго сястра Артэміда вядомая як багіня палявання.</td></tr>
</table>

Акрамя паданняў пра багоў, міфалогія Грэцыі багатая гісторыямі пра герояў. Героямі грэкі называлі людзей, якія адрозніваліся выключнай сілай, адвагай, мужнасцю, кемлівасцю або прыгажосцю. Гэта маглі быць палкаводцы, воіны, жрацы, прарокі, вялікія паэты... Грэкі верылі: прычынай выбітных якасцей героя было тое, што адным з яго бацькоў аказвалася бажаство.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Міфы пра герояў — гэта займальныя гісторыі пра жыццё, подзвігі і бітвы магутных людзей. Дзякуючы гэтым гісторыям Геракл, Арфей, Адысей і шмат якія іншыя героі станавіліся больш блізкія і больш зразумелыя звычайным людзям.

Паступова гісторыі аб прыгодах герояў дапаўнялі і з часам складалі ў вялікія міфалагічныя цыклы. Самым папулярным стаў траянскі цыкл, а таксама цыклы пра Адысея і герояў-арганаўтаў. Старажытныя міфы не запісвалі, іх выконвалі аэ́ды. Пазней міфалагічныя гісторыі леглі ў аснову літаратурных твораў.

Успомніце з урокаў мастацтва, літаратуры і гісторыі багоў і герояў Старажытнай Грэцыі. Раскажыце адзін з вядомых вам міфаў.

**Нараджэнне старажытнагрэчаскага эпасу.** Першымі літаратурнымі творамі, якія данеслі да нас дзіўныя гісторыі аб прыгодах, падарожжах і подзвігах герояў, сталі паэмы «Іліяда» і «Адысея» старажытнагрэчаскага паэта Гаме́ра. Ён сабраў паданні і легенды больш старажытных спевакоў-аэдаў і склаў эпічныя творы.

### Сюжэт паэмы «Іліяда» (траянскі цыкл)

У цэнтры «Іліяды» — падзеі Траянскай вайны, якую вялі грэкі-ахейцы і жыхары горада Троі. Парыс — сын траянскага цара Прыама — выкраў Алену, жонку спартанскага цара Менелая. Менелай распачаў Траянскую вайну.

Адзін з герояў паэмы — Ахіл, сын багіні Фетыды і цара Пелея. Высакародны і мужны герой Ахіл супрацьстаіць Гектару — сумленнаму, паважанаму воіну, які ўзяў на сябе ўвесь цяжар вайны.

Але перамагае траянцаў не Ахіл, а хітры Адысей. Яго вераломная хітрасць з велізарным драўляным канём, у якім былі схаваны воіны, аказалася для траянцаў фатальнай...



Паядынак Ахіла з Гектарам (Гектар, Афіна і Ахіл). Фрагмент вазапісу (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сюжэт паэмы «Адысея»

У цэнтры падзей «Адысе» — прыгоды героя Адысея ў час яго вяртання на радзіму. Адысей увесь час быў у смяротнай небяспецы. Але багі і ўласная кемлівасць дапамаглі яму пераадолець перашкоды.

Герой абхітрыў аднавокага цыклопа Паліфема, уратаваўся ад чараўніцы Цырцэі. Змог пазбегнуць чараў сірэн, якія заваблівалі маракоў сваімі спевамі. І застаўся ў жывых пасля караблекрушэння. Яго падарожжа скончылася вяртаннем на родны востраў да жонкі Пенелопы.

У паэмах «Іліяда» і «Адысея» Гамер наглядна апісвае падзеі далёкага мінулага. Праз стагоддзі мы можам даведацца пра вернасць Пенелопы і Андрамахі, пра прыгоды і подзвігі Ахіла і Адысея, пра павагу людзей да багоў і герояў. Сюжэты і вобразы гамераўскіх паэм і сёння знаходзяць увасабленне ў творах мастацтва.

Муза, скажи мне о том многоопытном муже, который,
Странствуя долго со дня, как святой Илион им разрушен,
Многих людей города посетил и обычаи видел,
Много и сердцем скорбел на морях, о спасенье заботясь
Жизни своей и возврате в отчизну сопутников; тщетны
Были, однако, заботы, не спас он сопутников...

*Гомер. «Одиссея», песнь первая*
*(перевод В. Жуковского)*

Асаблівасцю паэм Гамера з'яўляецца форма верша — гекза́метр. Гэта адмысловы верш, складаны для сучаснага чытача. Але менавіта гекзаметр надае паэмам Гамера асаблівы эфект — распеўнасць і меладычнасць. Не выпадкова з часоў Гамера гекзаметр называюць антычным вершам, а самога паэта — родапачынальнікам эпасу ў старажытнагрэчаскай літаратуры. Гамер — легендарны спявак-казачнік. Грэкі глыбока яго шанавалі. З часам імя, гісторыя жыцця і творчасці гэтага паэта ператварыліся ў міф, абрастаючы мноствам неверагодных падрабязнасцей.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пазнаёмцеся ў інфармацыйных крыніцах з дзявятай песняй паэмы «Адысея» Гамера. Падрыхтуйце выразны пераказ адной з прыгод Адысея, пра якія апавядаецца ў гэтай частцы.



**Антоніа Канова.** Гамер і Каліопа (1798 г.)

**Музычнасць старажытнагрэчаскай лірыкі.** У старажытнагрэчаскай літаратуры быў папулярны не толькі эпас пра жыццё багоў, герояў і людзей, але і паэтычныя творы, у якіх перадаваліся думкі, пачуцці і настрой аўтара. Такія творы з часам сталі называць *лірычнымі*.

Пад гукі ліры — старадаўняга музычнага інструмента — грэкі спявалі песні, складалі гімны. Паэзія Старажытнай Грэцыі была цесна звязана з музыкай. Ярчэй за ўсё гэта выявілася ў *песеннай лірыцы*.

**Лірыка** — са стараж.-грэч. «тое, што выконваецца пад акампанемент ліры».

Найвялікшую паэтэсу Сапфо грэкі называлі «дзясятай музай». У сваіх песнях яна расказвала пра глыбіню і шчырасць пачуццяў чалавека, пра прыгажосць і маральнасць яго імкненняў... І сёння здзіўляе яе глыбокае разуменне душэўнага свету людзей, адлюстраванае ў паэзіі, створанай больш за два тысячагоддзі таму.

**Цікавы факт**

Старажытнагрэчаскія творы запісвалі на папірусе — шырокіх аркушах, згорнутых у скруткі. Затым — на пергаменце, выробленым са скуры жывёл.

Красивое нас привлекает только
Своею внешностью; но кто душой велик,
Тот истинно прекрасен.
Без добродетели богатство бесполезно,
Но вместе с ней оно ведёт к блаженству.

*Сапфо. Песенная лирика*
*(перевод В. Водовозова)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Пра абарону Радзімы ад ворагаў пісаў старажытнагрэчаскі паэт Калін | Пра мужнасць старажытнагрэчаскага воіна распавядаў старажытнагрэчаскі паэт Ціртэй |
|---|---|
| Верьте, завидная доля<br>и славная — мужу сражаться<br>Ради земли и детей,<br>ради любимой жены<br>В битве с врагами. | Гордостью будет служить<br>и для города, и для народа<br>Тот, кто, шагнув широко,<br>в первый продвинется ряд<br>И, преисполнен упорства,<br>забудет о бегстве позорном,<br>Жизни своей не щадя<br>и многомощной души. |

Не меншай музычнасцю адрозніваецца яшчэ адзін жанр старажытнагрэчаскай лірыкі — эле́гія. Але ў адрозненне ад песень у элегіях грэчаскія паэты дзеляцца сваімі развагамі пра больш глабальныя паняцці светабудовы: пра радзіму, любоў і сяброўства, высокае прызначэнне чалавека.

Пазнаёмцеся з лірычнымі творамі Старажытнай Грэцыі. Якія тэмы больш за ўсё вабілі грэчаскіх паэтаў?

Старажытныя грэкі глыбока адчувалі рэчаіснасць і адлюстроўвалі яе ў літаратурных творах. Магчыма, таму сюжэты і вобразы грэчаскай міфалогіі і літаратуры захаваліся праз стагоддзі. А жанры, што склаліся ў Старажытнай Грэцыі, сталі асновай для развіцця сучаснай літаратуры.

### Пытанні і заданні

1. Выразы «траянскі конь», «ахілесава пята», «дары данайцаў» у сучаснай культуры замацаваліся як устойлівыя. Патлумачце, як вы разумееце сэнс гэтых выразаў.

Знайдзіце ў табліцы «Уяўленні старажытных грэкаў аб светабудове» імя старажытнагрэчаскага бажаства, з якім вы яшчэ не знаёмыя. Знайдзіце пра яго інфармацыю ў даведачнай літаратуры. Падрыхтуйце пра гэта бажаства невялікае паведамленне.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Байка — гэта літаратурны жанр, які атрымаў шырокую вядомасць дзякуючы старажытнагрэчаскаму легендарнаму байкапісцу Эзопу. Прачытайце байку «Мурашка і жук» Эзопа і байку «Мурашка і Жук» беларускага паэта Кандрата Крапівы. Што агульнага і адрознага ў байках аўтараў розных эпох?

В летнюю пору гулял муравей по пашне и собирал по зёрнышку пшеницу и ячмень, чтобы запастись кормом на зиму. Увидал его жук и посочувствовал, что ему приходится так трудиться даже в такое время года, когда все остальные животные отдыхают от тягот и предаются праздности. Промолчал тогда муравей; но когда пришла зима...

*Эзоп. «Муравей и жук»*

Раз летнім днём цераз дарогу
Мурашка пруцік валакла
Ды прыпынілася была,
Чакаючы сяброўку на падмогу.
І гэтым часам
Пачуўся нейкі гук,
Як бы спяваў хто басам,
А з гукам сеў паблізу Жук...

*Кандрат Крапіва.*
*«Мурашка і Жук»*

### Творчая майстэрня

2. Прачытайце ўрывак з «Іліяды» Гамера павольна, з невялікімі паўзамі. Паспрабуйце адчуць меладычнасць гекзаметра. Правядзіце ў класе конкурс на лепшае чытанне ўрыўка. Паспрабуйце скласці два-тры радкі, выкарыстоўваючы форму гекзаметра.

## § 25. Старажытнагрэчаская драма

Старажытнагрэчаская драма з'явілася пазней за эпас і лірыку. У драматычным творы ў адным сюжэце аўтар прайграе самыя яркія бакі навакольнага свету. Праблемы грамадства і чалавека ў драме раскрываюцца ў *канфлікце* паміж дзеючымі асобамі. А вось вынік канфлікту залежыць ад асаблівасцей асноўных жанраў драмы — *трагедыі* або *камедыі*.

**Дра́ма** — са стараж.-грэч. «дзеянне».
У аснове драмы — канфлікт паміж героямі.

**Трагедыя.** Да з'яўлення трагедыі свае разважанні пра жыццё старажытныя грэкі ўвасаблялі ў эпасе і



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

лірычных творах. У эпасе яны расказвалі пра гераічнае мінулае, у лірыцы — пра свае перажыванні. Злучыўшы гераічнае і лірычнае, грэкі стварылі трагедыю.

«Бацькам трагедыі» называюць *Эсхі́ла*. Ён напісаў шмат п’ес, але не ўсе яны дайшлі да нашага часу. Сярод твораў, якія захаваліся, адным з самых паспяховых была трагедыя «Праметэй прыкаваны». Пры гэтым Эсхіл здолеў расказаць знакаміты сюжэт аб Праметэі

> Трагедыя ёсць перайманне
> дзеяння важнага і скончанага,
> якое робіцца ў дзеянні,
> а не ў апавяданні.
> *Арыстоцель. «Паэтыка»*

| **Трагедыя Эсхіла «Праметэй прыкаваны»** | |
|---|---|
| Бог агню Гефест па загадзе Зеўса павінен прыкаваць тытана Праметэя да горнай скалы. Застаўшыся адзін, Праметэй пачынае гаварыць.<br>У сваім маналогу ён расказвае, колькі добрых спраў зрабіў для людзей. | ...Людей я сделал, прежде неразумных,<br>Разумными и мыслить научил.<br>...Раньше люди<br>Смотрели и не видели, и, слыша,<br>Не слышали, в каких-то грёзах сонных<br>Влачили жизнь; не знали древоделья,<br>Не строили домов из кирпича,<br>Ютились в глубине пещер подземных,<br>Бессолнечных, подобно муравьям.<br>Они ещё тогда не различали<br>Примет зимы, весны — поры цветов —<br>И лета плодоносного: без мысли<br>Свершали всё, — а я им показал<br>Восходы и закаты звёзд небесных;<br>Я научил их первой из наук —<br>Науке чисел и грамоте; я дал им<br>И творческую память, матерь Муз,<br>И первый я поработил ярму<br>Животных диких — облегчая людям<br>Тяжёлый труд телесный, я запряг<br>В повозки лошадей, узде послушных, —<br>Излюбленную роскошь богачей.<br>Кто, как не я, бегущие по морю,<br>Льнокрылые измыслил корабли?<br><br>*Перевод М. Гаспарова (отрывок)* |


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

па-новаму. У трагедыі Эсхіла Праметэй не проста прыносіць людзям агонь. Ён — мудры празорлівец, змагар за шчасце будучых пакаленняў.

У старажытнагрэчаскай трагедыі барацьба галоўнага героя часта заканчвалася яго гібеллю. Людзі пры гэтым адчувалі да яго спагаду. І гэта выдатны стан! Спачуваючы іншаму, чалавек на некаторы час забывае пра свае надзённыя праблемы. У гэтым заключаецца каштоўнасць трагедыі: у ёй адлюстравана жыццё людзей ва ўсёй яго складанасці. У старажытнагрэчаскай трагедыі літаратурныя вобразы сталі нашмат бліжэйшыя да рэальнага, сапраўднага жыцця чалавека. Знаёмячыся з імі, чытач і глядач перш за ўсё пазнаваў самога сябе.

Успомніце міф пра Праметэя з урокаў мастацтва і гісторыі. Прачытайце ўрывак з трагедыі Эсхіла «Праметэй прыкаваны». У чым вы бачыце розніцу ў сюжэтах? Якія якасці паглыбіў Эсхіл у вобразе галоўнага героя?

**Камедыя.** Грэкі любілі весяліцца. Таму не меншай папулярнасцю ў Старажытнай Грэцыі разам з трагедыяй карысталася камедыя.

| Камедыя Арыстафана «Птушкі» |
| --- |
| Галоўныя героі камедыі-казкі — афіняне Пісфетэ́р і Эвельпід — стаміліся ад жыцця ў рэальным свеце. З дапамогаю птушак яны будуюць сабе завоблачны птушыны горад Тучакукуеўск паміж небам і зямлёй.<br>Кожнаму віду птушак адведзены ў будаўніцтве горада і арганізацыі рэспублікі свае функцыі, якія адпавядаюць звычкам птушак або іх знешняму выгляду. Ластаўка стала падмайстрам мулярам: Арыстафан бачыў яе з камячком цэглы ў дзюбе, ды і хвост у яе мае форму кельмы. Дзяцел стаў цесляром, які чэша бярвёны ўдарамі дзюбы. Качка з яе белым фартухам працуе на кладцы сцен: яна падносіць цагліны. Буслы, якія мінаюць межы, быццам прызначаныя для таго, каб выдаваць пашпарты крылатым падарожнікам. Коршакі-перапёлачнікі — вартавыя прасторы...<br>Паступова і людзі, і багі пачалі пакланяцца птушкам...<br>*Пераказ паводле А. Банара* |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Сцэна са спектакля «Птушкі» (пачатак XXI ст.) (рэжысёр Аляксей Ляляўскі, мастак Людміла Скітовіч). Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (фота Сяргея Ждановіча)

> ...Я начну с петуха. Ведь когда-то петух
> был тираном персидским и правил
> Всеми персами. Люди не знали тогда Мегабазов и Дариев разных.
> До сих пор его птицей персидской зовут. Почему?
> Потому что царём был...
> Так велик и могуч был он в те времена, что о власти его петушиной
> Вспоминают доселе, и стоит теперь прозвучать его песне под утро,
> Как встают для работы ткачи, гончары, кузнецы, заготовщики кожи,
> Мукомолы, портные, настройщики лир, все, кто точит,
> сверлит и строгает,
> Обуваются быстро, хоть ночь на дворе, и бегут...
>
> *Аристофан. «Птицы» (перевод А. Апта)*

Самым знакамітым аўтарам камедый у Старажытнай Грэцыі быў *Арыстафáн*. Яго камедыі закраналі самыя актуальныя пытанні жыцця гараджан. Арыстафан любіў жартаваць з простых грамадзян і вядомых палітыкаў, высмейваць розныя падзеі з жыцця свайго горада. Важнай тэмай для драматурга была і вайна паміж Спартай і Афінамі, што зацягнулася ў Старажытнай Грэцыі.

Ідэі Арыстафана мудрагелістыя, характары герояў разнастайныя і супярэчлівыя. А дзеянне камедый насычана блазнерствам, іроніяй і клаўнадай.

23 Прачытайце на дадатковай старонцы ўрывак з п’есы «Птушкі». У ім прысутнічаюць гукавыяўленчыя прыёмы. Звярніце на іх увагу. Як вы думаеце, якога эфекту хацеў дасягнуць аўтар?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**«Суд камедыі над трагедыяй».** Аднойчы Арыстафан вырашыў паразважаць, чаму трагедыя займае ў жыцці грэкаў такое важнае месца. Сваё меркаванне ён выказаў у камедыі «Жабы» ў мудрагелістай форме. У п’есе Арыстафан паказвае судовае разбіральніцтва, падчас якога абмяркоўваюцца вартасці і недахопы тварэнняў двух вялікіх драматургаў Эсхіла і Эўрыпіда.

**Цікавы факт**

Камедыя Арыстафана атрымала назву «Жабы», бо хор у ёй быў апрануты ў касцюмы жаб. Хор спяваў песню, якая пачыналася смешнымі словамі: «*Брэкекекекс, коакс, коакс!*»

**Камедыя Арыстафана «Жабы»**

Пасля таго як самыя вядомыя аўтары трагедыі пакнулі зямны свет, аматары трагедыі сталі спрачацца: хто з вядомых драматургаў Старажытнай Грэцыі лепшы? Бог Дыяніс вырашыў спусціцца ў падземнае царства. Каб вывесці адтуль Эўрыпіда — аднаго з вядомых старажытнагрэчаскіх драматургаў. У падземным царстве Дыяніс стаў суддзёй пры спрэчцы Эсхіла з Эўрыпідам — кто з іх лепшы драматург...

Эўрыпід абвінавачвае Эсхіла:

«П’есы ў цябе сумныя: герой стаіць, а хор спявае, герой скажа два-тры словы, тут п’есе і канец. Словы ў цябе старадаўнія, грувасткія, незразумелыя. А ў мяне ўсё ясна, усё як у жыцці, і людзі, і думкі, і словы».

Эсхіл пярэчыць:

«Паэт павінен вучыць дабру і праўдзе. Гамер тым і славіцца, што паказвае ўсім прыклады доблесці, а які прыклад могуць падаць твае гераіні? Высокім думкам адпавядае і высокая мова, а тонкія размовы тваіх герояў могуць навучыць грамадзян толькі не слухацца начальнікаў».

Затым абодва драматургі чытаюць вершы. І абодва чапляюцца адзін да аднаго. У канцы п’есы на судзе ўзважваюць вершы кожнага драматурга на вялікіх вагах...

*Пераказ паводле М. Гаспарава*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прачытайце канец п'есы «Жабы» ў інфармацыйных крыніцах. Хто ж перамог у спрэчцы — Эсхіл ці Эўрыпід? Чые вершы пераважылі на вагах?

У Старажытнай Грэцыі былі створаныя цудоўныя ўзоры асноўных драматычных жанраў — трагедыі і камедыі. Злучаючы ў сабе сур'ёзнае і вясёлае, высокае і забаўнае, драма стала часткай літаратурнага і тэатральнага мастацтва. Майстэрства драматургаў Грэцыі вызначыла развіццё драмы на доўгія стагоддзі наперад.

## Пытанні і заданні

1. У чым заключаюцца асноўныя адрозненні жанраў старажытнагрэчаскай драмы — трагедыі і камедыі?

2. Трагедыя Эсхіла «Праметэй прыкаваны» вабіла майстроў мастацтва ва ўсе часы. Падбярыце творы розных відаў мастацтва, якія ілюструюць гэтую трагедыю.

3. Прывядзіце прыклады трагічных сюжэтаў у вядомых вам творах айчыннай і сусветнай мастацкай культуры. Чаму гэтыя сюжэты вам запомніліся?

## Творчая майстэрня

4. Сучасная беларуская мастачка Людміла Скітовіч стварыла для спектакля «Птушкі» паводле аднайменнай камедыі Арыстафана вобраз героя. Разгледзьце фотаздымак уважліва. Прапануйце свой варыянт касцюма Удода.



Касцюм Удода са спектакля «Птушкі» (рэжысёр Аляксей Ляляўскі, мастак Людміла Скітовіч). Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (фота Сяргея Ждановіча)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 26. Гульні-спаборніцтвы як аснова тэатральнага і музычнага мастацтва Старажытнай Грэцыі

Важнымі асаблівасцямі старажытнагрэчаскай культуры былі відовішчнасць і спаборніцтва. Старажытнагрэчаскія святы ў гонар багоў суправаджаліся ўрачыстымі шэсцямі, спевамі, танцамі, спартыўнымі гульнямі, музычна-паэтычнымі і тэатральнымі змаганнямі. У сваёй сферы кожны хацеў быць першым.

**Спартыўныя гульні-спаборніцтвы.** У першую чаргу відовішчнасць і спаборніцтва выявіліся ў спартыўных змаганнях. Эліны не проста любілі спорт. Яны рыхтаваліся быць воінамі, і спартыўныя спаборніцтвы выконвалі ў гэтым важную ролю. Бег, скачкі, кіданне дыска, барацьба — усе гэтыя віды спартыўных спаборніцтваў прыдумалі ў Старажытнай Грэцыі. Заняткі спортам былі ў Грэцыі абавязковыя для кожнага мужчыны. І не толькі таму, што полісы, якія ўвесь час ваявалі, мелі патрэбу ў падрыхтаваных воінах. Грэкі верылі, што спорт удасканальвае чалавека і фізічна, і духоўна. Моцнае цела і бадзёры дух — вось адзін з пастулатаў старажытнагрэчаскай культуры. Успрымаючы цела і чалавечую душу як непарыўнае цэлае, грэкі лічылі фізічную прыгажосць залогам маральнай дасканаласці.



Амфара з бегунамі (VI ст. да н. э.)



**Палікле́т.** Атлет з павязкай пераможцы (V ст. да н. э.)

Лахон, Лахон-Залучитель
Залучил от великого Зевса
Лучшую славу быстроногих,
Такую стяжав победу,
За какие и в прежние годы
Виноградный Кеос,
Побеждая в беге и в схватке,
Не раз был пет
Юношами в расцветших венках.

*Вакхилúд. «Песнь олимпийская» (перевод М. Гаспарова)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўнымі спартыўнымі спаборніцтвамі Элады былі Алімпійскія гульні. Яны праводзіліся раз на чатыры гады ў мясцовасці Алімпія і былі вялікай падзеяй у жыцці старажытных грэкаў. Перамога на алімпійскіх спаборніцтвах шанавалася не менш, чым перамога на вайне. Алімпійскіх пераможцаў увенчвалі аліўкавымі вянкамі, у іх гонар пісалі песні-гімны, іх вобразы ўвасаблялі ў статуях і роспісах на вазах. Спартыўныя гульні стымулявалі развіццё спаборніцтва ў мастацтве — у музыцы і тэатры.

Спаборніцтва — важная частка жыцця старажытных грэкаў. Успомніце камедыю Арыстафана «Жабы». З якім спаборніцтвам вы там сустрэліся? Хто браў у ім удзел?

**Старажытнагрэчаская музыка.** Музыка, як і спорт, займала важнае месца ў жыцці грэчаскіх гарадоў. Бо для грэка музыка была адным з самых дасканалых адлюстраванняў гармоніі і парадку. Калі ўсе гукі ўзгодненыя адзін з адным, яны гучаць выдатна, ураўнаважваючы стан чалавека. Лічылася, што з дапамогай музыкі выхоўваецца гарманічны чалавек. Таму музыку і спевы асвойвалі нароўні з чытаннем, граматыкай, лікам, гімнастыкай і маляваннем. Упадабанымі музычнымі інструментамі грэкаў былі струнныя шчыпковыя — *кіфáра*, *ліра*, і духавыя — розныя віды *áўласаў**. Грэкі вельмі любілі праводзіць музычныя спаборніцтвы. Самымі ганаровымі сярод музыкаў лічыліся Піфійскія гульні ў Дэльфах, якія праводзіліся ў гонар Апалона. Пераможцу на гэтых гульнях даставаўся лаўровы вянок.



Ліра. Чырвонафігурны вазапіс (IV ст. да н. э.)



Кіфара. Чырвонафігурны вазапіс (IV ст. да н. э.)

Спаборніцтвы ў Дэльфах існуюць і сёння. Але называюцца яны інакш. Знайдзіце ў даведачнай літаратуры інфармацыю пра гульні ў Дэльфах. Як яны называюцца, хто бярэ ў іх удзел?

* Гл. ілюстрацыю на с. 118.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Адэон Герода Аціка ў Афінах (II ст.)

**Цікавы факт**

Для музычных спаборніцтваў зрабілі спецыяльную пабудову — *Адэóн*. Знешне ён нагадваў грэчаскі амфітэатр, але быў меншага памеру. Гэта дазваляла палепшыць акустыку.

**Арганізацыя тэатральных прадстаўленняў.** Тэатральныя прадстаўленні ў Афінах лічыліся справай дзяржаўнай важнасці. Падрыхтоўка чарговага прадстаўлення ў тэатры была велізарнай падзеяй для ўсіх грамадзян. Арганізацыя такіх відовішчаў была ганаровым абавязкам адной з найвышэйшых выбарных асоб поліса — *архóнта*. Ён праводзіў конкурс сярод паэтаў-драматургаў, якія прапаноўвалі свае творы для выканання ў тэатры. З велізарнай колькасці драматургаў для ўдзелу ў творчым спаборніцтве пакідалі толькі трох.

Кожны аўтар, якога выбраў архонт, падаваў на конкурс трылогію — цыкл з трох трагедый. Напрыклад, Эсхіл вынес на суд публікі трылогію аб Праметэі. Следам за невялікай трагедыяй «Праметэй прыкаваны» паказвалася другая п’еса — «Праметэй вызвалены», а затым і трэцяя — «Праметэй-агняносец». Большасць п’ес ставілі ўпершыню і больш ніколі не паўтаралі.



Камедыёграф Менáндр з маскамі. Рэльеф (I ст. да н. э.)

Выдаткі ў падрыхтоўцы спектакляў бралі на сябе заможныя людзі. Іх пасада называлася *харэ́г* (кіраўнік хору). Рэпетыцыі з хорам і акцёрамі праводзіў сам аўтар



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тэатральныя білеты-жэтоны з бронзы (VI—II стст. да н. э.)

п'есы. Харэг клапаціўся пра аплату працы ўсіх удзельнікаў і афармленне спектакля: касцюмы, дэкарацыі, спецыяльныя прыстасаванні для стварэння «цудаў».

П'есы глядзелі некалькі дзён напралёт — ад світанку і да самага вечара! У канцы свята на падставе рэакцыі гледачоў спецыяльнае журы вырашала, якая з трох паказаных трылогій лепшая, і выдавала ўзнагароду і паэту, і харэгу, які фінансаваў спектаклі. Імёны пераможцаў заносілі на спецыяльныя памятныя пліты, устаноўленыя каля тэатра.

Успомніце з урокаў мастацтва будову старажытнагрэчаскага тэатра. Пералічыце яго асноўныя часткі. Раскажыце пра іх прызначэнне.

**Тэатральнае будаўніцтва.** Усе вольныя грамадзяне павінныя былі мець магчымасць прысутнічаць на святах у гонар галоўных багоў. Таму тэатральныя збудаванні рабілі такіх памераў, каб у іх магло размясціцца да 15 тысяч чалавек.

У Старажытнай Грэцыі тэатральнае будаўніцтва вялося ў шырокіх маштабах. Захаваныя руіны тэатраў ёсць у Афінах, А́ргасе, Перга́ме і ў дзясятках іншых гарадоў. Найбольш дасканалы паводле



Тэатр у Эпідаўры (IV ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

архітэктурных формаў, прапорцый *тэатр у Эпідаўры*. Ён найбольш яскрава адлюстроўвае асаблівасці грэчаскага тэатра. Велізарная чаша гарманічна спраектаванага амфітэатра са светлага каменю быццам сцякае па схіле пагорка, скіроўваючыся да круглай архестры. З верхніх прыступак амфітэатра адкрываецца дзівосная панарама маляўнічай даліны.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах дакументальны фільм «Тэатр у Эпідаўры» з серыі «Вялікія тэатры свету». Якія пастаноўкі папулярныя ў гэтым тэатры на сучасным этапе?

**Спектакль у старажытнагрэчаскім тэатры.** У грэчаскім тэатры праходзілі прадстаўленні, у якіх дыялогі і маналогі герояў чаргаваліся з песнямі хору.

Хор у трагедыі складаўся з 12—15 удзельнікаў, якія паказвалі людзей, жывёл або міфалагічных істот, блізкіх да героя. Напрыклад, у «Праметэі прыкаваным» Эсхіла хор складалі Акіяніды — дочкі Акіяна, а ў камедыі Арыстафана «Аблокі» хор паказваў аблокі.

Значная частка драмы, як правіла, не праходзіла на вачах у гледачоў. Шмат пра якія падзеі паведамлялі веснікі, дамачадцы або слугі, якія былі за сцэнай. На сцэне паказвалі толькі самыя галоўныя падзеі.

Немалое значэнне ў пастаноўцы спектакля мелі механічныя прыстасаванні для ператварэнняў і перамяшчэнняў дзеючых асоб. У скене былі дзверы, з якіх падчас спектакля магла выкаціцца платформа на колах, — каб паказаць, што адбываецца ўнутры будынка. Іншая тэатральная машына ўяўляла сабой спецыяльны кран, які ўздымаў акцёра ў паветра, малюючы яго палёт, або спускаў з «неба» багоў. З яе дапамогай над сцэнай маглі ўзнікаць і крылатая каляснiца з Акіянідамі з трагедыі Эсхіла, і Воблака, якое спускаецца з нябёсаў, з камедыі Арыстафана.



Амфара «Хор на хадулях» (VI в. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успомніце, якія спектаклі вы глядзелі. Як было арганізавана прадстаўленне? Як спалучаліся словы, музыка і рух? Якія тэхнічныя прыстасаванні былі выкарыстаны?

Старажытнагрэчаскі тэатр уяўляў сабой яркае, эмацыйнае відовішча. Ён захапляў тысячы гледачоў, дарыў ім мудрыя думкі і перажыванні, якія ўзвышалі душу. Праблемы, закранутыя старажытнагрэчаскімі драматургамі, не згубілі актуальнасці і ў нашыя дні.

## Пытанні і заданні

1. Што новага вы даведаліся пра старажытнагрэчаскі тэатр: яго знешні выгляд, арганізацыю тэатральных пастановак, спектаклі? Якія з тэхналогій старажытных грэкаў можна ўбачыць у сучасным тэатры?

2. Як вы думаеце, чаму на сцэнах сучасных тэатраў творчасць аўтараў антычных трагедый увасабляецца часцей, чым творчасць аўтараў камедый? Правядзіце ў класе дыскусію на гэтую тэму.

3. Да цяперашняга часу захаваліся руіны некалькіх старажытных тэатраў. Але не ў кожным з іх праходзяць тэатральныя прадстаўленні. Правядзіце невялікае даследаванне: у якіх са старажытнагрэчаскіх тэатраў, што захаваліся, сёння ставяць спектаклі?

## Творчая майстэрня

4. Напішыце невялікае эсэ-роздум пра спектакль, які вы бачылі і які вам запомніўся (ваша ўражанне, ідэя спектакля, сродкі ўвасаблення, роля рэжысёра, мастакоў, акцёраў). Прачытайце ваша эсэ ў класе. Абмяркуйце работы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Раздзел 5

# Мастацтва Старажытнага Рыма: пасланне ў будучыню

Рым адрозніваецца ад іншых гарадоў. Гэта вялікі музей, які трэба прайсці на пальчыках…

*Альбе́рта Сордзі*



Жанчына з кіфарай. Фрэска з вілы ў Баскарэа́ле (I ст. да н. э.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 27. Мастацтва этрускаў: папярэднікі вялікіх рымлян

Рымляне былі таленавітымі заваёўнікамі. Перамагаючы суседзяў, яны не толькі далучалі новыя тэрыторыі, але і пераймалі досвед і веды заваяваных народаў. Грэкі, егіпцяне, этрускі... Усе яны ў розны час былі заваяваныя Рымам, каб стаць для сваіх заваёўнікаў... настаўнікамі. Прамымі папярэднікамі старажытных рымлян варта назваць этрускаў.

**Архітэктурныя дасягненні этрускаў.** Этрускі валодалі перадавымі ведамі ў будаўніцтве, асабліва ў галіне інжынерыі. Яны стваралі гарады, вуліцы якіх перасякаліся пад прамым вуглом, будавалі выдатныя дарогі, а цераз рэкі перакідалі масты.

Для ўзвядзення крапасных пабудоў, падмуркаў храмаў і жылых дамоў ужываліся розныя пароды каменю, а таксама дрэва і цэгла. Паступова тэхнічныя навыкі архітэктараў удасканальваліся, і этрускія майстры пачалі ўзводзіць магутныя крапасныя сцены з адмысловымі падпоркамі-контрфорсамі. Гэтыя сцены з праходамі-аркамі сталі прыкладам для наступных пакаленняў рымскіх дойлідаў.



Порта-дэль-Арка ў Вальтэ́ры (II ст. да н. э.)



Роспіс з «Грабніцы палявання і рыбалкі» (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Этрускі надзвычай паважна ставіліся да памінальнага культу. Ніводны народ у старажытным свеце, акрамя егіпцян, не клапаціўся гэтак уважліва пра ўпарадкаванне месцаў вечнага спачыну для памерлых, як этрускі. Захавалася вялікая колькасць этрускіх пахавальных збудаванняў — грабніц. Як храмы, так і грабніцы мелі розны дэкор: на сценах засталіся роспісы на розныя сюжэты.


Менáда. Антэфікс з Вей (V ст. да н. э.)

Нягледзячы на тое што большасць збудаванняў была разбураная, археолагі знайшлі цікавыя дэталі архітэктурнага дэкору — антэфíксы. Антэфікс з Вей уяўляе сабой жаночы твар, акружаны пялёсткамі, якія нагадваюць ракавіну. Майстар падрабязна прапрацаваў нават завіткі валасоў, а лёгкая паўусмешка персанажа нагадвае твары этрускіх статуй. І сёння нас уражвае прыгажосць антэфіксаў, умела створаных этрускім майстрам.

Звярніце ўвагу на жыццярадасныя фарбы і дэталі кампазіцыі з «Грабніцы палявання і рыбалкі». Адзін з паляўнічых падрыхтаваў прашчý і збіраецца трапіць ёй у птушку, а рыбак закідвае ў вадаём сеткі. Параўнайце гэты роспіс з роспісамі ў Старажытным Егіпце. Што іх аб’ядноўвае?

**«Дамы для вечнага жыцця»: грабніцы і саркафагі.** Галоўнымі пабудовамі этрускі лічылі грабніцы. Іх высякалі ў скалах або складалі з каменю, а зверху часта насыпалі курган. «Дамы для вечнага жыцця» будавалі паводле прынцыпу зямнога жылля: калідор і некалькі пакояў, часам нават з вокнамі. Інтэр’ер напаўнялі мэбляй: высечанымі з каменю ложкамі, крэсламі, зэдлікамі для ног. І, вядома ж, разнастайнымі прадметамі ўжытку і асабістымі рэчамі нябожчыка.

Цела памерлага чалавека змяшчалі ў *саркафáг*, на вечку якога адлюстроўвалі нябожчыка за святочнай трапезай. Самыя цікавыя этрускія саркафагі ўяўляюць сабой скульптурныя партрэты шлюбных



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Адна з грабніц у этрускім горадзе Чэрветэ́ры (Цэ́рэ) (V—IV стст. да н. э.)



Саркафаг мужа і жонкі з Чэрветэры (Цэрэ) (VI ст. да н. э.)

пар. Яны выкананыя з *тэракоты* — абпаленай цэглы.

Грэкаў і рымлян здзіўляла, што ў этрускім грамадстве жанчыны былі раўнапраўныя з мужчынамі. Павагу і любоў паміж мужам і жонкай этрускія майстры перадавалі з вялікай чуллівасцю. На вечку саркафага з Чэрветэры вобразы мужа і жонкі выпраменьваюць дзівосную пяшчоту. Іх прасветленыя твары передаюць глыбокую ўнутраную згоду, што пануе паміж мужам і жонкай.



Канопа
(VII—VI стст. да н. э.)

Існаваў у этрускаў і звычай крэмацыі. У гэтым выпадку прах памерлага змяшчалі ў спецыяльныя *пасудзіны-урны* — *канопы*. Асноўная частка скрыні сімвалізавала цела чалавека, а вечка часта выконвалася ў выглядзе яго галавы. Некаторыя канопы дапаўнялі ручкамі, у якія ўстаўляліся «рукі».



Канопа (VII ст. да н. э.)

У грабніцы этрускі змяшчалі ўсё неабходнае для замагільнага жыцця. Напрыклад, у «Грабніцы воіна» знайшлі па-майстэрску ўпрыгожаную вайсковую амуніцыю. Нездарма этрускія майстры славіліся асаблівым уменнем апрацоўкі металу! Сярод



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Кіраса з «Грабніцы воіна» ў Ланувіі (V ст. да н. э.)

знойдзеных даспехаў вылучаецца так званая мускульная кіра́са з бронзы. Яна дасканалая па форме і адрозніваецца правільнасцю анатамічных дэталяў: выразна перадаецца развітая мускулатура. Воін у такой амуніцыі выглядаў страшным і непераможным.

Вечкі каноп з выявай галавы чалавека адрозніваюцца паміж сабой. Як вы думаеце, ці мелі гэтыя выявы партрэтнае падабенства з памерлымі?



Апалон з Вей (VI ст. да н. э.)

**Скульптура.** Статуі сваіх багоў этрускі звычайна таксама выраблялі з тэракоты. А гэта вельмі далікатны матэрыял. Таму статуі дайшлі да нас толькі ў выключных выпадках.

Статую Апалона з Вей знайшлі пры раскопках храма. Вялікая, з чалавечы рост скульптура выканана пад уплывам старажытнагрэчаскага мастацтва. Усмешка на твары Апалона, вібрацыі складак адзення нагадваюць скульптуры кор з Афінскага акропаля. Але ў этрускай статуі больш руху і пачуццяў. Рашучы крок Апалона настолькі шырокі, што ўся яго фігура імкнецца наперад.

У выяўленчым мастацтве этрускаў вабілі вострыя і рэзкія характарыстыкі вобразаў. Гэта тлумачыць любоў этрускіх майстроў да бронзы — матэрыялу, які здольны перадаць максімальнае напружанне формы.

Скульптура хімеры з Арэ́цца выканана якраз з бронзы. Выява фантастычнай жывёлы валодае вялікай экспрэсіяй! Хімера рыкае і нападае, прыпаўшы на пярэднія лапы. Поўсць яе паднялася, спіна


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Хімера з Арэцца
(V ст. да н. э.)

выгнулася дугой, на баках праступілі рэбры... Здаецца, яна схопіць зубамі любога, хто наблізіцца да яе. Ні ў адным творы старажытных грэкаў мы не сустрэнем такога пераканаўчага вобраза жывёлы.

Скульптурная выява хімеры ўнікальная. Ахарактарызуйце скульптурны вобраз, створаны этрускамі.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Сярод прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва этрускаў да нашага часу захаваліся ў асноўным вырабы з бронзы і керамікі. Гэта розныя пасудзіны ды інвентар для спецыяльных абрадаў. Менавіта гэтыя знаходкі яшчэ раз прымушаюць нас успрымаць культуру этрускаў як вельмі загадкавую. Персанажаў, малюнкі дэкору і само прызначэнне прадметаў цяжка расшыфраваць дакладна. Незвычайная фантазія этрускіх майстроў праявілася пры вырабе пасудзін з бронзы. Яны літаральна «населеныя» рознымі персанажамі, занятымі магічным дзеяннем.



Трыножнік з катлом
з грабніцы Барберыні
(VII ст. да н. э.)

Разгледзьце прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва этрускаў у параграфе і на кампакт-дыску. У чым, на ваш погляд, заключаецца іх адметнасць? Што вас асабліва ўразіла?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Этрускі першыя ў гісторыі мастацтва звярнуліся да перадачы індывідуальных рыс чалавека. Але для этрускіх майстроў было важнае не толькі аблічча чалавека, але і багаты свет пачуццяў і эмоцый. У творах мастацтва яны здолелі адлюстраваць праўдзівасць пачуццяў, шчырасць, любоў — усё тое, у чым яны бачылі сапраўдную прыгажосць чалавека.

### Пытанні і заданні

1. Параўнайце творы старажытнагрэчаскага і этрускага выяўленчага мастацтва. Паспрабуйце вызначыць агульнае і адрознае. Праілюструйце свой адказ мастацкімі прыкладамі.

Успомніце, што такое жанр партрэта. Параўнайце скульптурны партрэт майстроў Старажытнай Грэцыі і этрускаў. У чым заключаецца іх асноўнае адрозненне? Дакажыце, што этрускія майстры валодалі талентам у гэтай галіне мастацтва.



Керамічная пасудзіна Пабла Пікаса (XX ст.)

2. Па́бла Піка́са — знакаміты мастак XX стагоддзя — любіў ствараць кераміку з выкарыстаннем матываў твару або цела чалавека. Параўнайце керамічныя пасудзіны Пікаса і этрускіх майстроў. Апішыце, у чым іх падабенства і адрозненне, звярнуўшы ўвагу на колер, форму, ступень праўдзівасці выявы.

### Творчая майстэрня

3. Уявіце, што вам неабходна падрыхтаваць тэматычную выставу ў мастацкім музеі. Якія творы этрускага мастацтва вы прапануеце? Прыдумайце для выставы вобразную назву. Падрыхтуйце выступленне для адкрыцця выставы.

## § 28. Архітэктура Старажытнага Рыма: наватарства, веліч і інжынернае майстэрства

Архітэктуру Старажытнага Рыма, таксама як і архітэктуру Старажытнай Грэцыі, называюць класічнай. Рымскія дойліды стварылі непаўторныя збудаванні, якія да цяперашняга часу ўражваюць людзей з усяго свету. Пераасэнсаваўшы і захаваўшы найлепшыя архітэктурныя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

традыцыі папярэднікаў, рымляне дапоўнілі іх новымі вынаходніцтвамі. Мэтай архітэктурных пабудоў было ўслаўленне імперыі, а ідэалам — спалучэнне карысці і прыгажосці.

**Як выглядаў старажытнарымскі горад.** Культурнае жыццё старажытных рымлян праходзіла ў гарадах. Таму дойліды планавалі свае гарады так, каб іх жыхарам у іх было камфортна і бяспечна. Гарады былі акружаныя крапаснымі сценамі і мелі выразную структуру. Галоўныя вуліцы перасякалі горад з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Тэрыторыя горада дзялілася на кварталы.

Рымляне арганізоўвалі жыццё ў гарадах як заваёўнікі, улічваючы неабходнасць хутка мабілізаваць ваенныя сілы ў выпадку баявых дзеянняў. У сувязі з гэтым вялікую ўвагу яны надавалі *дарогам*. Добрая дарога скарачала час перамяшчэнняў як унутры горада, так і з аднаго пункта (ваеннага лагера або паселішча) у іншы.

Адны дарогі, найбольш важныя, брукавалі каменем, другія пакрывалі ўтрамбаваным пяском. Першая з брукаваных дарог Старажытнага Рыма — *А́піева дарога* — была названая «царыцай дарог». Менавіта яна дазволіла наладзіць зносіны з Грэцыяй і Егіптам. Гэта было патрэбна для ваеннай справы, развіцця гандлю і пашырэння культурных сувязяў.

Яры і рэкі, з якімі сустракаліся будаўнікі дарог, змушалі ўзводзіць каменныя масты, здольныя стагоддзямі вытрымліваць паходы шматлікіх войскаў. Такіх мастоў, як у Старажытным Рыме, яшчэ не ведала ніводная цывілізацыя. Трывалыя, працягласцю



Апіева дарога
(канец IV ст. да н. э.)



Мост Фабрыцыя цераз
Тыбр (I ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Табула́рый на Рымскім форуме (I ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

часам некалькі кіламетраў, масты мелі гарманічныя архітэктурныя формы. Прасветы арак, што паўтараліся шматкроць, адкрывалі цікавыя панарамы.

Гарадскім цэнтрам быў *форум* — плошча. Менавіта на форуме праходзілі сходы грамадзян, праводзіліся дыскусіі, выступалі дзяржаўныя дзеячы. Тут жа размяшчаліся крамы гандляроў, будынкі суда, бібліятэкі, храмы... Форумы будавалі не толькі ў буйных гарадах, такіх як Рым і Пампеі, але і ў правінцыйных. Але самай раскошнай і пышнай была архітэктура форумаў Рыма. У гэтым горадзе, у адрозненне ад іншых, на працягу старажытнай эпохі быў створаны не адзін, а некалькі форумаў.

Першы Рымскі форум арганізавалі каля Капіталійскага ўзгорка як галоўную гарадскую плошчу. На ім быў пабудаваны дзяржаўны архіў — Табуларый. Менавіта ў гэтым будынку ўпершыню ў архітэктуры Рыма гарманічна злучыліся запазычаныя ў грэкаў ордарныя формы і новы элемент *арка́да* — шэраг паўтораных арак, устаноўленых на апорах. Аркада выкарыстоўвалася як «сценка» форума або займала цэлы ярус-паверх пабудовы.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рым як культурны цэнтр дзяржавы падобна да сучасных мегаполісаў вабіў сваім бурлівым жыццём і раскошай людзей з розных куткоў краіны. І неўзабаве форум аказаўся цесным для правядзення сходаў грамадзян. Па распараджэнні правіцеля Юлія Цэзара быў пабудаваны новы форум, які атрымаў яго імя. Сама плошча, акружаная двума шэрагамі калон, была больш прасторная. У цэнтры красавалася статуя Цэзара. Палкаводзец ганарліва сядзеў на кані, накіроўваючыся да храма Венеры Прамаці, што замыкала форум.

Дзе сёння мы сустракаемся са словам «форум»? Якая, на вашу думку, існуе сувязь паміж форумам у Старажытным Рыме і форумамі ў сучаснай культуры?

**Ідэі трыумфу ў Старажытным Рыме.** Свае ваенныя подзвігі і культурныя дасягненні рымляне праслаўлялі веліччу архітэктурных формаў і пышным дэкаратыўным убраннем збудаванняў. Адным з такіх збудаванняў стала трыумфальная арка. Яе правобразам былі гарадскія вароты, а сімвалізавала яна ўваход у вялікую дзяржаву — Старажытны Рым. Трыумфальныя аркі рымляне ўзводзілі не толькі ў гарадах, але і на межах з заваяванымі дзяржавамі. Такіх збудаванняў у культуры Старажытнага Рыма налічвалася больш за 300.



Трыумфальная арка імператара Канстанціна ў Рыме (IV ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Трыумфальныя аркі мелі адзін або тры пралёты для праходу або праезду грамадзян. У архітэктуры гэтых збудаванняў рымляне выкарыстоўвалі ордарныя элементы. Упершыню ў трыумфальных арках Рыма быў ужыты а́тык — дэкаратыўная сценка, размешчаная вышэй за карніз. На гэтай дэкаратыўнай сценцы выбівалі прысвячальныя надпісы або рэльефы.

На сценах аркі імператара Канстанціна засталіся ўнікальныя выявы. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах звесткі пра іх.

**Інжынерны і будаўнічы геній рымлян.** Адна з самых значных «знаходак» рымлян — *бетон*, з'яўленне якога адносіцца да канца III стагоддзя да н. э. Яго рыхтавалі на аснове вапны з дадatннем вулканічнага пяску. Спачатку бетон выкарыстоўвалі як злучальны раствор для каменнай кладкі сцен. А пазней рымляне пачалі ўжываць яго і як асноўны будаўнічы матэрыял для ўзвядзення жылых дамоў і грамадскіх будынкаў.

Будынкі выглядалі перакананаўча і ўрачыста. Абліцаваныя мармуровымі плітамі, яны здаваліся цалкам створанымі з гэтага матэрыялу. Але ўсярэдзіне быў бетон, які і дазваляў узводзіць грандыёзныя скляпенні, аркады.



Гардскі мост, Францыя (I ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Акведук
у Сеговіі,
Іспанія (І ст.)

Аркада выкарыстоўвалася ў Старажытным Рыме пры будаўніцтве акведу́каў — збудаванняў у выглядзе моста з трубаправодам або каналам для падачы вады цераз раку, роў, яр. Але ў адрозненне ад дарожных мастоў у акведуках аркада мела больш зграбныя формы. Шмат'ярусная кампазіцыя перадавала накіраванасць архітэктурных формаў увышыню. Ніжні ярус служыў свайго рода базай, апорай. Ён атрымаў найбольш масіўныя формы. Мастацкі акцэнт у трох'ярусных акведуках дойліды рабілі на сярэднім ярусе. Верхні ж ярус служыў завяршальным элементам.

Разгледзьце акведукі, прадстаўленыя ў параграфе. Падумайце, як і чаму мяняецца ўражанне ў залежнасці ад кампазіцыі акведукаў.

Дойліды Старажытнага Рыма стварылі цудоўныя збудаванні і архітэктурныя ансамблі, якія сталі яркімі прыкладамі ўмелага спалучэння традыцыйных будаўнічых прыёмаў і наватарскіх архітэктурна-мастацкіх пошукаў. Велічная па духу, грандыёзная па формах, урачыстая па характары архітэктура Старажытнага Рыма стала прыкладам увасаблення сілы і магутнасці дзяржавы ў мастацкіх вобразах.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Архітэктары Йохан Ота фон Спрэкельсэн, Поль Андро.** Вялікая арка Дэфанс у Парыжы, Францыя (1989 г.)

## Пытанні і заданні

1. Пералічыце асноўныя вынаходніцтвы старажытнарымскіх дойлідаў. Ахарактарызуйце адно з іх.

2. Рымскі архітэктар і інжынер Вітру́вій у I стагоддзі да н. э. абгрунтаваў асноўнае патрабаванне да архітэктуры: «Карысць, трываласць, прыгажосць». Як вы думаеце, ці актуальнае сёння гэтае патрабаванне? Прывядзіце аргументы.

## Творчая майстэрня

3. Праз некалькі стагоддзяў трыумфальныя аркі, што ўвасаблялі магутнасць дзяржавы, сталі зноў узводзіць у розных гарадах свету. Усталёўвалі іх у гонар важных падзей. У XIX стагоддзі ў Парыжы на плошчы Зоркі была ўзведзеная трыумфальная арка з нагоды ваенных перамог Напалеона. У знак перамогі ў ваенных бітвах трыумфальныя аркі і трыумфальныя вароты былі пастаўленыя ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Курску (Расія), Патсда́ме (Германія). Але не толькі ваенныя подзвігі ўслаўляла гэтая архітэктурная форма. Вялікая арка Дэфанс у Парыжы, пабудаваная ў 1989 годзе, адзначыла ідэю міру і сяброўства чалавецтва. Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра адну з пералічаных трыумфальных арак і праілюструйце яго з дапамогай прэзентацыі.

# § 29. Выбітныя пабудовы Старажытнага Рыма

Большасць часу рымляне праводзілі па-за домам: на вуліцах, форумах, у тэрмах, цырку або тэатры. Таму архітэктурным пабудовам самага рознага прызначэння правіцелі Рыма надавалі шмат увагі. Праславіўшы сябе «ў камені», яны імкнуліся захаваць свае імёны ў гісторыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Амфітэатр Калізей.** Важнае месца ў жыцці рымлян займалі відовішчы, любімымі сярод якіх былі баі гладыятараў і цкаванне звяроў. Спачатку яны адбываліся на форуме, у цырку або тэатры. А пры імператарах Фла́віях для гэтых мэт быў пабудаваны *амфітэатр*, празваны за свае грандыёзныя памеры *Калізей*, гэта значыць каласальны, велічэзны.

Калізей быў пабудаваны незвычайна. Тры ярусы глядацкіх месцаў узвышаліся прыступкамі над авальнай арэнай. Гэта давала ўсім наведвальнікам магчымасць добра бачыць гладыятарскія баі. Выцягнутая форма арэны дазваляла з размахам праводзіць бітвы на забаву публіцы.

Пры гэтым кожны ярус атрымаў сваё архітэктурна-мастацкае афармленне. Аркі галерэі ніжняга яруса, як найбольш масіўнага, які нясе на сваіх «плячах» наступныя аркады, акружалі дарычныя паўкалоны. Іанічны ордар дойліды выкарыстоўвалі ў другім ярусе. А карынфскі як найбольш урачысты — у трэцім. У прасветах арак другога і трэцяга ярусаў былі ўсталяваны скульптуры. Яны былі бачныя здалёк, нібы запрашалі грамадзян Рыма наведаць амфітэатр і ўбачыць небывалыя відовішчы.

Разгледзьце выявы Калізея на кампакт-дыску з розных ракурсаў. Звярніце ўвагу на тры ярусы арак. Ахарактарызуйце прыкметы іанічнага, дарычнага і карынфскага ордараў.



Амфітэатр Флавіяў (Калізей) (I ст.). Графічная рэканструкцыя



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пантэон
(II ст.)

**Пантэон — храм усіх багоў.** Адна з грандыёзных культавых пабудоў антычнага свету атрымала назву *Пантэон* — храм усіх багоў. У гэты храм маглі ўваходзіць не толькі жрацы, але і ўсе грамадзяне Рыма. У Пантэоне знайшлі ўвасабленне найлепшыя дасягненні ў галіне будаўнічага мастацтва.

Бетон дазволіў узвесці небывалы па памерах купал — дыяметрам больш за 43 метры. Цыліндрычная форма асноўнага аб'ёму збудавання адлюстравала ідэю яднання з багамі, спакою, вечнасці. Класічны порцік карынфскага ордара надаў урачыстасць уваходу ў храм. Трапляючы ўнутр, грамадзяне Рыма адчувалі трапятанне, таінства зносін з багамі. Асвятлялася прасторная зала толькі святлом, што пранікала скрозь «вока Пантэона» — адтуліну ў цэнтры купала.

Знайдзіце ў даведачнай літаратуры інфармацыю пра тэхнічнае абсталяванне Калізея і Пантэона. Дзе сёння можна ўбачыць падобныя тэхнічныя прыёмы?

**Форум імператара Траяна.** Самае значнае і грандыёзнае архітэктурнае збудаванне ў Рыме — форум імператара Траяна. Гэты форум і звязаны з ім пяціпавярховы рынак будаваліся ў памяць аб двух паходах Траяна, які захапіў велізарную тэрыторыю і незлічоныя скарбы Дакіі. Дзяржаўная казна поўнілася золатам



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Форум Траяна (VI ст.)

захопленых народаў. Дзякуючы гэтаму форум будавалі вельмі хуткімі тэмпамі.

Уваход на форум вызначала трыумфальная арка Траяна, узведзеная ў яго гонар. У цэнтры шырокай плошчы быў усталяваны пазалочаны конны манумент імператара. Таксама да плошчы прымыкалі база́ліка і храм Траяна. За імі сіметрычна размяшчаліся дзве бібліятэкі — лацінская і грэчаская.



Трыумфальная калона Траяна (II ст.)

Паміж бібліятэкамі высілася трыумфальная калона Траяна вышынёй 38 метраў. Яе ўпрыгожвала спіральная стужка рэльефаў — 28 віткоў даўжынёй 190 метраў. Адлюстраваныя на калоне сцэны расказвалі пра жыццё захопленых народаў і пра тое, як іх заваявалі рымскія салдаты на чале з Траянам. Сам рэльеф быў распісаны, а дэталі пазалочаныя. Пазней статую Траяна, размешчаную наверсе калоны, замянілі скульптурай святога Пятра.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Фрагмент калоны Траяна (II ст.)

Уважліва разгледзьце дэкор калоны Траяна. Якія сюжэты вы ўбачылі на ёй? Апішыце адзін з сюжэтаў.

**Рымскія тэрмы.** Важнае месца ў культурным жыцці рымлян займалі *тэ́рмы*, або грамадскія лазні. Яны не толькі прызначаліся для абмыванняў і водных працэдур, але і былі месцам для культурнага адпачынку і заняткаў спортам.

**Цікавы факт**

У некаторых басейнах была такая гарачая падлога, што людзі заходзілі ў ваду ў скураных сандалях.

Сваімі каласальнымі памерамі і багатым убраннем праславіліся тэрмы імператара Карака́лы. Маштабам і сіметрычнай планіроўкай яны нагадвалі маленькі горад. З боку галоўнага ўвахода, уздоўж агароджы, размяшчаліся лазні. «Сэрцам»



Руіны тэрмаў Каракалы (III ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

тэрмаў былі памяшканні для водных працэдур, пакоі для адпачынку і двары для прагулак. У комплекс тэрмаў Каракалы ўваходзілі дзве бібліятэкі, стадый (стадыён) для гімнастычных гульняў, а таксама парк.

Архітэктурны ансамбль тэрмаў Каракалы быў збудаваны на схіле пагорка, што давала магчымасць бесперашкодна падаваць у лазні ваду. Багаты інжынерны досвед рымлян дазволіў ім правесці пад падлогай спецыяльныя каналы для падагрэву, у якія падавалася гарачае паветра.


Галава атлета-пераможцы. Фрагмент мазаікі з тэрмаў Каракалы (III ст.)

Прасторныя залы ўпрыгожвалі мазаічныя падлогі, калоны з пышнымі капітэлямі, статуі, фантаны. Да нашага часу тэрмы Каракалы дайшлі ў руінах, але і іх маштаб здзіўляе! Больш поўнае ўражанне аб комплексе тэрмаў могуць даць сучасныя рэканструкцыі. А вось захаваныя фрагменты мазаік і статуй «расказваюць» нам аб вытанчаным мастацкім афармленні тэрмаў.

Што запазычылі сучасныя дойліды ў старажытных рымлян пры стварэнні архітэктурных збудаванняў для адпачынку?

Рым — адзін з самых вялікіх і багатых гарадоў у свеце. Яго вобраз стваралі выдатныя архітэктары і інжынеры. Архітэктура «вечнага горада» — сапраўдная энцыклапедыя рознага тыпу збудаванняў і крыніца для натхнення дойлідаў наступных эпох, аж да нашага часу.

## Пытанні і заданні

Уважліва разгледзьце рымскія амфітэатры, прадстаўленыя ў параграфе і на кампакт-дыску. Падумайце і назавіце некалькі сучасных архітэктурных збудаванняў, у якіх выкарыстаныя матывы рымскага амфітэатра. Праілюструйце свой адказ мастацкімі прыкладамі.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Старажытнарымскі гісторык Святоній пісаў пра рымскага імператара Актавія́на А́ўгуста: «Ён так адбудаваў горад, што па праву ганарыўся тым, што прыняў Рым цагляным, а пакідае мармуровым». Патлумачце гэты выраз, выкарыстоўваючы прыклады архітэктурных збудаванняў з параграфа.

### Творчая майстэрня

2. Як вы думаеце, чым сёння прываблiваюць турыстаў руіны форума Траяна? Уявіце, што вы экскурсавод. Падрыхтуйце для экскурсіі невялікае вуснае паведамленне пра форум.

## § 30. Партрэтны жанр у скульптуры Старажытнага Рыма

Асноўным жанрам выяўленчага мастацтва ў Старажытным Рыме быў *партрэт*. Гэта тлумачыцца характарам старажытнарымскай культуры. Рымляне любілі гісторыю і шанавалі дакументальную дакладнасць партрэта. Яны ўспрымалі яго як своеасаблівы гістарычны дакумент, галоўная каштоўнасць якога — праўдзівасць і рэалізм. Больш за ўсё ў старажытнарымскім мастацтве жанр партрэта праявіўся ў скульптуры.



Статуя рымляніна з бюстамі продкаў (I ст. да н. э.)

**Скульптурныя партрэты продкаў.** Скульптурны партрэт у старажытнарымскай культуры быў звязаны з культам продкаў. Ім пакланяліся амаль як багам. Партрэты продкаў захоўвалі ў парадных пакоях дома, у асаблівых шафах або нішах. Скульптурныя галовы выраблялі з розных матэрыялаў: гіпсу, воску, цэглы, мармуру. Умацоўвалі іх на падстаўках з надпісам, які паведамляў пра імя і ўчынкі продка.

Лічылася, што чым больш *бюстаў* у сям'і — тым яна старажытнейшая, а значыць і аўтарытэтнейшая. Такія сямейныя партрэты звычайна былі прыжыццёвымі вывамі. Іх стваралі па васковых масках, зня-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

тых з твару чалавека. Гэтаму рымляне навучыліся ў егіпцян. Рымскі скульптар узнаўляў усе партрэтныя рысы з высокай дакладнасцю.

Скульптурныя партрэты продкаў выкарыстоўвалі ў пахавальных цырымоніях. Родзічы неслі іх у руках следам за памерлым. Як вы думаеце, што гэта значыла?

**Ідэалізацыя вобразаў.** У пачатку I стагоддзя пры стварэнні скульптурных партрэтаў старажытнарымскія майстры звярталіся да досведу старажытных грэкаў. У пошуку гармоніі партрэтныя рысы моцна ідэалізаваліся.

Асабліва ярка ідэалізацыя вобразаў прыкметная ў скульптурнай выяве імператара Актавіяна Аўгуста. Гэты кіраўнік валодаў розумам і цвёрдым характарам, але не адрозніваўся прыгажосцю і фізічнаю сілай. Тым не менш у вядомай статуі Актавіяна з Прыма Порта, дзе ён паказаны выступоўцам з прамовай перад арміяй, імператар адлюстраваны атлетычна складзеным і мужна прыгожым. Сваёй дасканаласцю скульптура нагадвае выдатныя грэчаскія ўзоры. Але энергічны жэст узнятай рукі выдае выключна рымскі, уладны характар чалавека.



Статуя Актавіяна Аўгуста з Пры́ма Порта (I ст.)

У інфармацыйных крыніцах знайдзіце партрэты Актавіяна Аўгуста, створаныя рознымі скульптарамі. Ахарактарызуйце іх падабенства.

**Жаночыя партрэты.** Жанр жаночага партрэта пачаў развівацца пазней за мужчынскі, толькі пры імператары Актавіяне Аўгусце. У гэты перыяд з’явілася вялікая колькасць партрэтаў жонкі імператара — Лівіі. Дзякуючы рэалістычнасці старажытнарымскія жаночыя партрэты і дагэтуль з’яўляюцца неацэннай крыніцай гісторыі моды.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Бюст Лівіі (I ст.)



Бюст Веспасіяна (I ст.)



Бюст Марка Аўрэлія (II ст.)

У партрэце Лівіі рысы твару прыкметна ідэалізаваныя, але аснова вобраза рэалістычная. Шырока расстаўленыя вочы, вялікі нос, маленькі рот... Падціснутыя вусны выдаюць халодны і амбіцыйны характар першай дамы дзяржавы. Валасы Лівіі ўкладзеныя паводле апошняй моды таго часу: над ілбом яны сабраныя ў авальны локан. Калі ў моду ўвайшлі жаночыя прычоскі з крута закручаных валасоў, укладзеных у форме высокай кароны, усіх дам сталі паказваць менавіта ў такім выглядзе.

Разгледзьце прычоскі старажытных рымлянак у параграфе і на кампакт-дыску. Якія элементы гэтых прычосак вам знаёмыя? Як вы думаеце, у якіх выпадках можна выкарыстоўваць гэтыя элементы ў цяперашні час?

**Асаблівасці старажытнарымскага партрэта.** У другой палове I стагоддзя ў выявах людзей майстры падкрэсліваюць іх *індывідуальнасць*. Скульптары паўтараюць міміку мадэляў, вылучаюць іх самыя яркія і характэрныя рысы.

У партрэце імператара Веспасіяна ўвасоблены вобраз энергічнага і дзелавога чалавека. Скульптар не выпадкова падкрэсліў грубаватыя рысы твару і вялікую галаву. Веспасіян зрабіў кар’еру толькі дзякуючы сваёй правінцыйнай хватцы. Па-майстэрску адлюстраваная міміка Веспасіяна перадае яго разважлівасць, прыродную праніклівасць і хітрасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне


Бюст Каракалы (III ст.)

Пазней, да пачатку III стагоддзя, скульптары сталі звяртаць увагу не толькі на аблічча, але і на ўнутраны стан мадэлі. Напрыклад, бюст Марка Аўрэлія паказвае нам абцяжаранага вярхоўнай уладай імператара. Погляд яго стомленых вачэй, нібы звернутых унутр сябе, выдае сапраўдную натуру гэтага філосафа на троне. Партрэт паказвае Марка Аўрэлія як чалавека, для якога зямное быццё — цяжар.

А вось партрэт імператара Каракалы, наадварот, паказвае каварнага і жорсткага чалавека. Змрочнасць і падазронасць ясна чытаюцца ў выразным нахіле галавы, у падбародку, які крута выступае наперад, у зрослых насупленых бровах. Тое, як глыбока здолелі пранікнуць у чалавечую натуру старажытнарымскія скульптары, проста зачароўвае.

Параўнайце скульптурныя партрэты Марка Аўрэлія і Каракалы. Ахарактарызуйце сродкі выразнасці, з дапамогай якіх скульптары дасягнулі высокага ўзроўню ў перадачы жыццёвай праўды — амаль як на фатаграфіі.

**Конная статуя.** Большасць старажытнарымскіх партрэтаў — гэта бюсты. Але рымскія скульптары выкарыстоўвалі і іншыя формы партрэтаў. Яны, напрыклад, «вынайшлі» *конную статую*. Паўстаць перад гледачом у выглядзе вершніка, які гарцуе на кані, любілі і рымскія военачальнікі, і імператары. Але да нас дайшоў толькі адзін такі конны манумент — бронзавая статуя Марка Аўрэлія. Калісьці яна стаяла на Рымскім форуме, але ў XVI стагоддзі вялікі італьянскі скульптар і архітэктар Мікела́нджэла ўсталяваў яе ў цэнтры перабудаванай ім Капіталійскай плошчы. У XX стагоддзі ў мэтах захавання ўнікальны твор перанеслі ў залы Капіталійскага музея. А на плошчы выставілі дакладную копію антычнага арыгінала.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Конная статуя Марка Аўрэлія (II ст.)



Помнік Усяславу Чарадзею ў Полацку, Беларусь (пад кіраўніцтвам А. Прохарава) (2007 г.)

Конная статуя дагэтуль застаецца папулярнай формай партрэта. Калі перад жывапісцам або скульптарам узнікае задача праслаўлення нейкай геранчнай асобы, ён, як правіла, звяртаецца да коннага манумента. Як вы думаеце чаму?

Рымскі скульптурны партрэт — адна са значных з'яў у развіцці жанру партрэта. У адрозненне ад грэчаскага, ён больш канкрэтны, рэалістычны і праўдзівы. Акрамя мастацкіх якасцей, рымскі скульптурны партрэт мае гістарычную каштоўнасць.

## Пытанні і заданні

1. Партрэт адыгрываў важную ролю ў культуры Старажытнага Егіпта і Старажытнага Рыма. А ў мастацтве Старажытнай Грэцыі быў амаль не запатрабаваны. Як вы думаеце чаму?

Скульптурныя партрэты Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма маюць шмат агульнага і адрознага. Назавіце асноўныя адрозненні старажытнарымскага партрэта ад старажытнагрэчаскага. Праілюструйце свой адказ творамі, прадстаўленымі ў параграфе і на кампакт-дыску.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Назавіце віды скульптурных партрэтаў Старажытнага Рыма. У чым заключаецца асаблівасць кожнага віду? Які з іх зрабіў на вас найбольшае ўражанне? Аргументуйце свой адказ на канкрэтным прыкладзе.

3. Параўнайце конныя статуі Марка Аўрэлія і Усяслава Чарадзея. Што іх аб'ядноўвае?

**Творчая майстэрня**

4. Падрыхтуйце ілюстраванае апавяданне на тэму «Жыццё рымскіх цэзараў у люстэрку мастацтва». Складзіце для гэтага галерэю партрэтаў старажытнарымскіх імператараў. Збярыце звесткі пра жыццё і характар аднаго з іх.

## § 31. Своеасаблівасць тэхнік манументальнага жывапісу

Манументальны жывапіс у Старажытным Рыме быў вельмі запатрабаваны — ён з'яўляўся галоўным сродкам упрыгожвання інтэр'ера. Сцены храмаў, грамадскіх збудаванняў, багатых жылых дамоў звычайна распісвалі фрэскамі ці ўпрыгожвалі мазаікай.

**Аблічча чалавека.** Нароўні са скульптурнымі партрэтамі ў Старажытным Рыме былі распаўсюджаныя і жывапісныя. Праўда, захаваліся яны горш. Партрэт Септы́мія Сяве́ра з сям'ёй — адзіная жывапісная выява рымскага імператара, якая дайшла да нас. На ім Септымій Сявер прадстаўлены разам з жонкай і сынамі — Каракалам і Гетам. Партрэт афіцыйны і ўрачысты. Усе апранутыя ў дарагое адзенне, а сам імператар і яго старэйшы сын Каракала ўвянчаныя залатымі лаўровымі вянкамі. Септымій Сявер спадзяваўся, што пасля яго смерці браты будуць правіць разам. Але не прайшло і года пасля смерці бацькі, як Каракала забіў Гету, загадаўшы знішчыць усе выявы і тэксты, у якіх згадвалася яго імя. Расправе падвергнуўся і сямейны партрэт: твар Геты на ім, на жаль, бязлітасна выскаблены.



Партрэт Септымія Сявера з сям'ёй (II ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Уважліва разгледзьце партрэт Септымія Сявера. На выяве добра заўважнае месца, на якім быў партрэт Геты. Як вы думаеце, як мог выглядаць Гета? Апішыце яго знешнасць. Якое на ім было адзенне, галаўны ўбор?

**Сакрэты з-пад попелу.** Падчас вывяржэння вулкана Везу́вія пад патокамі лавы і попелам загінулі цэлыя гарады — Пампеі, Геркула́нум і Ста́біі. Але менавіта гэтая з'ява дазволіла захаваць для нашчадкаў мастацкія каштоўнасці далёкага мінулага. Пахаваныя пад пластом лавы і попелу старажытнарымскія гарады захаваліся да нашага часу ў амаль некранутым выглядзе. Археалагічныя раскопкі, якія ідуць на іх тэрыторыі ўжо больш за дзвесце гадоў, адкрылі мноства твораў мастацтва, у тым ліку і жывапісных.

Галоўным скарбам вілы Містэрый, пабудаванай у Пампеях, лічацца фрэскі, што цудам захаваліся пасля вывяржэння Везувія. Яны ўражваюць незвычайна «гарачым» каларытам. Фон насычанага чырвонага колеру дапамагае вылучыць фігуры людзей, напісаныя больш празрыстымі фарбамі. Мы можам бачыць каля 25 персанажаў, якія паказаны падчас розных рытуальных дзеянняў, прысвечаных культу Дыяніса.

Роспіс залы завяршаецца выявай убрання нявесты і партрэтам, як мяркуюць, гаспадыні дома. Сёння значэнне некаторых сцэн расшыфраванае, а шмат якія засталіся для навукоўцаў загадкай. Частка сюжэтаў адбываецца ў зямным свеце, а частка — у містычным.



Фрэскі з вілы Містэрый (II ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Назавіце асноўныя тэхнікі старажытнарымскага жывапісу. Якія дасягненні рымлян у гэтым відзе мастацтва?

**Карціны, выкананыя без пэндзля.** У Рыме мазаікі мы можам убачыць і ў прыватных дамах, і ў грамадскіх пабудовах. Гэты від манументальна-дэкаратыўнага жывапісу надзвычай устойлівы да вільгаці і таму часта ўжываўся ў дэкоры тэрмаў. Мазаіка выкарыстоўвалася для дэкору не толькі сцен, але і падлогі. Хоць бы адна мазаіка мелася ў кожным старажытнарымскім заможным доме. Яна выконвалася з розных матэрыялаў: сма́льты (каляровага, непразрыстага шкла) або камянёў. Асаблівасцю рымскай мазаікі было тое, што яе модулі (кубікі смальты або каменю) укладаліся па напрамку ліній, якія падкрэслівалі аб'ём адлюстраваных аб'ектаў.

У *доме Фаўна*, адным з самых багатых дамоў Пампей, знайшлі падлогавую мазаіку памерам прыкладна 3 на 6 метраў. На ёй адлюстраваная бітва паміж войскамі Аляксандра Македонскага і персідскага цара Да́рыя. Бітва скончылася паражэннем персаў. І гэта разумее глядач, які бачыць на мазаіцы пераломны момант бітвы.



Бітва Аляксандра Македонскага з Дарыем. Мазаіка з дома Фаўна ў Пампеях (ІІ ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Не звяртаючы ўвагі на воінаў, якія падаюць, Аляксандр на верным кані Буцэфале рвецца да Дарыя. Здаецца, што ён паражае праціўніка і дзідай, і гарачым поглядам. Пад такім напорам войска Дарыя, ахопленае разгубленасцю, разбягаецца ў розныя бакі. Па-майстэрску распрацаваная кампазіцыя выдатна паказвае эмацыйны напал бітвы і прадказвае яе зыход.

Сёння мазаіку перанеслі ў Нацыянальны археалагічны музей у Неапалі, а на віле Фаўна ўзнавілі яе копію. Як вы думаеце, для чаго гэта зрабілі?

**Незвычайныя функцыі мазаікі.** Цікава, што адной з функцый рымскай мазаікі была ахоўная: лічылася, што такая выява можа засцерагаць ад «благога вока», злодзеяў, зайздроснікаў і іншых непрыемнасцей.





Мазаікі з вілы Ці́валі (1-я пал. II ст.)

Сустракаюцца ў старажытнарымскім жывапісе і бытавыя сцэны, і ўзоры *анімалістычнага жанру*. Цікавыя мазаікі з вілы імператара Адрыяна ў Цівалі. Яны мелі самыя розныя сюжэты. Галубы, якія п’юць з «крыніцы жыцця», мелі сімвалічнае значэнне і былі звязаныя з хрысціянскай верай. А мыш, якая імкнецца да грэцкага арэха, уяўляла сабой займальны эпізод, заўважаны дапытлівым мастаком. Звярніце ўвагу, што мастак адлюстраваў нават лёгкі цень, які падае ад грызуна і арэха.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Уважліва разгледзьце старажытнарымскія мазаікі. У чым, на ваш погляд, заключаецца іх незвычайнасць?

Мастакі Старажытнага Рыма дасягнулі вялікіх поспехаў у авалоданні ўсімі мастацкімі сродкамі жывапісу. Тэхнічная дасканаласць, разнастайнасць і раскоша каларыту, тонка заўважаныя моманты рэчаіснасці і адначасова складанае значэнне розных сюжэтаў адрозніваюць старажытнарымскі жывапіс.

### Пытанні і заданні

1. Як тэхнікі жывапісу, якія выкарыстоўвалі майстры Старажытнага Рыма пры стварэнні твораў, дапамагалі раскрыць вобразы, сюжэты?

2. Назавіце пабудовы, у дэкоры якіх выкарыстоўваліся мазаікі. На якіх паверхнях іх размяшчалі?

3. Пералічыце асноўныя сюжэты, якія былі распаўсюджаны ў жывапісе Старажытнага Рыма. Чым яны адрозніваюцца ад старажытнагрэчаскіх сюжэтаў?

### Творчая майстэрня

Сюжэт трагедыі ў Пампеях вельмі папулярны ў жывапісе пазнейшых часоў. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах карціну Ка́рла Бруло́ва «Апошні дзень Пампеі», створаную ў XIX стагоддзі. Звярніце ўвагу на паводзіны адлюстраваных людзей. Знайдзіце звесткі пра тэхналогію рэканструкцыі археолагамі фігур людзей, пахаваных пад попелам. Прачытайце пра жыццё горада Пампей. Складзіце невялікае паведамленне пра гэты горад.

## § 32. Залаты век літаратуры Старажытнага Рыма

Старажытныя рымляне адрозніваліся здольнасцю пераймаць цікавае і карыснае ў заваяваных імі народаў. А потым разам з іншымі сваімі дасягненнямі распаўсюджваць па свеце. Падпарадкаваўшы сабе Грэцыю, рымляне былі ўражаны мастацтвам гэтага рэгіёна.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Вытокі літаратуры.** Рымлянам падабаліся міфы старажытных грэкаў пра багоў і герояў. Але заваёўнікі ўбачылі ў іх сваіх багоў і герояў, з іншымі імёнамі. Грэчаскі Зеўс ператварыўся ў рымскага Юпітэра. Багіню перамогі, якая суправаджала Зеўса, грэкі называлі Нікай, а рымляне — Вікторыяй. Жонка Зеўса Гера ператварылася ў Юнону, багіня мудрасці Афіна стала Міне́рвай, Пасейдон — Нептýнам, Гермес — Меркýрыем.

**Цікавы факт**

Нягледзячы на сур'ёзную крытыку, пераклад «Адысеі» быў вельмі папулярны ў Старажытным Рыме. Яго выкарыстоўвалі як падручнік для вывучэння лацінскай мовы.

Вядома ж, уплыў старажытнагрэчаскай міфалогіі адбіўся на літаратуры Старажытнага Рыма. Невыпадкова адным з першых літаратурных твораў лічаць пераклад на лацінскую мову паэмы «Адысея» старажытнагрэчаскага паэта Гамера. Праўда, сучаснікі лічылі, што пераклад не зусім атрымаўся. Але менавіта гэты твор азнаменаваў з'яўленне старажытнарымскай літаратуры. А Лі́вія Андро́ніка, які стварыў гэты пераклад, называюць першым рымскім паэтам.

Успомніце з урокаў мастацтва і гісторыі асноўных міфалагічных персанажаў Старажытнай Грэцыі. Складзіце параўнальную табліцу, у якую вы зможаце ўнесці імя адпаведнага персанажа з міфалогіі Старажытнага Рыма.

**Вергілій.** Рымляне не толькі давалі міфалагічным персанажам новыя імёны. Часта яны па-новаму пераказвалі і гісторыі пра іх. Рымскі паэт *Вергі́лій* склаў паэму «*Энеіда*», у якой апісаў усе прыгоды і подзвігі героя па імені Эней. Пра Энея распавядаецца і ў паэмах «Іліяда» і «Адысея». У творах Гамера гэты герой — адзін з правадыроў траянцаў. Але Вергілій склаў аб Энеі новую гісторыю.

Паэма была напісаная выдатнымі вершамі і вельмі спадабалася рымлянам, бо ў ёй паведамлялася пра пачатак Рымскай імперыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Паэма Вергілія «Энеіда»

Вергілій у паэме «Энеіда» апісвае падарожжы Энея пасля гібелі Трої. На шляху ў яго было шмат цікавых прыгод: цудоўныя прароцтвы, сустрэча з пачварай, візіт да выдатнай царыцы Дзідоны. Але галоўнай падзеяй у гісторыі Энея было яго прыбыццё да берагоў ракі Тыбр і заключэнне саюзу з племем лацінян…

Нашчадкі Энея праз некалькі стагоддзяў заклалі і пабудавалі Рым.



Вергілій піша «Энеіду» ў акружэнні муз Клі́а і Мельпаме́ны. Мазаіка (III ст.)

Битвы и мужа пою, кто в Италию первым из Трои —
Роком ведомый беглец — к берегам приплыл Лавинийским.
Долго его по морям и далёким землям бросала
Воля богов, злопамятный гнев жестокой Юноны.
Долго и войны он вёл, — до того, как, город построив,
В Лаций богов перенёс, где возникло племя латинян,
Города Альбы отцы и стены высокого Рима.
Муза, поведай о том, по какой оскорбилась причине
Так царица богов, что муж, благочестием славный,
Столько по воле её претерпел превратностей горьких,
Столько трудов…

*Перевод С. Ошерова*

Выразна прачытайце ўрывак з паэмы «Энеіда» Вергілія. Як вы думаеце, гэты ўрывак лягчэй прадэкламаваць ці прапець? Растлумачце свой адказ.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Гарацый.** Рымскага паэта *Гара́цыя* вабілі моцныя пачуцці, высокія думкі і вобразы. У поўнай меры чытач можа заўважыць гэта, пазнаёміўшыся з адным з самых вядомых лірычных твораў Гарацыя — одай «Помнік».

| Ода Гарацыя «Помнік» | |
|---|---|
| Ода «Помнік» — гэта верш-роздум пра лёс паэта. У ёй Гарацый разважае пра тое, што чалавек дасягае бяссмерця ў сваіх працах. Уласнае бяссмерце Гарацый бачыць у сваёй паэзіі. |  Гарацый. Старажытнарымскі рэльеф |

Я памятник себе воздвигнул долговечный,
Превыше пирамид и крепче меди он.
Ни едкие дожди, ни бурный Аквилон,
Ни цепь несметных лет, ни время быстротечно
Не сокрушат его...

...Гордись блистательным отличьем, Мельпомена!
Гордись: права тебе достоинство дало,
Из лавра дельфского, в честь Феба посвященна,
Венок бессмертный свив, укрась моё чело.

*Перевод В. Капниста (1806 г.)*

Гарацый стварыў чатыры зборнікі лірычных вершаў. У іх ён разважаў пра норавы рымлян, шанаванне бацькоў, пра стаўленне да багоў. Паэзія Гарацыя адрозніваецца асаблівай урачыстасцю і разважлівасцю. Сучаснікі не заўсёды прымалі «высокі пафас» паэта. Але шмат якія ідэі Гарацыя і ўзоры яго паэзіі ў розных жанрах былі запазычаныя паэтамі наступных часоў.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гарацыю належаць такія выразы, як «залатая сярэдзіна», «выпушчанага слова не зловіш», «голая праўда». Гэтыя выразы выкарыстоўваюцца і сучаснымі людзьмі. Патлумачце, як вы іх разумееце.

**Авідзій.** Рымскі паэт Аві́дзій склаў вялікую паэму «Метамарфозы» («Ператварэнні»). У ёй сабрана каля двухсот міфалагічных сюжэтаў пра разнастайныя пераўвасабленні багоў і антычных герояў. Сюжэтнай канвой апавядання стала гісторыя свету і чалавецтва, якой яе ўяўлялі ў эпоху Антычнасці.

## Паэма Авідзія «Метамарфозы»

…Было вельмі шмат старажытных міфаў, якія заканчваліся ператварэннямі герояў — у раку, у гару, у жывёлу, у расліну, у сузор’е. Паэт Авідзій паспрабаваў сабраць усе міфы аб ператварэннях, якія ён ведаў. Ён пераказаў іх адзін за адным, падхапляючы і пераплятаючы.

Пачынаецца паэма са стварэння свету — калі Хаос падзяліўся на Неба і Зямлю. Гэта ўжо было першае ў свеце ператварэнне…



Помнік Авідзію
ў Сульмоне, Італія

### Старажытнагрэчаскі міф пра Дэдала і Іка́ра

Будаўніком крыцкага Лабірынта быў умелец афінянін Дэдал, палонны грознага цара Мінаса, сына Зеўса і бацькі Мінатаўра.

Дэдал пакутаваў на яго востраве, але бегчы не мог: усе моры былі ва ўладзе Мінаса. Тады ён вырашыў паляцець па небе: «Усім валодае Мінас, але паветрам ён не валодае!» Сабраўшы птушыныя пёры, ён змацоўвае іх воскам, вымярае даўжыню, вывярае выгін крыла; а хлопчык яго Ікар побач то лепіць камячкі воску, то ловіць пёркі, якія адлятаюць.

Вось ужо гатовыя вялікія крылы для бацькі, маленькія для сына, і Дэдал вучыць Ікара: «Ляці за мной услед, трымайся сярэдзіны: ніжэй возьмеш — ад пырсак мора пацяжэюць пёры; вышэй возьмеш — ад жару сонца размякне воск». Яны ляцяць; рыбакі на берагах і аратыя на раллі ўскідваюць погляды ў неба і замiраюць, думаючы, што гэта вышнія багі. Але зноў паўтараецца доля Фаэтона: Ікар радасна падымаецца ўвысь, растае воск, рассыпаюцца пёры, голымі рукамі ён хапае паветра, і вось ужо мора захліствае яго вусны, якія клічуць бацьку. З той пары мора называецца Ікарыйскім.

*Пераказ М. Гаспарава*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У пятнаццаці кнігах Авідзій выклаў амаль усю старажытнагрэчаскую і старажытнарымскую міфалогію. Разам з творамі Гамера «Метамарфозы» Авідзія — асноўная крыніца антычных міфаў і ў цяперашні час.

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах мультфільм «Ікар і мудрацы» Фёдара Хітрукá. Рэжысёр пераасэнсаваў старажытнагрэчаскі міф пра Дэдала і Ікара. Што новага прыўнёс сучасны аўтар?

Асаблівасцю старажытнарымскай культуры была здольнасць «упітваць» дасягненні іншых культур і на аснове іх пераасэнсавання ствараць свае шэдэўры. Імкненне рымлян дасягнуць у паэзіі вышынь, якія можна параўнаць з творчасцю Гамера, прывяло да стварэння выдатных твораў Вергілія, Авідзія і Гарацыя.

## Пытанні і заданні

Лацінская мова, на якой размаўлялі і пісалі ў Старажытным Рыме, стала адной з самых дасканалых моў свету. Прачытайце на дадатковай старонцы вядомыя лацінскія выразы і словы. Патлумачце сэнс некалькіх выразаў, якія сталі крылатымі.

1. Кожны з паэтаў Старажытнага Рыма — Вергілій, Гарацый, Авідзій — зрабіў свой унёсак у сусветную мастацкую культуру. Прачытайце ўрыўкі твораў, прадстаўленыя ў параграфе. Ахарактарызуйце своеасаблівасць кожнага твора (сюжэт, героі, асаблівасці выкладу).

## Творчая майстэрня

2. Дзякуючы одзе Гарацыя «Помнік» у паэзіі з'явілася цэлая плеяда аўтараў, якія стварылі творы на гэтую тэму. Адзін з самых вядомых — верш А. С. Пушкіна. Прачытайце твор. Падбярыце на гэтую тэму яшчэ некалькі вершаў (А. Фета, В. Брусава, М. Багдановіча, І. Бродскага). Падбярыце да іх ілюстрацыйны рад і музычны фон. Падрыхтуйце прэзентацыю. У сваім праекце паспрабуйце адказаць на галоўнае пытанне: чаму тэма значэння паэта так хвалявала і хвалюе прадстаўнікоў творчых прафесій?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

> Я памятник воздвиг себе нерукотворный,
> К нему не зарастёт народная тропа,
> Вознёсся выше он главою непокорной
> Александрийского столпа...
>
> *А. С. Пушкин*

## § 33. Тэатр і музыка ў Старажытным Рыме

У тэатральным мастацтве ў рымлян і грэкаў было шмат агульнага. Запазычыўшы ў старажытных грэкаў форму тэатра і тэматыку сюжэтаў, рымляне здолелі ўнесці ў тэатральнае мастацтва свае арыгінальныя ідэі.

**Вытокі старажытнарымскага тэатра.** У Старажытным Рыме, як і ў Старажытнай Грэцыі, тэатр зарадзіўся з абрадавых гульняў і святкаванняў. Напрыклад, на вясковых святах збору ўраджаю звычайна выступалі некалькі хароў, якія абменьваліся жартамі. А падчас святаў у гонар бажаства Сатурна знатныя людзі мяняліся месцамі са сваімі слугамі: гаспадары станавіліся «рабамі», а рабы — «гаспадарамі».

Паўплывалі на станаўленне рымскага тэатра і мімічныя танцы этрускаў пад акампанемент флейты. Акцёраў-этрускаў запрасілі ў Рым, калі ў горад прыйшла вялікая бяда — эпідэмія. Рымляне



Музыка і танцор. Фрэска з грабніцы Трыклінія, ці грабніцы Свята (V ст. да н. э.)



Танцоры. Фрэска з грабніцы Трыклінія, ці грабніцы Свята (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вырашылі зладзіць сцэнічныя гульні, каб улагодзіць багоў. Гэта было новай справай для ваяўнічага народа, бо раней відовішчы абмяжоўваліся толькі коннымі спаборніцтвамі. Прадстаўленне настолькі спадабалася рымлянам, што неўзабаве яны сталі імітаваць этрускіх танцораў. Да танцаў пад музыку дадалі песні, жартоўныя дыялогі, напісаныя няскладнымі вершамі. Так з'явіліся прымітыўныя відовішчы — сату́ры.

У дні святаў сталі актыўна ладзіць і сцэнкі камічнага характару — атэла́ны, названыя па імені горада Атэлы. У прадстаўленні дзейнічалі пастаянныя персанажы — аматары паесці, пабалбатаць і... падмануць. Фіксаванага тэксту ў сцэнках не было, таму акцёры часцей за ўсё імправізавалі.



Персанаж атэланы (I ст. да н. э.)

На нараджэнне тэатра ў Старажытным Рыме паўплываў старажытнагрэчаскі тэатр. А што стала перадумовай зараджэння тэатра ў Старажытнай Грэцыі? Як узаемазвязаныя старажытнагрэчаскі і старажытнарымскі тэатры?

**Жанры драматургіі ў Старажытным Рыме.** Пастулова ў Старажытным Рыме сталі ствараць уласныя драматычныя творы. Спачатку рымляне перакладалі на лацінскую мову грэчаскую літаратурную



Тэатральныя маскі. Мазаіка з вілы Адрыяна ў Цівалі (II ст. да н. э.)



Сцэна з рымскай камедыі «Дзяўчына з Андраса» Тэрэнцыя. Рэльеф (II ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

драму, прыстасоўваючы яе да сваіх густаў. Першыя рымскія трагедыі былі звязаныя з тэмай траянскага цыкла міфаў. Пазней — з сюжэтамі з рымскай гісторыі. Іх адрознівалі шматлікія падзеі, насычаныя заблытанымі і спецыяльна ўскладненымі ўчынкамі герояў.

Але большай папулярнасцю ў гледачоў карысталася камедыя паліята — перапрацоўка старажытнагрэчаскай камедыі. Сваю назву паліята атрымала ад грэчаскага шырокага плашча — па́лія, бо дзеянне п'есы заўсёды адбывалася ў Грэцыі, а героі насілі грэчаскую вопратку.

Паступова ў адным камічным творы рымскія драматургі сталі актыўна злучаць сюжэтныя лініі дзвюх ці трох грэчаскіх п'ес.

Адзін з праслаўленых рымскіх драматургаў — *Плаўт* — стварыў незвычайна эфектныя камедыі. Яго ўвагу прыцягвалі або бясконцая блытаніна, у якую трапляюць героі, або характары і ўнутраны свет герояў. Напрыклад, каб падкрэсліць апантанасць Эўкліёна, галоўнага героя камедыі «Скарбонка», Плаўт уводзіць яго зварот да свайго скарбу, быццам да жывога чалавека. А выкраданне золата для Эўкліёна стала роўнае смерці…

> ...Богами клянусь, много у тебя врагов, кубышка, и у того золота, которое тебе доверено. И вот самое лучшее, что я теперь сделаю: отнесу тебя, кубышка, в храм Верности...
>
> *Плавт. Монолог Евклиона из комедии «Кубышка» (перевод А. Артюшкова)*

Драматургі Старажытнага Рыма віртуозна стваралі камічныя эфекты з дапамогай патоку пытальных сказаў, своеасаблівай «перастрэлкі» пытаннямі ў дыялогу, шматразовых паўтораў асобных словазлучэнняў і слоў. Звярніце ўвагу, як Эўкліён, непасрэдна звяртаючыся да гледача, амаль адначасова і ўсклікае, і сумняваецца, і просіць... Такі эфект надае п'есам Плаўта асаблівую іскрамётнасць і дынамічнасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

...Я пропал! Я погиб! Я убит! Ой, куда
Мне бежать и куда не бежать? Стой, держи!
Кто? Кого? Я не знаю, не вижу, я слеп!
Но куда мне идти? Где же я? Кто же я?
Не могу я понять! Помогите, молю.
Укажите того, кто её утащил!
Что сказал ты? Тебе я поверить готов,
Человек ты хороший, видать по лицу.
Это что? Вы смеётесь? Всех вас знаю я.
Большинство из вас воры — сомнения нет.
Набелённой одеждой прикрылись, сидят,
Будто честные люди. Из этих никто
Не унёс? Ох, убил ты меня! Ну, скажи,
Кто забрал? Ты не знаешь? Несчастье моё!

*Плавт. Монолог Евклиона из комедии «Кубышка» (перевод А. Артюшкова)*

Успомніце асаблівасці жанраў трагедыі і камедыі ў Старажытнай Грэцыі. Ці адрозніваюцца гэтыя жанры ў старажытных рымлян? Назавіце некалькі адрозненняў.

**Архітэктура рымскага тэатра.** У Старажытным Рыме вельмі доўга не было пастаяннага тэатральнага будынка. Звычайна для прадстаўленняў будавалі невысокія драўляныя памосты. Гледачы



Тэатр Марцэла ў Рыме (I ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сядзелі на лаўках або стаялі перад сцэнай. Пасля заканчэння тэатральных прадстаўленняў і гульняў усе будынкі, пабудаваныя для іх правядзення, ламалі.

З цягам часу ў Рыме былі пабудаваныя каменныя тэатры: тэатр Пампея і тэатр Марцэ́ла. Ад тэатра Марцэла захаваліся рэшткі вонкавай сцяны, падзеленай на тры паверхі, якія адпавядаюць тром унутраным ярусам. Паводле сваёй архітэктуры тэатр у Старажытным Рыме нагадвае старажытнагрэчаскі. У ім таксама ёсць скена, праскеній і архестра. Але гэтыя архітэктурныя элементы рымляне пераасэнсавалі.

*Праскеній* быў пашыраны і ператвораны ў велізарную пляцоўку, на якой разгортвалася відовішча. Ён прыўздымаўся над узроўнем архестры, памеры якой напалову зменшыліся. Архестра стала паўкруглай, бо ў рымскай драме не было хору. На ёй размяшчаліся месцы для сенатараў. Масіўны шмат'ярусны фасад скены злучаўся з месцамі для гледачоў высокай сцяной, што стварала адзіную архітэктурную прастору.

Адным з важных адрозненняў з'яўляецца і тое, што большасць рымскіх тэатраў — гэта асобныя будынкі, узведзеныя на роўнай мясцовасці. Тэатральныя збудаванні грэкаў натхнялі рымскіх архітэктараў і на стварэнне адкрытых амфітэатраў і цыркаў. У іх месцы для гледачоў размяшчаліся вакол арэны-пляцоўкі, пасыпанай пяском.



Тэатр у Араўзіёне (выгляд зверху) (I ст. да н. э. — I ст. н. э.). Рэканструкцыя



Тэатр у Араўзіёне (фасад сцэны) (I ст. да н. э. — I ст. н. э.). Сучасны выгляд



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнайце знешні выгляд старажытнагрэчаскага і старажытнарымскага тэатраў. Звярніце ўвагу на пляцоўку, на якой размяшчаліся тэатры, знешні выгляд, колькасць ярусаў, фасад, дэкор.

**Тэатральныя прадстаўленні.** Старажытнарымскі тэатр, запазычыўшы ў грэчаскага тэатра сваё аблічча і тэматыку, адрозніваўся ад яго.

У рымскім спектаклі было задзейнічана ў некалькі разоў больш акцёраў. Рымляне яшчэ больш, чым грэкі, імкнуліся падкрэсліць асаблівасці аблічча герояў. Напрыклад, у выканаўцаў трагедый кату́рны сталі значна вышэйшыя, а парык выглядаў як прыгожая прычоска з валасамі. У камічнага акцёра з’явіўся касцюм у выглядзе доўгага плашча з шырокімі складкамі, што спадалі, а абуткам яму служылі нізкія лёгкія чаравікі. Кароткі плашч, што зашпільваўся на плячы, насілі акцёры, якія выконваюць ролю маладых людзей, салдат, падарожнікаў.

Доўгі час акцёры ў рымскім тэатры гралі без масак. Таму гледачы маглі сачыць і за мімікай выканаўцаў. Пазней усё часцей акцёры выкарыстоўвалі маскі. З іх дапамогай падкрэслівалася не толькі індывідуальнасць характараў, але і ўзрост, настрой і нават самаадчуванне персанажаў!



Акцёры перад выступленнем. Мазаіка з дома Трагічнага паэта ў Пампеях (ІІ ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У рымскім тэатры адрозніваліся і дэкарацыі. У трагедыях дзеянне адбывалася перад палацам. А ў камедыях дэкарацыі амаль заўсёды адлюстроўвалі гарадскую вуліцу, на якую выходзяць фасады двух-трох дамоў.

З часам спектаклі ў Рыме пачалі ставіць з асаблівым размахам. Пышнасць і эфектнасць прадстаўленням надавалі пластычная пантаміма, шэсці пешых і конных атрадаў воінаў і нават выезды караблёў.

Усё большую папулярнасць набывалі гладыятарскія баі пад урачыстыя гукі труб і ражкоў. Рымляне з задавальненнем глядзелі і цыркавыя відовішчы: скачкі на калясніцах, баі звяроў, а таксама атлетаў.

Паспрабуйце разыграць урывак з камедыі Плаўта (гл. с. 178), каб атрымаўся камічны эфект. Раскажыце, з якімі цяжкасцямі вы сутыкнуліся.

**Музычнае жыццё рымлян**. Самымі распаўсюджанымі інструментамі ў Старажытным Рыме былі кіфара* і духавыя інструменты — труба, тыбія і рог. Інструментальныя ансамблі ў сваіх дамах трымалі багатыя грамадзяне. Сваіх дзяцей яны навучалі спеву ды ігры на кіфары.

Ваенныя аркестры існавалі ў рымскіх легіёнах. Магутныя гукі труб і ражкоў далёка разносіліся па наваколлі і запалохвалі ворагаў. Духавыя інструменты былі настолькі папулярныя, што на асаблівым штогадовым свяце рымляне праводзілі ўрачыстую цырымонію асвячэння труб.

Адным з папулярных музычных інструментаў у Старажытным Рыме быў арган. Разгледзьце яго выяву на кампакт-дыску. З дапамогай даведачнай літаратуры падрыхтуйце пра яго невялікае паведамленне (як выглядаў інструмент, дзе выкарыстоўваўся, якое значэнне мае ў сучаснай культуры).

Старажытнарымскі тэатр прайшоў унікальны шлях развіцця. Галоўнымі героямі шмат якіх трагедый сталі гістарычныя асобы. У камедыях у цэнтры ўвагі аказаліся звычайныя людзі ў кур'ёзных сітуацыях. Спектаклі сталі больш відовішчныя дзякуючы яркім касцюмам, дэкарацыям і вялікай колькасці выканаўцаў.

* Гл. ілюстрацыю на с. 142.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Пытанні і заданні**

1. Знайдзіце ў тэксце і назавіце ўсе прыёмы стварэння камічнага эфекту, прыдуманыя рымлянамі. Раскажыце самую простую гісторыю, выкарыстоўваючы адзін з гэтых прыёмаў. Ці атрымалася ў вас рассмяшыць сяброў?

2. Чаму старажытнагрэчаскія акцёры насілі маскі? Якія перавагі былі ў рымскіх акцёраў, што масак не насілі?

**Творчая майстэрня**

3. Падрыхтуйце з аднакласнікамі невялікае тэатральнае прадстаўленне. «Раскажыце» просты сюжэт, выкарыстоўваючы толькі міміку. Пастарайцеся, каб ваша гісторыя была зразумелая аднакласнікам.

## § 34—35. Творчы праект

Мастацтва першабытнага грамадства і старажытнага свету — гэта ключавыя эпохі ў гісторыі сусветнай мастацкай культуры. Менавіта тады былі закладзеныя асновы ўсёй сістэмы мастацтва, сфарміраваліся яго асноўныя віды і жанры. Яны працягваюць сваё развіццё і цяпер.

Ужо ў першабытную эпоху чалавек усвядоміў сябе як творчую асобу, здольную пераўтвараць навакольную рэчаіснасць паводле законаў прыгажосці. Тым самым ён канчаткова вылучыў сябе з прыроднага свету.



**Ангеліна Гарбаценка.** «Музей валуноў», 12 гадоў (г. Мінск, Беларусь)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Шмат якія творы першабытнага часу вядомыя сучаснаму чалавеку толькі дзякуючы скрупулёзнай працы даследчыкаў: археолагаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў…

У вас таксама з'явілася магчымасць стаць даследчыкамі і разабрацца ў адным з пытанняў мастацтва першабытнай эпохі.

**Магчымыя тэмы для даследавання:**

Сачыненне на тэму «Велічныя каменныя вартаўнікі першабытнай эпохі — мегаліты».

Праект-даследаванне «Загадкі Стоўнхенджа».

Эсэ «Пра што распавядае нам першабытны мастак».

Работа «Водгалас першабытнай культуры ў сучасным свеце» (матэрыял, тэхніка на выбар).

Прэзентацыя на тэму «Першабытнае мастацтва на беларускіх землях».

Падрыхтоўка сцэнарыя тэлерэпартажу пра экспазіцыю прадметаў першабытнага мастацтва ў музеях Беларусі (на выбар).

Апавяданне пра першабытнае мастацтва на беларускіх землях для малодшых школьнікаў.

Своеасаблівасць архітэктуры і выяўленчага мастацтва Старажытнага Егіпта, Месапатаміі, Індыі і Кітая вызначалася перш за ўсё рэлігійнымі і міфалагічнымі ўяўленнямі. У народнай творчасці ў гэтых культурах водгаласы старажытнай сувязі магіі і мастацтва захоўваюцца да гэтай пары.

Свае веды вы пашырыце, калі разам з аднакласнікамі прадумаеце і выканаеце праекты на адну з тэм.

**Магчымыя тэмы для даследавання:**

Праект «Экскурсія па Старажытным Егіпце».

Эсэ «Загадкі старажытнаегіпецкіх пірамід», «Скарбы Тутанхамона».

Работа «Сімволіка зікурата» (эскізны малюнак, апавяданне).

Параўнальная табліца «Рэльефы Месапатаміі».

Конкурс на лепшы пераказ адной прыгоды з «Эпасу пра Гільгамеша».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вяршыня ў развіцці мастацтва старажытнага свету — эпоха Антычнасці. Дасягненні старажытных грэкаў і рымлян ва ўсіх відах мастацтва без перабольшання грандыёзныя. Антычныя архітэктары стварылі тую «мову», на якой да гэтага часу «гаворыць» архітэктура. Ордар, порцік, франтон, аркада — гэта азбука не толькі еўрапейскай, але і сусветнай архітэктуры.

Не менш важныя заваёўванні характарызуюць антычнае выяўленчае мастацтва. Галоўнай тэмай для антычных скульптараў і жывапісцаў быў чалавек. У параўнанні з мастацтвам папярэдняй пары яго вобраз стаў багацейшы і складанейшы. Старажытныя грэкі ўвайшлі ў гісторыю мастацтва як стваральнікі ідэальна прыгожага вобраза чалавека. Старажытныя рымляне завастрылі ўвагу на яго індывідуальнай непаўторнасці. У сваіх творах яны зафіксавалі ўсю складанасць і неадназначнасць, якія адрозніваюць канкрэтную асобу. Гэтым яны невымерна пашырылі нашы веды пра саміх сабе.

Даследаванні антычнага мастацтва працягваюцца і сёння. А што пра антычную мастацкую культуру хацелі б даведацца вы?

**Магчымыя тэмы для даследавання:**

Сачыненне на тэму «Цуды свету ў Старажытнай Грэцыі».

Праект-даследаванне «Роля Г. Шлімана ў сусветнай мастацкай культуры».

Эсэ «Пра што распавядае нам антычны мастак».

Праект «Экскурсія па Кноскім палацы, Афінскім акропалі (або інш.)».

Праект «Старажытнагрэчаскія і старажытнарымскія крылатыя выразы, якімі мы карыстаемся».

Альбом, стэнд, прэзентацыя (або інш.) на тэму «Жыццё рымскіх цэзараў у люстэрку мастацтва».

Рэпартаж для тэлеперадачы на тэму «Водгалас антычнага свету ў сучасным мастацтве».

Праект-даследаванне «Параўнанне характараў герояў у драме Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма».

Конкурс на лепшую пастаноўку фрагментаў старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай камедыі (Арыстафана, Плаўта і/або інш.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# СЛОЎНІЧАК

**Абеліск** Манумент чатырохкантовай формы, які звужаецца ўверсе.

**Абрад** Традыцыйныя дзеянні, якія суправаджаюць важныя моманты жыцця чалавечага калектыву.

**Акведук** (ад лац. «aqua» — вада і «duco» — вяду). Шмат'яруснае збудаванне ў выглядзе моста з трубаправодам ці каналам для падачы вады праз раку, роў, яр.

**Акропаль** (ад грэч. «акропаліс» — верхні горад). Узвышанае і ўмацаванае месца, так званы верхні горад.

**Антаблемент архітэктурнага ордара** (ад фр. «entablement», «table» — стол, дошка). Верхняя, нясучая частка стоечна-бэлечнай канструкцыі; перакрыцце, што складаецца з архітрава (ніжняй часткі, якая непасрэдна абапіраецца на капітэлі калоны), фрыза (сярэдняй часткі, звычайна з упрыгажэннем) і карніза (верхняй часткі, якая рэзка выходзіць наперад і навісае над астатнімі часткамі).

**Антэфікс** (ад лац. «antefium» — спераду прымацаваны). Рэльефная пліта з керамікі, каменю ці дрэва, усталяваная на даху антычнага храма для палягчэння сцёку вады (у якасці рассякальніка).

**Архітэктурны ордар** (ад лац. «ordo» — лад, парадак). Мастацка асэнсаваная стоечна-бэлечная канструкцыя з пэўным наборам элементаў.

**Атык** (ад грэч. «аттікос»). Дэкаратыўная сценка з выбітымі пасвячальнымі надпісамі ці рэльефамі, размешчаная вышэй за карніз у трыумфальнай арцы, як яе архітэктурнае завяршэнне.

**Атэлана** (ад лац. «fabula atellana» — байкі з Атэлы). Кароткія камічныя сцэнкі імправізацыйнага характару з удзелам пастаянных персанажаў (дурня-абжоры, балбатуна-абжоры, злога шарлатана, скупога старога багатыра). Названыя па імені горада Атэлы, дзе яны ўзніклі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Аэ́д** (ад грэч. «aoidos» — спявак). Выканаўца, старажытнагрэчаскі казачнік народных песень.

**Ба́за ў ордары** Фундамент, на якім узводзілася калона.

**Базі́ліка** (ад грэч. «базіліка» — «дом базілеўса, царскі дом»). У Старажытным Рыме — грамадскі будынак для суда і гандлю прамавугольнай формы.

**Валю́та** (ад лац. «volute» — завіток, спіраль). Архітэктурны дэкор у выглядзе расліннага завітка з «вочкам» у цэнтры.

**Гекза́метр** (ад грэч. «эксі» — шэсць і «метрон» — мера). У антычнасці любы верш, які складаўся з шасці метраў.

**Гры́ўня (упрыгажэнне)** Срэбны ці залаты выраб у выглядзе абруча, які насілі на шыі.

**Дальме́н** (ад брэт. «taol maen» — каменны стол). Складанае збудаванне з некалькіх гіганцкіх камянёў, адзін з якіх служыў асновай, другі — перакрыццем, а астатнія — апорамі.

**Зернь** Ювелірная тэхніка, пры якой дробныя металічныя шарыкі (зярняткі) прыпайваюцца да драцянога арнаменту ці да адпаліраванай паверхні ўпрыгажэння.

**Зікура́т** (ад вавілон. «siggurratu» — вяршыня). Шматступеньчатае культавае збудаванне ў Месапатаміі ў форме піраміды, складзенай з няцотнай колькасці платформаў.

**Ідалы (статуі)** Каменныя ці драўляныя балваны, якія адлюстроўваюць розных божастваў.

**Іерагліфі́чнае пісьмо́** (з грэч. «іерос» — святы і «гліфо» — выразаю). Графічныя знакі, з якіх складаюцца некаторыя сістэмы пісьма. Іерогліфы могуць абазначаць як асобныя гукі і склады, так і цэлыя словы і паняцці.

**Калігра́фія** (ад грэч. «каліграфія» — прыгожы почырк). Мастацтва прыгожага рукатворнага пісьма, высокамастацкае напісанне тэксту.

**Кало́на** Від апоры, галоўны элемент апорнай часткі архітэктурнага ордара.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| | |
|---|---|
| **Кано́н у мастацтве** | Нязменная (традыцыйная) сукупнасць нормаў і правіл у мастацтве, якая не прадугледжвае пераглядy. |
| **Капітэ́ль архітэктурнага ордара** | (ад лац. «caput» — галава). Верхняя частка калоны. Верхняя частка капітэлі выступае за межы калоны. |
| **Клі́напіс** | Найбольш ранняя з вядомых сістэм пісьма, адмысловая сістэма знакаў, якія нагадваюць завостраныя клінкі, для перадачы інфармацыі на гліняных таблічках. |
| **Кро́млех** | (ад брэт. «crom» — круг, «lech» — камень). Збудаванне з каласальных па памерах камянёў, якія размяшчаліся вертыкальна па акружнасці. |
| **Лу́нніца** | Падвеска ў форме паўмесяца, рожкі якога накіраваны ўніз. |
| **Мегалі́т** | (ад грэч. «megas» — вялікі і «litos» — камень). Збудаванне з велізарных камянёў. |
| **Менгі́р** | (ад брэт. «men» — камень і «hir» — доўгі). Вертыкальна пастаўлены высокі камень. |
| **Міфалагі́чныя цы́клы** | У Траянскім цыкле расказваецца пра падзеі, звязаныя з горадам Трояй і Траянскай вайной. У цыкле міфаў пра Адысея выкладаюцца падзеі пасля заканчэння Траянскай вайны, звязаныя з вяртаннем на радзіму героя. У цыкле пра арганаўтаў распавядаецца пра Ясона і яго сям’ю, пра вандраванне на караблі «Арго» за залатым руном. |
| **Наска́льныя малю́нкі** | Выбітыя ці нанесеныя фарбай малюнкі ў пячорах і на скалах у першабытны час. |
| **Па́гада** | Шмат’яруснае культавае збудаванне. Як тып архітэктурнага збудавання ўзнікла са з’яўленнем будызму. |
| **Пайло́ў** | Архітэктурнае збудаванне Кітая ў выглядзе дэкаратыўных варот, упрыгожаных разьбяным арнаментам, надпісамі, рэльефамі. |
| **Паліва́ны** | Пакрыты палівай (бліскучай шклопадобнай масай, якая надае трываласць і прыгажосць вырабу з абпаленай гліны). |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Палія́та** — Старажытнарымская камедыя, перапрацаваная са старажытнагрэчаскага ўзору. Дзеянне п'есы заўсёды адбывалася дзе-небудзь у Грэцыі, і героямі былі грэкі.

**Па́ндус** — (ад фр. «pente douce» — пакаты пахіл). Нахіленая пляцоўка, якая злучае дзве рознавышынныя гарызантальныя плоскасці. У адрозненне ад лесвіцы не мае прыступак, г. зн. прызначаецца для руху колавых сродкаў.

**Папі́рус** — Адмысловы матэрыял для пісьма, які выробляецца з трыснягу.

**Пектара́ль** — (ад лат. «pectorale» — якое датыкаецца да грудзей). Нагруднае ўпрыгажэнне.

**Пеpы́птэр** — (ад грэч. «перыптэрос» — акружаны калонамі). Прамавугольнае ў плане архітэктурнае збудаванне, абнесенае з чатырох бакоў калонамі.

**Піктагра́фія** — (ад лац. «пiктус» — малюнак і грэч. «графо» — пішу). Найстаражытны від пісьма, які перадае ўражанні, вобразы, падзеі з дапамогай паслядоўнасці малюнкаў.

**Прапіле́і** — (ад грэч. «про» — перад і «пілеі» — вароты). Парадны ўваход (праезд), утвораны порцікамі і калонамі.

**Рытуа́л** — Від абраду, які складаецца з пэўных сімвалічных дзеянняў.

**Сату́ра** — (ад лац. «satura» — усё ўсялякае). Прымітыўныя відовішчы ў Старажытным Рыме, са скокамі пад музыку, жартоўнымі дыялогамі з няскладных вершаў.

**Сінкрэты́зм** — Непадзельнасць паўсядзённага жыцця і розных відаў дзейнасці першабытнага чалавека.

**Сма́льта** — Каляровае, непразрыстае шкло, якое выкарыстоўваецца як традыцыйны матэрыял для стварэння мазаічных твораў.

**Ста́мбха** — Каласальная калона, капітэль якой упрыгожваюць розныя скульптурныя выявы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| | |
|---|---|
| **Стэ́ла** | Вертыкальная, часцей за ўсё каменная пліта (слуп), пакрытая тэкстамі ці рэльефнымі выявамі. |
| **Трылі́т** | (ад грэч. «tri» — тры і «litos» — камень). Збудаванне, якое складаецца з трох камянёў, два з якіх служаць апорамі, а трэці ўтварае перамычку. |
| **Трыумфа́льная а́рка** | Архітэктурнае збудаванне з пышным дэкаратыўным убранствам, якое мае адзін ці тры пралёты для праходу. Узводзіцца ў гонар значных падзей ці асоб. |
| **Фі́була** | (ад лат. «fibula» — дужка). Металічная зашпілька для адзення, якую адначасова выкарыстоўвалі як упрыгажэнне. |
| **Ча́йція** | Культавае збудаванне (храм-малельня) у старажытнаіндыйскай архітэктуры. |
| **Эле́гія** | (ад грэч. «элегос» — літасная песня). Лірычны верш, у якім эмацыйна ўвасабляюцца роздумы над складанымі жыццёвымі праблемамі. |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗМЕСТ

**Прадмова** ..................................................................3

Раздзел 1. **У ПОШУКАХ ПРЫГАЖОСЦІ: МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНЫХ ЧАСОЎ** ..................................................4
§ 1. Мастацтва першабытнай эпохі: пасланне нашчадкам ..........5
§ 2. Сюжэты і вобразы першабытных выяў ................................ 9
§ 3. Засваенне прасторы: зараджэнне архітэктуры....................13
§ 4. Мастацтва першабытных часоў на беларускіх землях........18
§ 5. Язычніцкая культура на беларускіх землях..........................24

Раздзел 2. **МАСТАЦТВА, ЯКОЕ ЗАСТЫЛА НА ТЫСЯЧАГОДДЗІ: СТАРАЖЫТНЫ ЕГІПЕТ** ..........................29
§ 6. Ідэі вечнага жыцця ў старажытнаегіпецкай архітэктуры .....30
§ 7. Сюжэты і вобразы ў выяўленчым мастацтве Старажытнага Егіпта ..............................................................35
§ 8. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Егіпта ..............................................................40
§ 9. Загадкі Старажытнага Егіпта: літаратура і музыка..............44

Раздзел 3. **МАСТАЦТВА СКРОЗЬ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ: СТАРАЖЫТНЫ УСХОД** ...................................................50
§ 10. Старажытныя шумеры: цывілізацыя гліны..........................51
§ 11. Мастацтва Вавілона: «вароты бога»..................................56
§ 12. Мастацтва Асірыі: адлюстраванне ваеннай сілы і ўлады правіцеляў ..........................................................61
§ 13. Мастацтва Старажытнага Ірана: услаўленне магутнасці цара і яго дзяржавы ..................................................66
§ 14. Культура Харапы як калыска мастацтва Старажытнай Індыі ...........................................................71
§ 15. Мастацтва Старажытнай Індыі ...........................................74



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 16. Мастацтва Старажытнага Кітая: прыгажосць у дэталях....80
§ 17. Манументальнасць архітэктуры і скульптуры Старажытнага Кітая....86

Раздзел 4. **АТЛАНТЫ І КАРЫЯТЫДЫ: МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ**....92
§ 18. Мастацкая фантазія крыта-мікенскага мастацтва....93
§ 19. Ордарная сістэма ў старажытнагрэчаскай архітэктуры....98
§ 20. Грэчаскі храм — ідэал гармоніі і прыгажосці ў архітэктуры....103
§ 21. Вобраз чалавека ў скульптуры Старажытнай Грэцыі....109
§ 22. Керамічныя вырабы Старажытнай Грэцыі....115
§ 23. Цуды свету ў Старажытнай Грэцыі....119
§ 24. Гармонія думкі і слова: літаратура Старажытнай Грэцыі....124
§ 25. Старажытнагрэчаская драма....130
§ 26. Гульні-спаборніцтвы як аснова тэатральнага і музычнага мастацтва Старажытнай Грэцыі....136

Раздзел 5. **МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА РЫМА: ПАСЛАННЕ Ў БУДУЧЫНЮ**....142
§ 27. Мастацтва этрускаў: папярэднікі вялікіх рымлян....143
§ 28. Архітэктура Старажытнага Рыма: наватарства, веліч і інжынернае майстэрства....148
§ 29. Выбітныя пабудовы Старажытнага Рыма....154
§ 30. Партрэтны жанр у скульптуры Старажытнага Рыма....160
§ 31. Своеасаблівасць тэхнік манументальнага жывапісу....165
§ 32. Залаты век літаратуры Старажытнага Рыма....169
§ 33. Тэатр і музыка ў Старажытным Рыме....175

**§ 34—35. Творчы праект**....182

Слоўнічак....185


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Валанцэвіч** Наталля Сяргееўна
**Колбышава** Святлана Іванаўна
**Карпянкова** Марыя Леанідаўна і інш.

**МАСТАЦТВА**
**(айчынная і сусветная мастацкая культура)**

Вучэбны дапаможнік для 7 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам)

Рэдактар *Т. А. Іванова*
Дызайн *В. К. Жалудковай, І. І. Радаман*
Мастацкія рэдактары *В. К. Жалудкова, Д. В. Кашавар, К. К. Шастоўскі*
Мастак вокладкі *В. К. Жалудкова*
Мастакі *В. К. Жалудкова, К. У. Максімава, К. К. Шастоўскі*
Камп'ютарны набор *Т. А. Івановай, І. М. Кузьмянковай*
Камп'ютарная вёрстка *І. М. Кузьмянковай*
Карэктары *Т. А. Іванова, Г. Д. Мікіцюк*

*У мастацкім афармленні выдання выкарыстаны ілюстрацыі з wikimedia.org, shutterstock.com і іншых крыніц (поўны пералік на дыску).*

Падпісана ў друк 15.09.2017. Фармат 70 × 100 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 15,6. Ул.-выд. арк. 9,0 + 4,0 эл. дадатак. Тыраж 15 840 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне